WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУССКАЯ ГАЗЕТА

15 ЛЮТАГА 2011 г.
АЎТОРАК
№ 29
(26893)

Кошт 650 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

Воінам-інтэрнацыяналістам, ветэранам вайны ў Афганістане

Паважаныя таварышы!

15 лютага ў Рэспубліцы Беларусь адзначаецца Дзень памяці воінаў-інтэрнацыяналістаў.

У Афганістане савецкія войскі, у складзе якіх былі і нашы суайчыннікі, праявілі храбрасць і самаадданасць у барацьбе з міжнародным тэрарызмам і сталі прыкладам сумленнага выканання воінскага абавязку.

Мы заўсёды будзем памятаць пра подзвіг воінаў-інтэрнацыяналістаў, якія, нягледзячы на смяротную небяспеку, імкнуліся прынесці на афганскую зямлю мір і спакой.

Многія беларусы не вярнуліся з горна той вайны, і мы аддаём даніну павагі жывым і схіляем галаву перад светлай памяццю загінулых герояў.

Зычу вам, воіны-інтэрнацыяналісты, вашым родным і блізкім мірнага неба, здароўя і шчасця.

Дзякую вам за мужнасць і стойкасць, прынцыповую і адказную грамадзянскую пазіцыю, за ўсё, што вы робіце сёння для ўмацавання суверэнітэту і незалежнасці Беларусі.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.

ВУП ЗА СТУДЗЕНЬ 2011 СКЛАЎ 107,4 ПРАЦЭНТА

Валавы ўнутраны прадукт Беларусі за студзень 2011 года павялічыўся на 7,4 працэнта ў параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года, паведамілі БЕЛТА ў Нацыянальным статыстычным камітэце.

Вытворчасць прамысловай прадукцыі ў першы месяц года ўзрасла на 6,4 працэнта і склала Br14,97 трлн (гадавы прагноз росту — на 9-9,5 працэнта). Рост інвестыцый склаў за студзень 2011 года 134,1 працэнта і дасягнуў Br3,103 трлн.

ІНФЛЯЦЫЯ Ў СТУДЗЕНІ — 1,4 ПРАЦЭНТА

Індэкс спажывецкіх цэн на тавары і паслугі ў студзені 2011 года ў параўнанні са снежнем 2010 года склаў у Беларусі 101,4 працэнта. У снежні 2010 года інфляцыя склалася на ўзроўні 1 працэнта, паведамілі БЕЛТА ў Нацыянальным статыстычным камітэце.

У студзені мінулага года інфляцыя склала 0,8 працэнта. У 2011 годзе інфляцыя прагназуецца на ўзроўні 7,5-8,5 працэнта.

У студзені 2011 года ў параўнанні са снежнем 2010 года больш высокімі тэмпамі раслі цэны на харчовыя тавары. Індэкс цэн на харчовыя тавары склаў 102,1 працэнта, у тым ліку па алею — 102,4 працэнта, крупах прасяных — 104,4 працэнта, плодаагароднінай прадукцыі — 104,9 працэнта, гарэлцы — 105 працэнтаў, цукру — 110 працэнтаў. Тытунёвыя вырабы падаражэлі на 5,2 працэнта. Цэны на нехарчовыя тавары раслі больш нізкімі тэмпамі, чым на харчовыя. Індэкс цэн на нехарчовыя тавары ў студзені 2011 года ў параўнанні са снежнем 2010 года склаў 100,3 працэнта. У большай ступені падаражэлі мэбля (101 працэнт), тэлевізары (101,4 працэнта), друкаваныя вырабы (101,7 працэнта).

Рост цэн і тарыфаў на платныя паслугі насельніцтву ў студзені 2011 года ў параўнанні са снежнем 2010 года склаў 101,4 працэнта. Вышэй за сярэдні ўзровень выраслі цэны і тарыфы на турыстычныя паслугі (102 працэнты), паслугі пасажырскага транспарту (102,2 працэнта), санаторна-аздараўленчыя (105,1 працэнта), вышэйшай адукацыі (113,2 працэнта). Індэкс цэн вытворцаў прамысловай прадукцыі ў студзені 2011 года да снежня 2010 года склаў 103,3 працэнта.

Прамая лінія

БЕЗ НЕЎРЫТАЎ, НЕЎРАЛГІЙ І РАДЫКУЛІТАЎ

Тэмай нашай чарговай «прамой лініі» стануць пытанні лячэння і прафілактыкі хвароб неўралагічнага профілю: радыкулітаў, неўрытаў, неўралгій, сасудзістых захворванняў галаўнога мозга і г.д. Чытачам будзе адказваць **загадчык неўралагічнага аддзялення мінскай 10-й гарадской клінічнай бальніцы, кандыдат медыцынскіх навук Аляксандр Віктаравіч ІВАНОЎ**.

«Прамая лінія» адбудзецца **17 лютага, у чацвер з 17.00 да 18.00** па нумарах: **8 (017) 292 38 92 і 292 38 21. Папярэднія пытанні можна задаваць па нумарах: 8 (017) 287 18 29 і 287 18 36.**

ЯЛАВІЧЫНА — КАНТРАБАНДАЙ

У зоне памежнага і мытнага кантролю маларыцкія міліцыянеры ў в. Радзеж зазірнулі ў двор нежылога дома, які належаў мясцовай жыхарцы, і знайшлі ў металічным кантэйнеры 25 поліэтыленавых пакетаў з ялавічынай. 1750 кг мяса на суму 13 мільёнаў рублёў было незаконна завезена на нашу тэрыторыю.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

БУЛЬБУ КРАЛІ ТОНАМІ

У лясным масіве ля вёскі Гута Пружанскага раёна ёсць агароднінасховішча ААТ «Айчына». Туды ноччу наведаліся зладзеі і вывезлі адразу тоны бульбы. Устаноўлена, што грузавік, на якім здзейснены крадзеж, належыць слесару аднаго з прадпрыемстваў пасёлка Ружаны.

Яна СВЕТАВА.



ГРАМНІЦЫ Ў ГРАМНІЦАХ

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

УВЁСЦЫ ГРАМНІЦЫ, паводле статыстыкі Гайненскага сельсавета, жыве 36 чалавек. У цёплы час года, дзякуючы вяртанню дачнікаў, адбываецца неверагодны рост грамніцкага насельніцтва — у два, а то і тры разы. Тады вёска віруе, гудзе, працуе. Цяпер жа на вуліцы вёскі рэдка калі ўбачыш чалавека. Пенсіянеры сядзяць па хатах, выходзяць два разы на тыдзень — калі прыязджае аўтакрама. Самы шаноўны ўзрост — 84 гады — мае Уладзімір Антонавіч Варановіч. А самаму маленькаму жыхару — Ваню Стасюлевічу — толькі два гадочкі. Калі Ваня падрасце і пачне цікавіцца гісторыяй Грамніц, дзед Варановіч шмат чаго незвычайнага яму раскажа і пакажа. Мне ж лагойскія Грамніцы падаліся сапраўдным музеем: тут столькі ўсяго цікавага — і будынкі, і старыя доты, і кузня, і прадметы этнаграфіі. А ў кожнага жыхара за плячыма процьма найцікавых фактаў. Напрыклад, дзед Варановіч распавядзе, як два разы быў на тым свеце...

СТАР. 3

ТЫДЗЕНЬ МОЦНЫХ МАРАЗОЎ

Увага!

На гэтым тыдні на тэрыторыі Беларусі ўсталюецца даволі халоднае надвор'е, паведаміў на онлайн-відэабрыфінгу Нацыянальнага прэс-цэнтра начальнік службы гідраметэапрагнозаў Рэспубліканскага гідраметцэнтра Дзмітрый РАБАЎ.

Надвор'е будзе фарміраваць магутны антыцыклон «Габрыэла», таму ападкаў да пятніцы не прадбачыцца, а сярэдняя тэмпература паветра будзе на 8—13 градусаў ніжэй за кліматычную норму. Сёння ўдзень мінус 13—19, на паўднёвым захадзе — 8—12 марозу. У сераду ўначы мароз пачне «кусацца» яшчэ мацней — да 17—24, на поўначы Беларусі ажно да 25—30; удзень — 10—17. Будзе даволі холадна і ў чацвер: уначы 13—20, на паўночным усходзе да 25—27, удзень 10—17.

У пятніцу і на выхадныя на поўдзень краіны завітае цыклон, які прынясе туды чарговую порцыю снегу. Аднак на большасці тэрыторыі краіны захаваецца вельмі халоднае надвор'е: уначы — 15—22, на поўначы да 28, месцамі ажно да 30. Удзень — 10—17, на паўночным усходзе да 20; у паўднёва-заходніх раёнах уначы — 7—14, удзень — 3—9.

Сяргей КУРКАЧ.

Як нас дурыць!

САБРАЎ З ПРАСЦЯКОЎ 250 ТЫСЯЧ ДОЛАРАЎ

Махляр абяцаў даверлівым кліентам даставіць з-за мяжы аўто

Аднак свайго слова так ніводнага разу і не стрымаў: прайдзісвет знаходзіў розныя прычыны, каб да апошняга дурыць галовы падманутым людзям. 24-гадовы жыхар Мінскага раёна, паводле звестак прэс-афіцэра Партызанскага РУУС Ганны Чыж-Літаш, знаходзіў сваіх ахвяр праз інтэрнэт, дзе ён размясціў аб'яву пра тое, што аказвае дапамогу па куплі аўтамабіляў на тэрыторыі Прыбалтыкі і Еўропы. На заманлівую прапанову «цёмнага коніка» ахвотныя знайшліся: кліенты цікавіліся пэўнымі маркамі машын і ў рэшце рэшт давалі грошы на іх набыццё. Хтосьці «ахвяраваў» хітруну адразу ўсю суму, іншыя давалі толькі частку грошай. Толькі ніхто з іх так і не абзавёўся аўтамабілем: адным махляр, адцягваючы момант расплаты, плёў пра вялікія чэргі на мытні, іншым — пра непарадкі з дакументамі, паводкі і снегапады ў Германіі. У кватэры прайдзісвета праваахоўнікі знайшлі мяшкі з жаночай бялізнай, якія той закупіў за мяжой за грошы падманутых кліентаў. Гэты тавар ён планаваў прадаць у рэспубліцы. У адносінах да «перагоншчыка» заведзена крымінальная справа.

Ігар ГРЫШЫН.

Открытое акционерное общество «ЦЕНТРОЭНЕРГОМОНТАЖ»

ПРОВОДИТ 18 марта 2011 года ОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ С ПОВЕСТКОЙ ДНЯ:

1. О финансово-хозяйственной деятельности Общества в 2010 году и основных направлениях деятельности Общества в 2011 году.
2. О результатах аудиторской проверки и проверки Ревизионной комиссии финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2010 год.
3. Утверждение годового отчета и баланса Общества.
4. О распределении прибыли, остающейся в распоряжении Общества (покрытии убытков).
5. Утверждение направлений использования прибыли, остающейся в распоряжении Общества на 2011 год и 1 квартал 2012 года.
6. Об избрании членов совета директоров и Ревизионной комиссии Общества.
7. Утверждение размера вознаграждения членов совета директоров и Ревизионной комиссии.
8. О покупке акций на баланс Общества.
9. Об оказании спонсорской помощи.
10. О применении прямого и индексного методов переоценки основных фондов.

Акционеры могут ознакомиться с материалами собрания в рабочие дни (понедельник—пятница), начиная с 05 марта 2011 года по адресу: г. Минск, Велосипедный пер., 7 с 8 часов 15 минут до 17 часов, перерыв на обед с 12 часов 30 минут до 13 часов 15 минут.

Место проведения собрания: г. Минск, Велосипедный пер., 7.

Время начала проведения собрания — 11 часов.

Список акционеров для участия в собрании будет составлен по состоянию реестра на 05 марта 2011 года.

Время регистрации участников собрания: в день проведения собрания с 9 часов до 10 часов 45 минут.

Регистрация участников собрания производится по предъявлении паспорта (другого документа, удостоверяющего личность), а представителей акционеров — по доверенности на передачу права участия и голосования на собрании.

Совет директоров

УНП 100092167

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

ЯПОНІЯ СТРАЦІЛА СТАТУС ДРУГОЙ ЭКАНОМІКІ СВЕТУ

Японія страціла статус другой пасля ЗША эканомікі свету. Пра гэта, як паведамляе France-Presse, сведчаць звесткі пра ВУП краіны, апублікаваныя ўрадам Японіі ў панядзелак, 14 лютага. Другое месца ў свеце па аб'ёме ВУП Японія займала з 1968 года.

Па выніках 2010 года ВУП Японіі склаў 5,474 трыльёна долараў, а Кітая — 5,879 трыльёна долараў. Японская эканоміка ўпершыню за апошнія тры гады прадэманстравала рост — на 3,9 адсотка за год. Аднак ВУП Кітая за той жа перыяд павялічыўся на 10,3 адсотка. Пры гэтым па паказчыку ВУП на душу насельніцтва Кітай па-ранейшаму далёка адстае ад Японіі — 4,5 тысячы долараў супраць 40 тысяч.

Кітай стаў трэцяй эканомікай свету ў 2007 годзе, адабраўшы гэты статус у Германіі. Шэраг аналітыкаў прагназаваў, што Кітай абыдзе Японію па аб'ёме ВУП яшчэ па выніках 2009 года, аднак тады японскай эканоміцы ўдалося ўтрымаць другое месца. Калі тэмпы эканамічнага росту ў Кітаі захаваюцца, то гэта краіна, адзначаюць апытаныя BBC News эксперты, на працягу найбліжэйшых дзесяці гадоў адбярэ статус першай эканомікі свету ў ЗША.

У СВЕЦЕ БУДУЕЦЦА КАЛЯ 40 ЯДЗЕРНЫХ ЭЛЕКТРАСТАНЦЫЙ

Прыкладна 60 краін абвясцілі пра планы пашырэння ядзернай дзейнасці ў мірных мэтах і звярнуліся да Міжнароднага агенцтва па атамнай энергіі (МАГАТЭ) з заяўкамі пра аказанне тэхнічнага садзейнічання ў гэтай сферы.

У Вене пад эгідай МАГАТЭ прайшла сустрэча, прысвечаная будучыні атамнай энергетыкі. На ёй эксперты з розных краін свету абмяняліся досведам і бачаннем шляхоў павышэння бяспекі атамных электрастанцый.

На сёння ў свеце працуе 440 АЭС. Усе гэтыя ядзерныя рэактары сканцэнтраваны ў 29 краінах свету. Але ўжо многія іншыя дзяржавы абвясцілі пра планы пашырэння ядзернай дзейнасці ў мірных мэтах. Цяпер у свеце будуецца яшчэ каля 40 ядзерных электрастанцый. Да 2030 года ад 10 да 25 дзяржаў свету абзавядуцца першымі ядзернымі рэактарамі.

ЕГІПЕЦКУЮ КАНСТЫТУЦЫЮ ПЕРАПІШУЦЬ ЗА 10 ДЗЁН

Вярхоўная рада ўзброеных сіл Егіпта, да якой перайшла ўлада ў краіне пасля адстаўкі прэзідэнта Хосні Мубарака, плануе скончыць напісанне новай канстытуцыі краіны ў дзесяцідзённы тэрмін. На працягу двух месяцаў будзе праведзены рэферэндум па асноўным законе дзяржавы.

Адной з асноўных прэтэнзій да ранейшай канстытуцыі з'яўлялася абмежаванне на ўдзел у выбарах, якое не пакідала апазіцыі шанцаў на паўнавартасны ўдзел у палітычным жыцці краіны. Таксама ваенная хунта паабяцала правесці прэзідэнцкія выбары ў шасцімесячны тэрмін. На час пераходнага перыяду фактычным лідарам у краіне будзе былы міністр абароны Хусейн Тантаві.

У СОНЕЧНАЙ СІСТЭМЕ ЗНАЙШЛІ ЯШЧЭ АДНУ ПЛАНЕТУ

У Сонечнай сістэме, магчыма, існуе яшчэ адна планета, прычым яна прыкладна ў чатыры разы большая за Юпітэр — самую масіўную з цяпер вядомых планет, якія круцяцца вакол Сонца. Яе арбіта пралягае ў тысячы разоў далей ад Сонца, чым зямная, таму нябеснае цела дагэтуль не знаходзілі, піша брытанская The Daily Mail.

Планету ўжо назвалі Цюхе — як грэчаскую багіню поспеху, якой у старажытнарымскай міфалогіі адпавядае Фартуна. Газавы гігант (да падобных планет адносяцца таксама Юпітэр, Сатурн, Уран і Нептун) размешчаны ў воблаку Оарта — сферычнай вобласці Сонечнай сістэмы, якая знаходзіцца прыкладна ў адным светлавым годзе ад Сонца. Звесткі, якія даказваюць існаванне Цюхе, будуць апублікаваны да канца 2011 года.

Здарэнні

ПРАВАЛІЎСЯ ПАД ЛЁД РАЗАМ СА СНЕГАХОДАМ

У Мінскае раённае падраздзяленне МНС ад мінака паступіла паведамленне, што ў Лагойску паблізу вуліцы Прамысловай на рацэ Гайне ў ваду праваліўся чалавек на снегаходзе. Патрэбна дапамога.

Выратавальнікі былі на месцы ўжо праз пяць хвілін. Высветлілася, што мужчына катаўся на рацэ на снегаходзе. На адлегласці 30 метраў ад берага лёд не вытрымаў нагрузкі і вадзіцель апынуўся ў вадзе. Таўшчыня лёду складала 6 сантыметраў, а глыбіня ракі на гэтым участку дасягала 1,5 метра. Снегаход цалкам знаходзіўся пад вадой, а мужчына стаяў на яго сядзенні па пояс у вадзе. Самастойна выбрацца на бераг ён не мог. Пры дапамозе лесвіцы і выратавальнай вяроўкі мужчыну выцягнулі з «палону». Стан яго быў здавальняючым, у шпіталізацыі ён патрэбы не меў.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ЗАО «РРБ-Банк» информирует вас о том, что с 1 марта 2011 года вступают в силу изменения в Правила организации обслуживания счетов физических лиц, клиентов ЗАО «РРБ-Банк».

УНН 100361187.

ДЫЯЛОГАВАЕ АКНО ДЛЯ ІНВЕСТАРА

На пытанні карэспандэнта «Звязды» адказвае дырэктар Мінскага абласнога тэрытарыяльнага фонду дзяржаўнай маёмасці Аляксей ВАСІЛЬЕЎ

— Патэнцыйных інвестараў цікавіць, як на практыцы працуе Указ кіраўніка дзяржавы № 108? Там ідзе гаворка аб продажы аб'ектаў за базавую велічыню, ці перадачу маёмасці ў бязвыплатнае карыстанне пад канкрэтны інвестыцыйны праект.

— Паводле гэтага ўказа ў Мінскай вобласці рэалізавана больш за 80 аб'ектаў, а 62 аб'екты перададзены ў бязвыплатнае карыстанне дзяржаўным юрыдычным асобам і індывідуальным прадпрымальнікам пад канкрэтныя інвестыцыйныя праекты. Заяўленыя інвестыцыі ў гэтыя аб'екты складаюць каля 45 млрд рублёў, плюс запланавана стварэнне 711 новых працоўных месцаў. Заўважу, што галоўным чынам за адну базавую велічыню рэалізуюцца тыя аб'екты, якія не выкарыстоўваліся да гэтага на працягу 2 гадоў.

— Што гэта за нерухомасць?

— У асноўным гэта аб'екты былых ваенных гарадкоў і знаходзяцца яны ў малых і сярэдніх гарадах вобласці. Стварэнне больш як 700 новых працоўных месцаў павінна паспрыяць развіццю дзелавой актыўнасці ў рэгіёне.

— Чуў, што інвестараў вы шукаеце і праз інтэрнэт?

— Усе аб'екты, што прапануюцца намі да рэалізацыі, ёсць у нас на сайце www.minsk-region.gov.by, (банер фонду Мінскаблмаёмасці). Там іх можна дасканала разглядзець. Усе аб'екты на сайце маюць якасныя каляровыя здымкі і апісанне, а таксама інфармацыя наконт таго, якім чынам яны будуць рэалізаваны і за які кошт (або што яны будуць перададзены пад канкрэтны інвестпраект).

Акрамя таго, на нашым сайце мы ўкаранілі так званае дыялогавае акно. Там патэнцыйны інвестар можа выказаць свае заўвагі і прапановы. Напрыклад, новы ўласнік можа выказаць прапанову, якая датычыцца зямельных пытанняў. Калі нашым клиентам неабходна атрымаць зямельны ўчастак, то мы, працуючы ў адной звязцы з землеўпарадкавальнай службай, вырашаем разам з інвестарам і гэтае пытанне. Тут мы прапануем поўную кансультацыю аб умовах валодання ці карыстання зямельным участкам і перспектывах атрымання дадатковых плошчаў зямлі для магчымага далейшага развіцця вытворчасці.

СТАР. 4

АДЗІН ЗВАНОК І НА ПЯЦЬ ГАДОЎ ЗА КРАТЫ?

На станцыі Гарадзея ўсіх пасажыраў электрычкі «Мінск-Баранавічы» папрасілі пакінуць вагоны. Да электрацягніка прыбыла сапёрна-піратэхнічная група і пачала шукаць бомбу. Праз 1 гадзіну 40 хвілін пасажыры паехалі далей, бо сапёры ніякіх выбуховых рэчываў не знайшлі.

Як паведаміў начальнік штаба Баранавіцкага аддзела транспартнай міліцыі Вадзім Кулік, вінаваты ў гэтай правакацыі жыхар Ганцавічаў, які патэлефанаваў у міліцыю і паведаміў, што электрычка замініравана. Дарэчы, «мінёр» ехаў у адным з вагонаў гэтага цягніка. Нумар мабільніка хутка ўстанавілі, была заведзена крымінальная справа. Цяпер «мінёр» можа быць асуджаны на 5 гадоў.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

З ГАРЭЛКАЙ УМЫКНУЎ АБЛІГАЦЫІ

Кошт кожнай каштоўнай паперы, якія ўкраў злодзей, складаў па адной тысячы долараў ЗША.

А пацярпеў у гэтым выпадку 47-гадовы мінчанін, які, на сваю бяду, меў неасцярожнасць пазнаёміцца з нячыстым на руку чалавекам. Паводле звестак прэс-афіцэра Заводскага РУУС Тамары Рулінскай, апошні ў выпадковага сябра ў кафетэрыі гастранома па вуліцы Ташкенцкай выкраў сумку, дзе ляжалі некалькі бутэлек гарэлкі: у той момант зламыснік паклаў вока менавіта на спіртное. А на наступны дзень ён выявіў, што здабычай сталі яшчэ і 7 аблігацый, кожная з якіх каштавала па 1 тысячы долараў. Да затрымання 34-гадовы злодзей паспеў адну аблігацыю здаць і атрымаць за яе грошы. Астатнія шэсць каштоўных папер праваахоўнікамі вернуты ўладальніку.

Ігар ГРЫШЫН.

«СЛУЖУ РЭСПУБЛІЦЫ БЕЛАРУСЬ!»

У гэты дзень, 12 лютага, клятвы гучалі па ўсёй краіне. У воінскіх часцях прайшлі ўрачыстыя мерапрыемствы, якія былі прысвечаныя прыняццю Ваеннай прысягі новым папаўненнем. Рады Узброеных Сіл папоўніла сем з паловай тысяч маладых хлопцаў.

Традыцыйна ў воінскіх часцях дзень прыняцця прысягі аб'яўлены выхадным, а паглядзець на цырымонію прыязджаюць родныя і сябры. Сёлета мароз і халодны вецер таксама не перашкодзіў урачыстасці — некалькі дзясяткаў чалавек прыехалі ў ваенны гарадок Масюкоўшчына, каб на свае вочы пабачыць, як іх сыны, браты, унукі, каханыя становяцца сапраўднымі мужчынамі. Тут прысягу прынялі дваццаць чатыры разведчыкі 53-га цэнтра ўпраўлення разведкі і пяцьдзясят дзевяць ваеннаслужачых 65-й аўтамабільнай брыгады транспартных войскаў.

Марына БЕГУНКОВА.
Фота аўтара.

ISSN 1990 - 763X

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 15.02.2011 г. (для б/н разлікаў)

▲1 долар ЗША	3 017,00	1 чэшская крона	167,90
▼1 еўра	4 068,42	1 польскі злоты	1 036,70
1 латвійскі лат	5 768,64	▲1 расійскі рубель	103,12
1 літоўскі літ	1 177,00	1 украінская грыўня	379,26

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ

USD	29,2583
10 UAH	36,7774
1000 BYR	9,7042
EUR	39,6040

АГЕНЦТВА УРАДАВАГА ІНФАРМАВАННЯ

ГУСІНЫ ТЛУШЧ НЕ АБАРАНЯЕ АД МАРОЗУ, А ТОЛЬКІ ШКОДЗІЦЬ!

Так сталася, што сапраўдныя маразы прыйшлі ў нашу краіну, калі беларусы паспелі расслабіцца і пачалі рыхтавацца да вясны. Пасля пастаянных адліг ужо слаба верылася, што зіма возьме сваё. Тым не менш да канца бягучага тыдня сіноптыкі прагназуюць сапраўднае зімовае надвор'е — месцамі па краіне ў начны час сутак слупок тэрмометра можа апусціцца да 30 градусаў ніжэй за нуль. А гэта значыць, што колькасць ахвяр маразоў пойдзе на сотні. Па статыстыцы, штогод з абмарожаннямі рознай ступені цяжкасці ў бальніцы хуткай медыцынскай дапамогі паступае ад 1,5 да 3,5 тысячы чалавек па краіне. Аднак рэальная колькасць пацярпелых ад абмарожанняў і пераахалоджвання арганізма істотна большая.

Спецыялісты апёкавых аддзяленняў сталічнай Бальніцы хуткай медыцынскай дапамогі даюць парады, як перажыць «марозны экстрым»:

Улічваючы, што на пачатковых стадыях абмарожання боль можа адсутнічаць, неабходна перыядычна мацаць нос, вушы, пальцы рук і аглядаць адкрытыя ўчасткі цела. Дыхаць трэба толькі праз нос — гэта папярэдзіць не толькі адмарожванне носа, але і пераахалоджванне верхніх і ніжніх дыхальных шляхоў, якое цягне за сабой розныя запаленчыя захворванні органаў дыхання аж да запалення лёгкіх. Вельмі важна прыкрываць усе адкрытыя ўчасткі цела шалікам, у тым ліку і рот, і дыхаць праз шалік.

Сярод насельніцтва шырока распаўсюджана памылковая думка, што існуюць мазі, з дапамогай якіх можна папярэдзіць абмарожанні, у прыватнасці, такім многія лічаць гусіны тлушч. Аднак усе гэтыя сродкі, папярэджваюць спецыялісты, не толькі неэфектыўныя, але і шкодныя. Справа ў тым, што тлушчы, насычаючы паверхневыя арагавелыя слаі скуры і замяшчаючы там паветра, павышаюць цеплаправоднасць скуры і тым самым спрыяюць яе пераахалоджванню. Надзея на такія мазі, на жаль, правакуе неапраўданае грэбаванне іншымі простымі, але надзейнымі мерамі прафілактыкі.

На пачатковых стадыях абмарожання скура бляднее і страчвае адчувальнасць. Пры глыбокіх абмарожаннях пацярпелы ўчастак цела мае характэрны выгляд: скура халодная навобмацак, неадчувальная, бледнаватая, канечнасць падобная на акамянелую. Пасля сагравання хутка развіваецца ацёк, моцны боль, з'яўляюцца пухіры, знікае адчувальнасць. Калі болевая адчувальнасць адсутнічае на працягу сутак, гэта ўказвае на абмарожанне 3-й ці 4-й ступені цяжкасці.

За мінулыя выхадныя ў сталіцы было зарэгістравана 9 выпадкаў халадовых траўмаў. 12 лютага ў гарадскую службу хутай дапамогі звярнуліся тры чалавекі з абмарожаннямі, 13 лютага — яшчэ чатыры. Таксама ў гэтыя дні двум мінчанам быў пастаўлены дыягназ «пераахалоджванне арганізма».

Атрымаць хранічнае абмарожванне першай ступені можна пры пастаянным, хоць і не моцна выражаным, ахалоджванні, калі чалавек працуе на вуліцы ў халоднае сырое надвор'е ці пры нашэнні цеснага абутку, які парушае кровазварот у канечнасцях. У гэтым выпадку ў пацярпелых на скуры кісцей, ступняў, вушныхракавін, радзей на носе і шчоках з'яўляюцца чырвона-сінюшныя ці барвовыя плямы, скура ацякае, становіцца халоднай навобмацак, пры гэтым чалавек адчувае сверб і смыленне, асабліва пры хуткім саграванні. Большасць халадовых траўмаў у дарослых адбываецца ў стане алкагольнага ап'янення. Алкаголь дае адчуванне сагравання на 15-20 хвілін, а затым цэнтр тэрмарэгуляцыі прыгнятаецца, наступае павышаная цепладдача і развіваецца хуткае пераахалоджванне арганізма. Алкаголь павялічвае згусальнасць крыві, выклікае парушэнні мікрацыркуляцыі і зніжае хуткасць цячэння крыві ў канечнасцях. У дзяцей, як правіла, абмарожанні абумоўленыя працяглым знаходжаннем на холадзе, адзеннем і абуткам не па сезоне, пакінутымі ў перыяд надзвычай нізкіх тэмператур адкрытымі ўчасткамі цела (часцей за ўсё гэта непрыкрытыя вушныяракавіны і твар).

Аказанне дапамогі на першай стадыі абмарожання заключаецца ў аднаўленні кровазвароту ў пашкоджаных тканках. Сагрэць канечнасці можна з дапамогай цёплага адзення. Катэгарычна недапушчальнае для сагравання канечнасцяў расціранне снегам! Крышталікі снегу дадаткова траўміруюць пашкоджаную пры замярзанні скуру, увільгатняюць яе, зніжаюць тэмпературу і тым самым толькі паглыбляюць пашкоджанне. Пацярпеламу неабходна даць цёплае пітво. Арганізм трэба саграваць знутры. Пры больш глыбокіх абмарожаннях трэба ўхутаць пацярпелыя ўчасткі цела сухім і цёплым адзеннем і даставіць пацярпелага ў бліжэйшую лячэбную ўстанову. Позні зварот па медыцынскую дапамогу, асабліва пры цяжкім абмарожанні, пагражае вельмі небяспечнымі ўскладненнямі. У выпадку, калі вы ўбачылі чалавека, які ляжыць на вуліцы, неабходна неадкладна даставіць яго ў цёплае памяшканне, інакш ён можа застацца без ног і без рук, а то і зусім замерзнуць. Тым, хто раней ужо стаў ахвярай халадовай траўмы, трэба памятаць, што абмарожаныя ўчасткі цела асабліва адчувальныя да холаду, таму іх трэба старанна аберагаць ад пераахалоджвання, каб пазбегнуць парушэнняў у сасудзістай сістэме пацярпелых канечнасцяў.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Доктар адкажа

Ёсць пытанні? Тэлефануйце...

На гэтым тыдні дзяжурыць на «гарачай» лініі Міністэрства аховы здароўя (222 70 80) плануюць:

15 лютага — галоўны ўрач 15-й мінскай гарадской паліклінікі Аляксандр Іванавіч РУСЕЧКІН.

16 лютага — галоўны ўрач Мінскага абласнога процітуберкулёзнага дыспансэра Андрэй Пятровіч МІЦЬКО.

17 лютага — намеснік дырэктара РНПЦ гематалогіі і трансфузіялогіі Лявонцій Георгіевіч ЛАГОДЗІЧ.

18 лютага — намеснік дырэктара РНПЦ неўралогіі і нейрахірургіі Рышард Рамуальдавіч СІДАРОВІЧ.

«Гарачая лінія» ўпраўлення аховы здароўя Мінаблвыканкама (017) 220 20 25

15 лютага — загадчык афтальмалагічнага аддзялення для дзяцей Мінскай абласной дзіцячай клінічнай бальніцы Ларыса Паўлаўна МАКАРАВА.

16 лютага — загадчык акушэрскага аддзялення паталогіі цяжарнасці Мінскага абласнога радзільнага дома Ганна Нічыпараўна ЖОРАВА.

17 лютага — загадчык кансультацыйна-метадычнага аддзялення Мінскага абласнога скурна-венералагічнага дыспансэра Анжаліка Аляксееўна ЛЕБЯДЗЕЎСКАЯ.

18 лютага — намеснік галоўнага ўрача Мінскай цэнтральнай раённай бальніцы Аляксандр Уладзіслававіч МЫШКО.

Спорт-тайм

ДОМРАЧАВА ЗНОЎ ТРЭЦЯЯ

Пасля гонкі Дар'я скардзілася на тое, што стаміліся ногі.

На этапе Кубка свету ў амерыканскім Форт-Кейне Дар'я Домрачава ў гонцы з масавым стартам завявала бронзавы медаль. Апярэдзілі Дашу толькі дзве немкі — Магдалена Нойнер і Андрэа Хенкель. І хуткасць, і стральба на гэты раз не падвялі Домрачаву — нейкі час наша Дар'я апярэджвала Хенкель і магла прэтэндаваць на больш высокае месца.

На чатырох агнявых рубяжах у беларускі ўсяго адзін промах — столькі ж і ў суперніц на п'едэстале. А вось калі казаць пра хуткасць, то ў Дар'і ёсць прычыны быць незадаволенай сабой. Так яна адазвалася пра амерыканскую трасу: «Для дзяўчат было вельмі складана некалькі разоў праходзіць пад'ём. У мяне вельмі стаміліся ногі. Заўтра мы вернемся ў Германію, адпачнём некалькі дзён, а затым пачнём збор у Ланг-дорфе», — цытуе Домрачаву афіцыйны сайт IBU. У агульным заліку Кубка свету Дар'я Домрачава займае шосты радок. Узначальвае спіс немка Андрэа Хенкель.

КУШНІР ВЫЙГРАЎ МАСКОЎСКІ ЭТАП КУБКА СВЕТУ

У выхадныя ў Маскве завяршыўся 14-ты этап Кубка свету па фрыстайле. У мужчынскім турніры па лыжнай акрабатыцы не было роўных нашаму Антону Кушніру. Украінец Станіслаў Краўчук заняў другое месца, сярэбраны прызёр чэмпіянату свету кітаец Ці Гуанпю — трэцяе. Лепшым з расіян стаў Ілья Бураў, у яго шостае месца.

Арганізатары абяцалі і рэкордную для этапаў Кубка свету колькасць гледачоў. Праўда, як паведамляюць расійскія СМІ, такая колькасць гледачоў дасягалася штучна — многія школы Масквы атрымалі загад забяспечыць спаборніцтвы сваімі вучнямі ў якасці балельшчыкаў, што ў такое марознае надвор'е і падчас разгулу грыпу аказалася задачай няпростай.

МАТЧ БАТЭ СУПРАЦЬ «ПСЖ» ПАД ПАГРОЗАЙ

Як вядома, у чацвер, 17 лютага, на мінскім стадыёне «Дынама» павінен быў адбыцца матч 1/16 фіналу Лігі Еўропы, дзе наш чэмпіён БАТЭ вырашаў бы свой далейшы еўракубкавы лёс. Да гэтага паядынку наша каманда старанна рыхтавалася, правёўшы два зборы ў Турцыі. Але гэта ў Анталі зараз плюс 18, а ў Мінску, куды каманда вярнулася ўчора, раніцай было мінус 20. І прагнозы несуцяшальныя: самай халоднай на гэтым тыдні абяцаюць ноч на сераду: да — 30 на поўначы! Паводле правілаў, матч можа быць перанесены на наступны дзень або на поле нейтральнай краіны, калі тэмпература ніжэй за 15 градусаў.

Французы адчувальныя ў плане надвор'я — гэта мы і з гісторыі з войскам Напалеона памятаем. Яшчэ ў панядзелак кіраўніцтва «ПСЖ» звярнулася да УЕФА з просьбай перанесці матч у сувязі з халодным надвор'ем, якое ўсталявалася ў Беларусі.

— Мы гатовыя гуляць у поўдзень ці ў 14 гадзін у выніку неабходнасці, — адзначыў галоўны трэнер каманды Антуан Камбуарэ. — Я спадзяюся, ва УЕФА знойдуцца адказныя супрацоўнікі, якія прымуць правільнае рашэнне ў гэтай сітуацыі, — паведамляе lequipe.fr.

Тым часам крыніцы ва УЕФА паведамляюць, што рашэнне па пераносе матчу могуць быць прынятыя толькі ў сераду.

— Мы атрымалі запыт ад «ПСЖ», аднак рашэнне прымем у сераду, — цытуе прадстаўніка УЕФА L`Equipe.

Трэба адзначыць, што перанесці паядынак на больш позні тэрмін даволі складана з-за насычанага календара «ПСЖ».

Алена АЎЧЫННІКАВА.

Алег ПРАЛЯСКОЎСКІ:

«ІДЭОЛАГІ — НЕ НАМПАЛІТЫ, НЕ ПАЛІТРУКІ...»

ТЫЯ ІДЭОЛАГІ, якія ў складзе інфармацыйна-прапагандысцкіх груп сустракаюцца з суграмадзянамі ў працоўных калектывах, па месцы жыхарства, павінны не толькі «прасвятляць», але і вывучаць на месцы сітуацыю, дапамагаць людзям у вырашэнні самых розных жыццёвых праблем. Трэба больш актыўна займацца вывучэннем таго, што зараз хвалюе падлеткаў, не пакідаць без увагі лёс адораных хлопцаў і дзяўчат. Гэтыя і іншыя пытанні ідэолагі Віцебшчыны абмеркавалі падчас выніковай калегіі ўпраўлення ідэалагічнай работы.

Начальнік управлення ідэалагічнай работы Віцебскага аблвыканкама Аляксандр КЛІЦУНОЎ займае гэтую пасаду нядаўна. Раней ён працаваў прэс-сакратаром Віцебскага аблвыканкама. Разам з прадстаўнікамі рэспубліканскіх СМІ і рэдакцый абласнога цэнтра часта выязджаў у глыбінку, каб дапамагчы журналістам асвятліць праблемы рэгіёнаў, расказаць пра напрацаваны вопыт, перспектывы развіцця.

У сваім выступленні галоўны ідэолаг вобласці не хаваў праблемных нюансаў. У прыватнасці, пакуль рана канстатаваць, што выніковасць правядзення вядомых «інфармацыйных дзён» дасягнула жаданых вынікаў. Для выступленняў у працоўных калектывах — на прадпрыемствах і арганізацыях, па месцы жыхарства — рэдка прыцягваюцца работнікі мясцовых органаў улады, якія на месцы маглі б выслухаць людзей, унікнуць у іх праблемы. І не паўсюль адпаведных сустрэч з людзьмі столькі, колькі магло б быць. Напрыклад, у Глыбоцкім раёне іх колькасць летась была значна меншая, чым у іншых раёнах.

«Асновай у інфармацыйна-прапагандысцкай рабоце павінен стаць дэвіз: «Сёння неабходна эканоміка ведаў, эканоміка эканомії і эканоміка дысцыпліны». Каб агітаваць людзей актыўна ўдзельнічаць у дасягненні пастаўленых перад вобласцю мэт, ідэолагам трэба самім верыць у рэальнасць ажыццяўлення задуманага. Трэба быць палітычна падкаванымі, — падкрэсліў новы начальнік управлення. — Адказна трэба падыходзіць да ажыццяўлення ідэалагічнай работы ў цэлым. Не быць адарванымі ад рэалій жыцця». Менш фармалізму, больш творчасці ў рабоце і аператыўнасці — такіх падыходаў чакаюць ад ідэолагаў.

Намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама Леанід КАВАЛЁЎ даволі нестандартна звярнуўся да ідэолагаў, намеснікаў па ідэалагічнай рабоце кіраўнікоў раёнаў з канкрэтнымі пытаннямі: «Ці ёсць у вас добры камп'ютар па месцы работы і доступ да высакахуткаснага інтэрнэту? Каб паглядзець навіны свайго ж сайта, навіны вобласці, краіны? Хто канкрэтна адказны за вядзенне сайтаў райвыканкамаў і гарвыканкамаў? Калі на англійскую мову будуць пераведзены прапановы для інвестараў?»

Трэба яшчэ зрабіць многае, каб сайты адпавядалі часу, каб іх напоўненасць была актуальнай, цікавай. Каб тыя, хто адкрыў іх, не трацілі час на пошук неабходнай інфармацыі. І чаму няма спасылак на сайты гарадоў-пабрацімаў?

Звяртаючыся да рэдактараў раённых газет, Леанід Кавалёў заклікаў больш актыўна паказваць у публікацыях праблемы рэгіёнаў. Пры гэтым старацца падказаць уладам, як можна было б вырашыць праблему.

Начальнік аддзела ідэалагічнай работы Полацкага гарвыканкама Наталля ГАНЕБНАЯ падкрэсліла, што сёння ідэалагічны работнік — сувязнае звяно паміж органамі дзяржаўнага кіравання, самакіраванні і людзьмі. І адна з задач ідэолагаў — давесці да ўлады праблемы, якія хвалююць зараз насельніцтва. Яна прапанавала для паляпшэння ідэалагічнай работы арганізаваць правядзенне абласных тэматычных семінараў для намеснікаў кіраўнікоў па ідэалагічнай рабоце па сферах дзейнасці. Было б добра праводзіць трэнінгі і іншыя падобныя мерапрыемствы перад важнымі палітычнымі падзеямі.

«Тыя ж апаненты ўлады вельмі добра падрыхтаваныя для правядзення палітычных кампаній», — расказала яна калегам. — У якасці прыкладу магу прывесці сустрэчы перад выбарамі кіраўніка дзяржавы з трыма кандыдатамі. Адказваючы на пытанне выбаршчыкаў наконт таго, што яны зробяць, калі перамогуць на выбарах, усе тры кандыдаты заявілі, што расфарміруюць аддзелы ідэалагічнай работы. Значыць, бачаць у дзяржаўных ідэолагах вялікую сілу».

Рэктар Віцебскага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта, кіраўнік абласной арганізацыі рэспубліканскага грамадскага аб'яднання «Белая Русь» Валерый БАШМЕТАЎ расказаў пра тое, што для пашырэння арганізацыі, каб яна атрымала яшчэ большы давер народа, трэба яшчэ папрацаваць. Больш за 9,8 тысячы чалавек у вобласці з'яўляюцца членамі арганізацыі. Эфектыўна дзейнічаюць грамадскія прыёмныя «Белай Русі». І многія праблемы, з якімі па дапамогу звяртаюцца грамадзяне, актывісты стараюцца вырашаць адразу. Шмат праводзіцца дабрачынных акцый. Вельмі актыўна дзейнічаюць арганізацыі «Белай Русі» ў Наваполацку, Ушацкім раёне. Але ж, у прыватнасці, у Талачынскім раёне ўсяго 11 чалавек у складзе арганізацыі.

У рабоце калегіі браў удзел **міністр інфармацыі Рэспублікі Беларусь Алег ПРАЛЯСКОЎСКІ**. Расказваючы журналістам аб дзейнасці ідэолагаў, міністр адзначыў: «Ідэолагі — не нампаліты, не палітрукі. Сучасныя ідэолагі — гэта новая генерацыя людзей: разумных, з талентам і — самае галоўнае — адданых сваёй Радзіме і народу. Шурпатасці , якія ўсё-такі ёсць у ідэолагаў, будуць ухіляцца». Пацвярджэнне зладжанай работы ідэолагаў, як адзначыў міністр, — гэта вынікі мінулых прэзідэнцкіх выбараў.

Напрыканцы мерапрыемства міністр назваў калегію ідэолагаў Віцебшчыны адной з самых эфектыўных і плённых. Расказваючы пра работу СМІ Беларусі, міністр адзначыў, што наша краіна ўнікальная тым, што не панізіліся накалады друкаваных СМІ. І гэта нягледзячы на тое, што ўжо 20 адсоткаў насельніцтва глядзяць нумары газет на сайтах. Павялічваецца колькасць мясцовых газет, якія выйшлі на самаакупнасць. І кожная чацвёртая з іх — на Віцебшчыне. У якасці ўзорнага прыкладу, чаму можна навучыцца, міністр назваў створаны наваполацкі медыйны холдынг, дзе тэлебачанне і друк у адной «звязцы»...

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ВІНШАВАННЕ ПРЭЗІДЭНТА

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка павіншаваў Прэзідэнта Рэспублікі Сербія Барыса Тадзіча і народ гэтай краіны з нацыянальным святам — Днём дзяржаўнасці Сербіі.

«Упэўнены, што сяброўскія адносіны і ўсебаковае супрацоўніцтва паміж Рэспублікай Беларусь і Рэспублікай Сербія будуць і ў далейшым пашырацца і развівацца ва ўсіх сферах узаемнага інтарэсу на карысць народаў нашых краін», — гаворыцца ў віншаванні.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Абзац

Дзевяць пар мінскіх маладажонаў выбралі ў сямейныя апекуны святога Валянціна — менавіта столькі пар учора ў сталіцы зарэгістравала шлюб. Як вядома, панядзелак у ЗАГСах — выхадны дзень. Між тым, было вырашана распісаць усіх ахвотных, калі такія знойдуцца, у адной з устаноў. Выбар выпаў на Ленінскі ЗАГС Мінска.

За мінулыя выхадныя і пятніцу ў Беларусі зарэгістравана 1358 ДТЗ з матэрыяльным уронам. Здарылася 60 ДТЗ, у якіх 18 чалавек загінула і 65 атрымала раненні. За кіраванне транспартным сродкам ў стане алкагольнага ап'янення затрымана 405 кіроўцаў.

Споўнілася 75 гадоў з дня нараджэння вядомай польскай спявачкі Ганны Герман. Яна была вельмі папулярнай сярод амататараў лірычнай песні ў Савецкім Саюзе ў 1970-80 гг. Памерла ў 1982 г.

Жанчына выжыла, прапіўшы пад колы аўтобуса МАЗ. Кіроўца аўтобуса ля прыпынку «Тубдыспансэр» (пасёлак Лясны пад Мінскам) не справіўся з кіраваннем і наехаў на жанчыну, якая ішла па пешаходным пераходзе. Жанчына апынулася заблакаванай пад воссю аўтобуса. Яе змаглі вызваліць толькі выратавальнікі. У пацярпелай былі лёгкая чэрапна-мазгавая траўма і закрыты пералом шчыкалаткі.

Пацыент кардыялагічнага аддзялення бальніцы хуткай медыцынскай дапамогі Мінска выкінуўся з 12-га паверха гэтай установы. Інцыдэнт адбыўся 11 лютага. Мужчына 1944 года нараджэння выскачыў з акна бальнічнай палаты. Яго спрабавалі ўтрымаць людзі, якія знаходзіліся побач, але не паспелі. Пракуратура праводзіць праверку па факце.

Поўны абзац

Кіеўскі таксіст прымушае пасажыраў мыць рукі, абуваць бахілы і надзяваць маску. Пры пасадцы ў яго аўтамабіль ён прапануе пасажырам працерці рукі сродкам для дэзынфекцыі, выдае кожнаму маску і гумавыя бахілы. І сам ён пры гэтым карыстаецца марлевай павязкай, якую мяняе праз кожныя 3 гадзіны. Гэты таксіст ужо прыцягнуў да сябе ўвагу калег і кліентаў. Іншыя таксісты смяюцца з яго, многія жартуюць, што пасля кожнага пасажыра ён мяняе на сядзеннях поліэтыленавыя чахлы. Так гэта ці не, аднак рэкламу сабе гэты чалавек забяспечыў. Многія кліенты бяруць у яго нумар тэлефона і, па магчымасці, замаўляюць менавіта яго. Людзей прыцягвае тое, што яны будуць ехаць у аўтамабілі, у якім няма магчымасці заразіцца бацыламі ад папярэдніх пасажыраў. А многім проста падабаецца ездзіць у чыстым аўтамабілі і ведаць, што іх абслугоўвае акуратны кіроўца.

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

Вады папіць папрасіла

У Віцебску 60-гадовая пенсіянерка адчыніла дзверы сваёй кватэры незнаёмай дзяўчыне, якая папрасіла папіць вады. Было гэта каля трох гадзін дня. Пасля таго, як дзяўчына пакінула кватэру гасцінная жанчыны, апошняя не знайшла 350 тысяч рублёў. Міліцыянеры высветлілі, што скрала грошы 32-гадовая беспрацоўная жыхарка вёскі Адаменкі Лёзненскага раёна. Заведзена крымінальная справа.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Крымінал, здарэнне

ГАНДЛЯВАЎ «КЛУБНІЧКАЙ»

53-гадовы мужчына, паводле звестак аддзялення інфармацыі і грамадскіх сувязяў ГУУС Мінгарвыканкама, спецыфічнае кіно капіраваў з прывезеных ім з тэрыторыі Расіі дыскаў ці скачаваў з інтэрнэта на чыстыя дыскі, а пасля ўпакоўваў порна ў футляры з адпаведнымі ўкладышамі і прадаваў пастаянным кліентам альбо на рынку ў «Ждановічах».

Затрымалі дзялка з доказамі віны падчас чарговай здзелкі. А падчас агляду яго кватэры было канфіскавана 2508 гатовых да продажу дыскаў з порнастужкамі, у тым ліку ў 40 выпадках галоўнымі выканаўцамі былі дзеці (самай малодшай на выгляд было... 3-4 гадкі). Акрамя таго, у «бізнэсмена» канфіскавалі 825 вокладак для чарговай партыі порна, камп'ютарную і капіравальную тэхніку, расходныя матэрыялы. На аналагічнай вытворчасці «спаліўся» 36-гадовы сталічны жыхар, які, праўда, дзейнічаў з меншым размахам. У кватэры апошняга было канфіскавана крыху больш за тысячу дыскаў з «клубнічкай», чыстыя «балванкі», вокладкі і неабходнае абсталяванне.

Ігар ГРЫШЫН.

У КВАТЭРЫ ВЫБУХНУЎ БЫТАВЫ ГАЗ

Бліжэй да апоўначы ў нядзелю ў Дзяржынскае раённае падраздзяленне МНС мясцовыя жыхары паведамілі пра выбух бытавога газу ў кватэры, размешчанай у пасёлку Энергетыкаў па вуліцы Алега Кашавога.

Высветлілася, што выбух газу без яго наступнага гарэння адбыўся ў аднапакаёвай кватэры, размешчанай на другім паверсе пяціпавярховага шматкватэрнага блочнага, абкладзенага цэглай, жылога дома. Гаспадар кватэры брыгадай хуткай дапамогі быў дастаўлены ў Дзяржынскую цэнтральную раённую бальніцу з апёкамі твару і канечнасцяў рук першай і другой ступені, 30 працэнтамі апёкамі цела. Пашкоджаны чатыры кватэры. Разбураны міжпакаёвыя перагародкі, пашкоджаны пліты перакрыццяў (з'явіліся трэшчыны), шкленне вокнаў некалькіх кватэр і ў пад'ездзе. Самастойна з дзесяці кватэр эвакуіраваліся 23 чалавекі, дзевяць жыльцоў самастойна рассяліліся ў сваякоў. Як мяркуецца, прычына выбуху — парушэнне правілаў эксплуатацыі газавых устройстваў і агрэгатаў (уцечка газу з-за негерметычнасці газавага абсталявання). На месцы выбуху працуюць брыгады работнікаў з некалькіх спецыялізаваных арганізацый, вырашаюцца пытанні аказання дапамогі людзям.

Сяргей РАСОЛЬКА.

МАРОЗАМ ПА ГРЫПЕ

У Магілёўскай вобласці на мінулым тыдні зарэгістраваны больш за 24 тысячы выпадкаў захворвання на вострыя рэспіраторныя інфекцыі і грып. Амаль 60% хворых — дзеці. Агульны ўзровень захваральнасці за тыдзень не павялічыўся. Урачы спадзяюцца, што марознае надвор'е, якое ўсталявалася, паспрыяе паляпшэнню эпідэмічнай абстаноўкі.

Цяпер у рэгіёне не працуюць 23 навучальныя ўстановы ў Магілёве, Бабруйску, Клімавічах, Быхаве і Шклове. Ад панядзелка адноўленыя заняткі ў 6-ці школах вобласці. Рэкамендацыі медыкаў і эпідэміёлагаў па-ранейшаму простыя: пазбягаць шматлюдных месцаў, часцей мыць рукі, праветрываць памяшканні і гуляць на свежым паветры, рацыянальна харчавацца, выкарыстоўваць маскі пры кантакце з хворым чалавекам, а пры першых сімптомах хваробы заставацца дома і выклікаць урача.

Ілона ІВАНОВА.

ВЕЖУ РАТУШЫ АДЧЫНІЛІ З нагоды ДЛЯ ЗАКАХАНЫХ

Спецыяльна для закаханых, нягледзячы на афіцыйны выхадны, у Дзень Святога Валянціна ў Віцебску арганізавалі выхад на аглядальную пляцоўку сімвала горада — старажытнай ратушы.

Як паведаміў «Звяздзе» **Валерый ШЫШАНАЎ, намеснік дырэктара Віцебскага абласнога краязнаўчага музея**, такім чынам музейныя работнікі вырашылі павіншаваць закаханых са святам. Дазвол падняцца на вежу ратушы, каб палюбавацца горадам і прызнацца ў каханні, абышоўся ўсяго ў пяць тысяч рублёў. Безумоўна, такая ўнікальная магчымасць запомніцца яшчэ і таму, што выхад на пляцоўку на вышыню палёту птушак запланавана адкрыць для экскурсій толькі калі пацяплее.

Сёлета святкаванне стала незвычайным таксама і тым, што перад «прафесійным» святам закаханых усіх ахвотных запрасілі на галоўную плошчу вобласці, каб яны выстраіліся ў форме сэрца і адправілі ў нябёсы паветраныя шарыкі — у знак прызнання ў любові да старажытнага горада і ў каханні. Калі гэты нумар рыхтаваўся да выхаду, 14-га лютага ў 14 гадзін прыйшоў час ажыццявіць тое, што было запланавана.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

В проектной декларации по жилым домам №№ 1, 2, подземной гараж-стоянке № 3 и реконструкции жилого дома № 5 по улице Сурганова (застройщик СООО «Арэса-Сервис ТС»), опубликованной в № 26 от 10.02.2011 г., была допущена неточность.

ИНФОРМАЦИЮ О СРОКАХ СДАЧИ ДОМОВ В ЭКСПЛУАТАЦИЮ В НОВОЙ РЕДАКЦИИ СЛЕДУЕТ ЧИТАТЬ ТАК:

Ввод в эксплуатацию жилого дома № 1 по генплану – II квартал 2012 г.

Ввод в эксплуатацию жилого дома № 2 по генплану – IV квартал 2011 г.

Ввод в эксплуатацию подземного гаража – III квартал 2012 г.

НЕСВИЖСКИЙ РАЙОННЫЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ
24 февраля 2011 года в 10.00 проводит повторный открытый аукцион по продаже земельных участков в частную собственность гражданам Республики Беларусь для строительства и обслуживания жилого дома:

№ лота	Адрес земельного участка, кадастровый номер	Площадь земельного участка, га	Наличие инженерных сетей	Начальная цена (бел. руб.)	Задаток (бел. руб.)
1	Минская область, г. Несвиж, ул. Несвижская, 67, к/н 624250100001004198	0,0966	Возможность подключения электроснабжения, газоснабжения, водоснабжения,наличие асфальтированного подъезда	3 000 000	290 000
2	Минская область, г. Несвиж, ул. Несвижская, 75, к/н 624250100001004194	0,0967		3 000 000	290 000

Условия участия в аукционе опубликованы в газете «Звязда» (№ 2 от 05.01.2011 года).

Задаток перечисляется в срок по 23 февраля 2011 года на р/с 3642200070020 в ОАО «АСБ Беларусбанк», код 523, г. Несвиж, УНП 600038472, получатель платежа – Несвижский районный исполнительный комитет.

Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами принимаются ежедневно в рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по адресу: г. Несвиж, ул. Советская, 1, каб. 309. Последний день подачи заявок – 23 февраля 2011 года до 17.00.

Извещение о проведении 18 марта 2011 года открытого аукциона по продаже недвижимого имущества Белкоопсоюза

Предмет торгов (наименование и характеристики продаваемого имущества)	- здание административно-хозяйственное общей площадью 318,6 кв.м, инвентарный номер 500/С-41633, литер А 1/к; - здание специализированное иного назначения общей площадью 305,1 кв.м, инвентарный номер 500/С-41634, литер В 1/к; - здание специализированное иного назначения общей площадью 28,1 кв.м, инвентарный номер 500/С-41635, литер Д 1/к; - здание специализированное иного назначения общей площадью 2608,7 кв.м, инвентарный номер 500/С-41639, литер Б 1-3/к; - здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ общей площадью 486,5 кв.м, инвентарный номер 500/С-41640, литер Г 1/к; Е 1/м
Сведения о земельном участке	Кадастровый номер 500000000008000023, площадь – 0,6665 га
Местонахождение продаваемого имущества	г. Минск, ул. Гало, д. 148а
Сведения о продавце	ЧУП «Завод Белкооппрогресс» Белкоопсоюза, ул. Бабушкина, 64, 220024, г. Минск, п/у Колядичи
Сведения об организаторе аукциона	УП «Минский городской центр недвижимости», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск,
Начальная цена предмета торгов без учета НДС	6 930 000 000 белорусских рублей
Сумма задатка	300 000 000 белорусских рублей
Наличие обременений	Аренда, залог

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе; заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона; заверенные копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка; а также иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012037450010, в филиале ОАО «БПС-Банк» по г. Минску, код 153001334, УНП 190398583.

Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену за продаваемое имущество. Процедура проведения торгов установлена порядком проведения аукциона.

Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, осуществляется участником, выигравшим торги.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) подписывается в течение 10 рабочих дней с даты проведения аукциона.

Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется в течение срока, указанного в договоре купли-продажи. По согласованию с продавцом возможна рассрочка платежа.

Аукцион состоится **18 марта 2011 года в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются **с 16.02.2011 по 16.03.2011 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 18.00 (в пятницу – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефоны для справок: (017) 227 48 36, (017) 291 93 29.

Сайт в интернете: www.mgcn.by.

25 марта 2011 года состоится общее собрание акционеров
ОАО «ЛУКОМЛЬЭНЕРГОМОНТАЖ»,
расположенного по адресу: г. Новолукомль, Лукомльское шоссе, 8.

Собрание пройдет по адресу:
г. Новолукомль, Лукомльское шоссе, 8, актовый зал.

ПОВЕСТКА ДНЯ СОБРАНИЯ:

1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества в 2010 году и основных направлениях деятельности Общества на 2011 год.
2. О работе Наблюдательного совета в 2010 году.
3. О результатах аудиторской проверки и проверки Ревизионной комиссией финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2010 год.
4. Утверждение годового отчета и баланса Общества.
5. Утверждение порядка распределения прибыли, остающейся в распоряжении предприятия (покрытия убытков) за 2010 год.
6. Утверждение плана распределения прибыли, остающейся в распоряжении предприятия на 2011 г. и первый квартал 2012 г.
7. О принятии решения о приобретении ОАО «ЛЭМ» его акций, отчуждаемых акционерами, в период по 31 декабря 2011 г., определении цены приобретения акций, отнесении к компетенции Наблюдательного совета права определения цены приобретения указанных акций.
8. Избрание членов Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии.
9. О вознаграждении членов Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии.

Время и место ознакомления акционеров с материалами по вопросам повестки дня собрания: в рабочие дни (понедельник—пятница), начиная с 14 марта 2011 г., по месту нахождения Общества (приемная) с 13.00 до 16.00.

Время регистрации участников собрания: в день проведения собрания с 8.00 до 9.45.

Время начала проведения собрания 10 часов 00 минут.

Список акционеров для участия в собрании будет составлен по состоянию на 21 февраля 2011 г.

Для регистрации при себе иметь следующие документы:
- акционеру Общества — паспорт;
- представителю акционера — паспорт и доверенность.

УНП 300007839

Открытое акционерное общество «ЗАВОД ПО РЕМОНТУ И ТЕХНИЧЕСКОМУ ОБСЛУЖИВАНИЮ ВЫЧИСЛИТЕЛЬНОЙ ТЕХНИКИ»
(сокращенное наименование: ОАО «Белсчеттехника»)
**СООБЩА

Грамніцы ў Грамніцах

(Заканчэнне. Пачатак на 1 стар.)

Мой выезд у недалёкую ад Плешчаніц вёску пачаўся менавіта з музея, толькі школьнага. У ім захоўваюцца таксама і экспанаты з Грамніц — драўляная саха і драўляныя (!) жорны, падараныя жыхаркай гэтай вёскі Зояй Мамчык. Зоя Іванаўна — настаўніца геаграфіі мясцовай сярэдняй школы, адна са стваральніц гэтага музея (а яшчэ — і стараста вёскі). Напярэдадні праваслаўнага свята Стрэчання (па-народнаму Грамніц) Зоя Іванаўна ўзялася правесці мяне па сваіх Грамніцах. Першым нас сустрэў колішні вясковы крамнік (і як высветлілася потым, двойчы памерлы) Уладзімір Антонавіч Варановіч. Пасля вайны ён збудаваў на сваім падворку хату-краму і гандляваў ажно 26 гадоў, пакуль не пабудавалі новы магазін. Стары будынак захаваўся, і на яго сонечным баку Варановічы падсушваюць каўбасу.

— Майго бацьку забралі ў 37-м і невядома куды звезлі, — прыгадвае 84-гадовы грамнічанін. — Дзесяць чалавек па лжывых даносах патрапілі на Калыму ці яшчэ куды. Амаль ніхто не вярнуўся.

Але на вочы дзеда Уладзіміра набягаюць слёзы, калі прыгадвае, як з сястрою хаваліся на балоце ад немцаў. Маці з меншай сястрою ўгналі ў Нямеччыну на прымусовыя працы. Карову забралі партызаны. Як жыць? Нагараваўся. Таму пра свае «паміранні» прыгадвае нават з усмешкай.

— Першы раз я памёр перад самай вайной, калі захварэў на мінінгіт. Завезлі мяне ў лагойскую бальніцу, а там, вырашыўшы, што я ўжо «адышоў», завярнулі ў прасціну і занеслі ў морг. Каб не прыехала маці і не ўсчала лямант, то я б і дайшоў. Мама зразумела, што я жывы. А другі раз памёр — калі здарыўся інсульт. Нядаўна было. Але адышоў і, як бачыце, жыву.

Жыве і назва вёскі. А магло Грамніц і не быць. Да вайны вёску хацелі перайменаваць у Чапаеўку, але назва не прыжылася. Хоць відавочнай сувязі назвы населенага пункта і народнага свята Грамніцы не бачна, але гэта адчуваецца. У кожнай хаце на стале — грамнічная свечка.

— Запальваем свечку, калі молімся, ці калі раптам гром, маланка, — кажа жонка дзеда Уладзіміра Ядвіга Іосіфаўна. — І ведаеце, памагае.

Аднойчы ў Грамніцах здарыўся пажар, гарэла хата. А паколькі хаты стаяць блізка, была вялікая небяспека для ўсёй вёскі.

— Я схапіла абразок і аббегла з ім пажар, і агонь больш не распаўсюдзіўся, — расказала пра Боскія цуды яшчэ адна старэйшая жыхарка — Раіса Іосіфаўна Балцэвіч. І прыгадала, як некалі ў вёсцы згарэла канюшня з коньмі. Відаць, тады не паспелі ці забылі выйсці да агню з абразом.

Раіса Іосіфаўна Балцэвіч — смелая жанчына. У вайну яе ўганялі ў Германію — перад Польшчай уцякла з цягніка. Перад заканчэннем вайны ездзіла ва Усходнюю Прусію вяртаць статак кароў. Пасля вайны адбудоўвала разбомблены Мінск. Як надышла пенсія, вярнуліся з мужам у Грамніцы і яшчэ папрацавалі ў калгасе «Улада Саветаў». А яшчэ пазней перахрысцілася з праваслаўя ў каталічку, бо ў вёсцы амаль усе каталікі і ёй хацелася жыць адным рэлігійным жыццём. Цяпер адзначае дзень святога Антонія і Грамніцы са сваімі суседзямі — Анастасіяй Багдановіч, а таксама Ганнай і Іосіфам Заянкоўскімі.

Іосіф Заянкоўскі, хоць і даўно на пенсіі, але чалавек незаменны. Ён — каваль. Кузня ў яго — жывая! Суседзі ідуць з просьбамі — каму граблі падладзіць, каму чыгунок запаяць, рыдлёўку навастрыць. Рукі ў майстра баляць, а за молат усё роўна бярэцца. У калгасе адпрацаваў з 1947 года ажно да самай пенсіі.

Грамніцы некалі былі памежнай вёскай. Салдаты Чырвонай Арміі ўзвялі на ўзгорках вакол вёскі некалькі дотаў. Вяскоўцы таксама аказвалі ім дапамогу ў будаўніцтве. За гэта ім дазвалялася прыходзіць у ваенны гарадок на танцы і ў кіно. А маладыя афіцэры заляцаліся да грамніцкіх дзяўчат — у вёсцы быў свой клуб і свае гарманісты. Цяпер пра той далёкі час нагадваюць толькі рэшткі «кропак», узарваных немцамі і паліцаямі.

Маленькаму Івану Стасюлевічу і яго на год старэйшаму брату Валерыю прыйдзецца хадзіць у школу ў суседнюю вёску Корань, бо свая пачатковая даўно закрыта. Дзяцей у Грамніцах больш няма — таму, што моладзь не застаецца. Бо няма тут ніякіх сацыяльных аб'ектаў: ні клуба, ні крамы, ні лазні. Хоць вёска і зусім не далёкая ад цывілізацыі.

Анатоль КЛЯШЧУК.
Фота аўтара.

Лагойскі раён.

Трыбуна кіраўніка: 100 дзён

Надаць Горкам нясвіжскі глянец

На адной з цэнтральных вуліц Горак, райцэнтра ў Магілёўскай вобласці, установлены сонечны гадзіннік. Сонца цяпер няма, і гадзіннік практычна бяздзейнічае. Праўда, і ці патрэбны гэты зусім немудрагелісты прыбор, калі мець на ўвазе яго чыста функцыянальнае прызначэнне, у наш «прасветлены век»?

— Ну вядома ж, не, — пагаджаецца старшыня Горацкага райвыканкама Ігар Макар. — Але затое ён служыць гэткім добрым напамінкам пра скарацечнасць нашага часу. А гэтага часу неяк становіцца ўсё менш і менш, а зрабіць хочацца ўсё болей...

Ігар Макар стаў на чале Горацкага райвыканкама на пачатку леташняга кастрычніка. 100 дзён, праз якія традыцыйна падводзяцца першыя вынікі пасля прыняцця чалавекам адказнай пасады, як быццам прайшлі, і новаму кіраўніку Горацкага райвыканкама, падаецца, таксама можна было б зрабіць сваю першую справаздачу. Пры гэтым варта зазначыць: Ігар Макар з'яўляецца ўжо даўнім прыхільнікам і сябрам нашай газеты — яшчэ на той час, калі ўзначальваў на Нясвіжчыне гаспадарку «1 Мая», а потым — Нясвіжскі райвыканкам, адкуль і пайшоў на новае месца — у Горкі.

— Ды якія справаздачы? Рана, — адказаў Ігар Макар на наша пытанне і, як нам падалося, паглядзеў на нас не зусім весела. А потым прызнаўся — нялёгка.

Праўда, ужо праз колькі хвілін яго голас набыў звычайную бадзёрасць, і ён з захапленнем стаў расказваць:

— А вы ведаеце, якую мы тут купель наладзілі на 19 студзеня? Сам акунуўся тры разы — і насмарк, які быў, адразу прайшоў... Залілі ў горадзе пяць каткоў, наладзілі каляднуюлыжню — 20 каманд на яе выйшлі, у тым ліку «акадэмікі» з нашай знакамітай Горацкай сельгасакадэміі. А перад гэтым купілі канькі, лыжы — 50 мільёнаў рублёў з бюджэту выдзелілі на спартыўны інвентар. І, калі ласка, вось вам і паслугі... Жыццё віруе. А ўвогуле няма ў нас часу асабліва расслабляцца — напэўна ж, ведаеце: у наступным годзе ў нас, у Горках, намечана правесці свята рэспубліканскіх «Дажынак». Трэба ўжо цяпер рыхтавацца, і зрабіць усё, як належыць...

Як рыхтуюцца?

Перш чым адказаць на гэтае пытанне, удакладнім: у Горацкім раёне ў сельгасвытворчасці (а яна тут, зразумела, — асноўная) летась не выканалі даведзеныя прагнозныя паказчыкі. Праўда, гэтаму ў немалой ступені, так бы мовіць, паспрыяла надвор'е. Але ж надвор'е, як заўважыў кіраўнік раёна, амаль заўсёды непрадказальнае, і любыя яго капрызы трэба ўмець сустракаць годна... А адпаведныя планы і задачы, па сутнасці, — грандыёзныя. Тут і выхад на ўраджайнасць не менш чым па 60 цэнтнераў з гектара (летась было толькі 40), і надоі не менш, чым па 6500 кілаграмаў на карову (летась надаілі па 5705). Гэта і ўзвядзенне 9 новых сучасных МТФ у гаспадарках, і яшчэ адной, вучэбнай — для Горацкай сельгасакадэміі, студэнты якой будуць асвойваць не толькі тэорыю, але і назапашваць практычныя навыкі з улікам сучасных тэхналогій. Гэта і набыццё найноўшай тэхнікі, элітнага насення, а таксама стварэнне ў горадзе новых прадпрыемстваў, будаўніцтва новага жылля, узвядзенне Лядовага палаца, футбольнага поля са штучным пакрыццём і іншых знакавых аб'ектаў, рэканструкцыя чыгуначнага і аўтобуснага вакзалаў, гасцініцы, конна-спартыўнай школы... Галоўная мэта ўсяго намечанага, як выказваюцца ў Горацкім райвыканкаме, — надаць гораду і раёну нясвіжскі глянец.

— Ці па сіле ўсё гэта? І ці не раўнуюць да ўсіх гэтых спраў і планаў вас, як «прышэльца»?

— Можа, ёсць такія, хто і раўнуе. А наконт таго, ці па сіле... Планы і задачы — крайне напружаныя, але — рэальныя. Можа, хто і не захоча напружвацца пры гэтым, але ж варыянтаў у нас няма. І таго ж часу, па сутнасці, таксама няма.

Ну, вядома ж, не быў бы цяперашні кіраўнік Горацкага райвыканкама колішнім кіраўніком Нясвіжскага раёна, каб не «прывёз» з сабой у Горкі цукровыя буракі; пакуль што 1200—1300 гектараў мяркуюць заняць у Горацкім раёне пад іх («Хоць бальнасць зямлі і ніжэйшая тут, але ўраджаі павінны быць неблагія»). А каб у кіраўнікоў гаспадарак і іх галоўных аграномаў не заставалася ніякіх сумненняў наконт цукровых буракоў, звазіў усіх іх (у арганізаваным парадку) на Гарадзейскі цукровы камбінат, спецыялісты якога запэўнілі горацкі «дэсант» у выгаднасці гэтай цукровай справы, а таксама паабяцалі разнастайную дапамогу ў яе асваенні. Не быў бы цяперашні кіраўнік Горацкага раёна колішнім кіраўніком гаспадаркі «1 Мая» Нясвіжскага раёна, каб не «прывёз» з сабой так званыя «лунаходы» — надзвычай эфектыўныя і хуткія самаходныя агрэгаты, здольныя бегаць па самых пераўвільготненых глебах (што асабліва важна вясной, калі глеба амаль што плыве), а значыць, рабіць своечасовую падкормку азімых. А яшчэ горкаўскія працаўнікі пастаўлены перад задачай вырошчваць кукурузу не толькі на зялёную масу, але і на зерне (для забеспячэння кармавога балансу пры кармленні жывёлы), прычым трэба мець гэтага зерня не менш чым па 70 цэнтнераў з гектара («іначай нерэнтабельна»). А яшчэ новы старшыня райвыканкама завярнуў на праблемы Горацкага рэгіёна навуку — як з мясцовай сельгасакадэміі, так і з мінскага Навукова-практычнага цэнтра Акадэміі навук па земляробстве. Карацей кажучы, напружыў і навуку.

— Усё ў рэшце рэшт робіцца для людзей, — падкрэсліваў Ігар Макар падчас гутаркі. — Цяпер прадпрыемствы і арганізацыі раёна, яго гаспадаркі праходзяць у нас абарону сваіх планаў. І невыпадкова ў гэтых планах аднымі з галоўных пунктаў запісаны наступныя: павышэнне заработнай платы і прадукцыйнасці працы, стварэнне новых працоўных месцаў.

А на заключэнне гутаркі Ігар Макар з уласцівым для яго аптымізмам сказаў:

— Усё нармальна, усё ў нас атрымаецца.

Іван БАРАНОЎСКІ.

Свая справа

БІЗНЭС СКЛАЛІ З БЯРВЕННЯ

Увёсцы Машкова Горацкага раёна кампанія рамеснікаў «Офа» вырабляе прыгожыя і цікавыя драўляныя рэчы для сельскіх дамоў і лецішчаў. Майстры працуюць у глыбінцы, а кліентаў шукаюць па інтэрнэце.

На падворку вясковай хаты — нібыта выстава-продаж. Гаспадары хвалююцца за сваю рэпутацыю і папярэджваюць, што ўсе драўляныя вырабы — пакуль паўфабрыкаты, а гатовыя рэчы разабралі пакупнікі. Цяпер мужчыны робяць задзел на вясну, калі з адкрыццём цёплага сезона гаспадары пачнуць клапаціцца пра навядзенне парадку ў сваіх летніх дамах, тады ж ажывіе і рынак.

— Паглядзіце, якія арэлі! — з гордасцю паказвае Уладзімір Пташкоў. — Іх замаўляюць прыватнікі альбо арганізацыі. Дрэва глядзіцца эстэтычна. Лава на ланцугах — 1,5 метра. Можна сядзець і ляжаць. З дастаўкай і ўстаноўкай такія арэлі будуць каштаваць 1,4 мільёна рублёў.

Усе тры партнёры прыватнага рамеснага прадпрыемства — ураджэнцы Гораччыны. **Уладзіміру Пташкову** 43 гады, за плячыма — тры незавершаныя вышэйшыя адукацыі і самыя розныя прафесіі, у тым ліку камерсанта. Некалькі гадоў таму вырашыў рабіць нешта сваімі рукамі з дрэва — і нечакана ідэя спадабалася.

— Проста адчуў, што гэта сапраўды мая справа, — тлумачыць Уладзімір. — Я спрабаваў шмат чаго, але вырашыў, што вырабы з дрэва — гэта надзейны бізнэс, і ён заўсёды мяне пракорміць.

Аляксандр Лукуцін называе сябе рамеснікам. Ён гадаваўся ў вёсцы Машкова, і бацька ўсё жыццё працаваў у лесе з сякерай ды пілой.

— Відаць, нейкія гены засталіся, — усміхаецца Аляксандр. — Бацька сам хату пабудаваў, у якой цяпер месціцца наша невялікае прадпрыемства. А я раней працаваў вадзіцелем, пакуль не захацелася звярнуцца да дрэва. Мы ўсе — самавучкі, спачатку рабілі нешта для душы ды для сябе, а майстэрства прыйшло з вопытам. Мы сваю працу любім і робім прыгожыя, утульныя рэчы.

Аляксандр і Уладзімір разам зрабілі драўляныя санкі па замове з Санкт-Пецярбурга і зразумелі, што можна аб'яднаць высілкі. Да іх далучыўся яшчэ адзін вясковы ўмелец — **Уладзімір Ненартовіч**.

Вядома, сабрацца разам прымусіла неабходнасць: праца з вялікімі бярвёнамі не прадугледжвае эгаізму, тут патрэбны памочнікі, якія могуць падставіць і моцныя рукі, і партнёрскае плячо.

— Разам надзейней і весялей! — усміхаюцца мужчыны, якія ўтрох апрабуюць лаву на лапцях. — У нас тут увогуле дэмакратыя: мы ўсе начальнікі і ўсе рабочыя, і адзін аднаго добра разумеем. Хто хутчэй інструмент узяў, той і робіць. Спрэчкі ўзнікаюць толькі з-за таго, што хочам зрабіць для кліентаў як мага лепш. Вось такая ў нас агульная мова.

Такім чынам утварылася сумеснае прыватнае прадпрыемства «Офа». Ад англійскага слова «offer» — прапанова. Горацкія рамеснікі сёння прапануюць шырокі асартымент арыгінальных драўляных вырабаў: зрубы лазняў і хат, альтанкі, лавы, калодзежы, садовую мэблю, скульптуры з дрэва і шмат чаго іншага. Залежыць ад фантазіі кліентаў і майстэрства выканаўцаў.

— Як нараджаюцца ідэі? Напрыклад, у нашых Горках лазні топяць дровамі. І калі любы мяшчанін ідзе ў лазню і бачыць вялізную кучу дроў, то для яго гэта проста дровы. А мы ў іх бачым будучы выраб з дрэва. Вось так усё і адбываецца.

Калі ў лавы ёсць ножкі, то чаму не абуць іх у лапці, каб надаць пэўны нацыянальны каларыт? Ці не зрабіць іх лапамі жывёлы альбо казачнымі пнямі? Калі калодзеж — то няхай будзе магутны, з рознымі дэталямі. Стол з лавай нібыта проста складзены з бярвення. Мост з крывымі поручнямі ў старадаўнім стылі. Крэсла нібыта трон. А будка для сабакі падобная на замак з вежамі. Не верыце? Вёска Машкова месціцца ў глыбінцы, далёка ад галоўных аўтамабільных трас. Але горацкія майстры працуюць па-сучаснаму: усе іх вырабы можна паглядзець на сайце — www.remeslennik.com.

Менавіта праз сайт прыходзіць у Горацкі раён шмат замоў, у тым ліку і з замежжа — з Расіі, Казахстана.

— Тэлефанавалі з Омска і Мурманска. А аднойчы хацелі атрымаць нашы вырабы ў Барселоне! Мы ж вырашылі, што на практыцы гэта вельмі складана. А так мы рабілі вялікую працу для санаторыя «Беларусачка». Увогуле цяпер уся Беларусь у нас нешта замаўляе. Вось толькі ў Горках мы не вельмі папулярныя — можа, сапраўды няма прарока ў сваёй айчыне....

Цэны ў сельскім прадпрыемстве на свае вырабы імкнуцца не «заломваць» — працуюць на рэпутацыю. Напрыклад, абутая ў лапці лава абыдзецца кліенту ў 400-450 тысяч рублёў, стол з лавай у камплекце — 1,5-1,6 мільёна рублёў, калодзеж з разьбой па дрэве — 1,8-2 мільёны рублёў.

— У нашага бізнэсу вялікія перспектывы. Я спадзяюся, і на наш век хопіць, — гаворыць Пташкоў. — Калі я пачынаў працаваць, то, каб у Беларусі нехта набыў наш выраб — гэта быў нонсенс. Усе звычайна казалі, што самі такое могуць зрабіць. Цяпер іншая сітуацыя: і беларусам падабаецца наша прадукцыя. А Расія ўжо даўно адышла ад хіміі і рушыла да натуральных матэрыялаў. Пагадзіцеся, што больш прыемна сядзець за драўляным сталом, чым за пластмасавым.

— Дрэва — яно ж натуральнае, гэта ж вам не цагліна — дрэва цёплае, — спрабуе растлумачыць Уладзімір Ненартовіч.

— Дрэва, калі яно зроблена з душой, — па-сапраўднаму грэе, — сцвярджае Аляксандр Лукуцін. — Усім хочацца натуральнага. Мне падаецца, таму дрэва зноў увайшло ў моду.

«Офа» базіруецца ў звычайнай вясковай хаце. На сценах у галоўным пакоі — старыя фота, прыгожыя выявы былых гаспадароў Лукуціных у маладосці. Але ўся падлога завалена рознымі матэрыяламі, якія выкарыстоўваюць у сваёй працы майстры па дрэве. Праца з дрэвам, настойваюць партнёры па «Офа», — гэта зусім не хобі, а менавіта бізнэс. Таму што, па-першае, прыносіць рэальныя грошы, а па-другое, патрабуе зашмат высілкаў.

— Улетку даводзіцца працаваць па 16 гадзін на дзень. І калі думаеш, як дабрацца да ложка, і ўсё баліць, то гэта неяк не стасуецца з хобі. Хоць часам нараджаецца ідэя і ты яе ажыццяўляеш у вырабе, — і гэта ўжо захапленне.

Дарэчы, ніякай вычварнай мэблі няма ні ў «офісе» прадпрыемства, ні, паводле прызнання рамеснікаў, у іх гарадскіх кватэрах.

— Праўда, што шавец без ботаў, — смяецца Аляксандр. — Часу не хапае. Можа, пазней зробім і для сябе прыгожыя рэчы?..

— Аднойчы мы з сябрам рабілі мэблю па замове, і ён кажа, што, маўляў, мы тут гарбеем, а жонка другі год просіць прыкруціць дзверкі на кухні, а рукі не даходзяць, — узгадвае Уладзімір тыповую рамесніцкую гісторыю.

Тым не менш, і самі майстры па дрэве, і іх сем'і задаволеныя сёння даходамі. І хоць менавіта такі бізнэс, дзе трэба нешта самім рабіць рукамі, кампаньёны лічаць самым надзейным, але іх дзеці шукаюць сваё працоўнае шчасце ўжо ў іншых сферах і больш цікавяцца камп'ютарамі, чым сякерамі і бензапіламі. «Не толькі фізічная праца цяжкая, але і разумовая», — спачувае моладзі бацька Лукуцін.

— Мы сёння жывём і займаемся справай, ад якой адчуваем маральнае і матэрыяльнае задавальненне, — сказаў Уладзімір Пташкоў аб працы кампаніі «Офа». — Гэта добра, і мы ведаем штодня, што мы зрабілі і за што атрымаем грошы.

Ілона ІВАНОВА, фота аўтара.

Горацкі раён.

А не шкодзь!

Дарагі дзік

На тэрыторыі НП «Белавежская пушча» двое жыхароў в. Амяленец і в. Выстычы (Брэсцкі раён) селі на квадрацыкл і паехалі на паляванне. Як потым высветлілася — на незаконнае: каля в. Амяленец яны застрэлілі дзіка.

У браканьераў канфіскавалі квадрацыкл, паляўнічую стрэльбу, патроны, нажы і тушу дзіка. А яшчэ за нанесеную прыродзе шкоду браканьерам давядзецца заплаціць 5 млн рублёў.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

Унук уздзенскага караля Ліра

ПРЫ сустрэчы з аграномам Мікалаем Козічам, які добра вядомы сярод садаводаў і агароднікаў па шматлікіх публікацыях, даведаўся, што яму на 85-гадавіну пляменнік Аляксандр падарыў радаводную кніжку — сабраў па архівах. Генеалагічнае дрэва Козічаў удалося прасачыць да 1730 года, і ў ім ёсць звесткі пра 205 бліжэйшых продкаў. Бадай што самай каларытнай асобай у гэтым радаводзе з'яўляецца дзед Мікалая Козіча — Паўлюк Сымонаў. Менавіта так названы ён у дакументах.

Хто шануе хатку,
Будзе жыць у дастатку.
В. Шэкспір «Кароль Лір».

Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.

— Мой дзед меў больш за 27 гектараў зямлі, трымаў коней, жывёлу і жыў заможна. Сям'я ў дзеда была вялікая — 4 сыны і 4 дачкі. Адзін сын жыў у Польшчы, другі — у суседняй вёсцы, а Ілья, Канстанцін і дзед са сваімі сем'ямі — у адным доме і вялі агульную гаспадарку. Калі дзеду споўнілася 73 гады, ён вырашыў падзяліць гаспадарку паміж трыма сынамі, — расказаў Мікалай Канстанцінавіч.

А далей падзеі развіваліся па вядомай шэкспіраўскай п'есе. Кароль Лір яшчэ пры жыцці аддаў каралеўства дочкам і стаў... бадзягам. Павучальная гісторыя, але хто вучыцца на чужых памылках? Нешта падобнае здарылася і з Паўлюком Сымонавым.

Дзед зрабіў усё сумленна. Кожны сын атрымаў па 9 гектараў, кані, карове... Па тым часе гэта была вялікая маёмасць. Але ж у сыноў свае сем'і, і яны сталі незалежнымі ад бацькоў. І што старым заставалася — з торбай ісці па вёсках? Тады падаў дзед заяву ў суд 6-га ўчастка Мінскай акругі і прасіў, каб суд з кожнага сына на ўтрыманне бацькоў прысудзіў паёк з прадуктаў.

Сыны прызналі іск бацькоў правільным і згадзіліся выдаваць паёк, памер якога ўстановіць суд. І суд пастанавіў: кожны сын абавязаны штогод выдаваць бацькам па 12 пудоў жытнёвай мукі, 1 пуд — пшанічнай, 1 пуд сала, 2 пуды солі, гародніны — 2 пуды, а яшчэ раз у тры гады выдаваць па 8 рублёў на абутак і кожныя 5 гадоў шыць 2 кажухі....

Як бачым, дзеду Мікалая Козіча не прыйшлося жабраваць. Гэта адбылося пасля рэвалюцыі, але калектывізацыя была ўжо не за гарамі.

Сёння мы не можам знайсці фермераў, а хіба бацька, як і дзядзькі Мікалая Козіча, не былі тымі гаспадарамі, якія выгадавалі б цэлае пакаленне фермераў? Менавіта ў тыя гады пад сельскую гаспадарку закладвалася міна замаруджанага дзеяння.

Каса калектывізацыі закранула найперш гаспадароў, але бацька Мікалая Канстанцінавіча здолеў утрымацца — пайшоў працаваць галоўным бухгалтарам у калгас імя Сталіна.

— Бацька вайну не перажыў — загінуў ва Усходняй Прусіі. Яму было 47 гадоў. У 1944 мабілізавалі і мяне. З Уздзенскага раёна на фронт пайшло 76 хлопцаў, а вярнуліся толькі трое. Мяне цяжка параніла, і я дзевяць месяцаў праваляўся ў шпіталі, — працягваў размову Мікалай Козіч.

Пасля вайны Мікалай Канстанцінавіч 12 гадоў узначальваў калгас, затым 25 гадоў адпрацаваў галоўным інжынерам калгаса і ўпраўлення сельскай гаспадаркі Уздзенскага раёна. А калі пераехаў у Баранавічы, то 15 гадоў займаўся азеляненнем і цяплічнай гаспадаркай завода аўтаматычных ліній і толькі ў 72 гады пайшоў на пенсію. Увесь вольны час ён зараз аддае дачы.

— Адзін стары чалавек сказаў мне, што калі яблыню пасадзіш у шэсцьдзясят, то яблыкаў не пакаштуеш. Што вы думаеце? — спытаў я.

— Я сад пасадзіў на восьмым дзясятку і пакаштаваў даўно ўжо. Адным словам, калі пасадзіш, то ёсць што чакаць, а не пасадзіш, то....

— Мікалай Канстанцінавіч, вы ў сельскай гаспадарцы адпрацавалі 55 гадоў і ў вас ужо ёсць, напэўна, самыя любімыя гатункі яблыкаў і груш. Што параілі б нашым чытачам?

— Гэта толькі мая думка. Летам хапае розных ягад і зеляніны, і таму да летніх гатункаў я стаўлюся спакойна — аддаю перавагу зімовым. Добра, калі ў садзе ёсць яблыні гатункаў «Імант» і «Беларускі салодкі». Яны ўстойлівыя да паршы і іншых хвароб. А яшчэ і добра захоўваюцца. З груш параіў бы «Проста Марыя», «Скарб» — гэта познаасенніе, а з зімовых — «Беларускую познюю» і «Бэру Люка».

— А як вы ставіцеся да старадаўніх гатункаў, напрыклад, такіх як Антонаўка, Малінаўка, Каштэля?

— Сярод іх ёсць выдатныя гатункі. Вось «Антонаўка» — найлепшыя яблыкі для замочкі, хоць у яе ёсць і недахоп — паражаецца паршою. «Малінаўка» — добры гатунак, «Каштэля» і «Штрыфель» — таксама. Але калі дрэвы высакарослыя, то з імі клопату хапае. Цяжка апрацоўваць прэпаратамі, здымаць ураджай.

— Сёння мода на нізкарослы сад. А ці можна крону нейкім чынам рэгуляваць, каб яе не гнала ўгару?

— Адназначна, справа тэхнікі. Неабходна абразаць галіны, не дапускаць росту празмерна.

— Некалькі слоў наконт бульбы і памідораў. Якія гатункі на вашых сотках?

— Саджаем бульбу «Талісман», «Журавінка», «Здабытак», «Выток», апошні позні. На пасадку адбіраем бульбу з лепшых кустоў. Любім, каб бульба была разварыстая. А з таматаў аддаём перавагу гатункам «Гамаюн», «Лежабок», «Герман F1». Дадам, што неабходна праводзіць прафілактычную апрацоўку раслін, а не чакаць, пакуль «выпадзе туман». Што датычыцца галандскіх гатункаў, то яны прыгожыя, але не вельмі смачныя.

— Каб атрымаць высокі ўраджай, што вы параілі б?

— Напрыклад, я штогод атрымліваю з адной соткі па 600 кг бульбы. Высокія ўраджаі даюць і іншыя культуры. І нашым дачнікам ужо час атрымліваць такія ўраджаі. Толькі бяда ў тым, што часта людзі працягваюць працаваць па-даўнейшаму, і з году ў год паўтараюць адны і тыя ж памылкі. Велічыня і якасць ураджаю, найперш залежыць ад падкормкі раслін і дагляду.

На сваёй дачы Мікалай Козіч гаспадарыць не адзін, а разам з жонкай. Аляксандра Антонаўна ўсё жыццё працавала з грашыма — у фінансавай сферы, а тут не адстае ад мужа.

— Я выдзеліў ёй сто квадратных метраў зямлі, дык яна яе пад кветкі пусціла — ружы, гладыёлусы, лілеі...., але растаропша на першым месцы, — удакладніў гаспадар.

— Чаму?

— Таму што лекавая расліна, — растлумачыла Аляксандра Антонаўна. *— Насенне пачань можна лячыць. Хоць каб яго дастаць, трэба найперш з калючкамі разабрацца. А яшчэ ў нас расце плакун-трава, дуброўка... многа розных зёлак.*

— У вас на дачы, напэўна, усё з размахам?

— На размах патрэбны грошы, а мы жывём па сродках. І ўвогуле, сям'я, горад, дзяржава — павінны жыць па сродках. Аднойчы ў мяне прыхапіла сэрца, трапіў у бальніцу, а там месца няма. Паклалі на калідоры, але ж няёмка франтавіка так трымаць — знайшлі месца ў палаце. Я напісаў скаргу мясцоваму кіраўніцтву. Маўляў, палацы ўзводзіце, а ў бальніцы месцаў няма. Забегалі, давайце прыйдзем да згоды, паразумення. Я не стаў спрачацца і паставіў подпіс.

— Былі радасныя хвіліны ў жыцці?

— Працаваць на зямлі заўсёды было цяжка. У агранома ненармаваны рабочы дзень. Неяк узяў пуцёўку, а тут кажуць, што трэба лён падняць. Ды і сёння працую, няхай і не так, як некалі, але толькі зімой 3 — 4 месяцы адпачываю. А снег сыдзе, то на дачу — бліжэй да зямлі. Вось датычыцца радасных хвілін, то ў жыцці яны былі. Вось уручалі ордэн Леніна — аднаму на ўвесь раён — радасць была, ды не толькі гэты выпадак. У жыцці ўсяго хапае. Увогуле жыццё неабходна любіць такім, якім яно ёсць.

Дзеці Мікалая Козіча не пайшлі па слядах бацькі, а выбралі іншыя прафесіі, і толькі сын Уладзімір да зямлі неабыякавы, шчыруе на сваёй дачы. Ды гэта і не прынцыпова — у кожнага свой шлях. Галоўнае, што падрастаюць праўнукі, а гэта значыць, што радавод Мікалая Козіча працягваецца і ён у ім — моцнае звяно.

Сымон СВІСТУНОВІЧ, фота аўтара.

НЕ СКАРЫЛІ «ДУХІ» І МАЛЯРЫЯ...

«Усё ў мяне, мама, добра: тут горача, загараю, ем персікі і кавуны. Не перажывай — хутка вярнуся. Усім прывітанне. Твой сын Гена.
Асадабад, Афганістан. 10 ліпеня 1985 года».

Дэсантнік Генадзь Гарадзецкі акуратна заклеіў канверт і паклаў яго ў спецыяльную паштовую скрынку — такой нідзе, акрамя іх лагера, няма. Вісіць яна на невысокім дрэўцы, якое ўкапана ў зямлю. Кожны дзень салдаты туды кідаюць пісьмы. Раз у тыдзень іх дастаюць і адпраўляюць адрасатам...

Сёння ноччу Гена са сваёй трэцяй ротай пойдзе ў раён Мараварскай цясніны выбіваць «духаў». А пакуль, прыкінуў салдат, можна «пакімарыць». Так-так, іменна «пакімарыць»: падоўгу спаць, як бы моцна ні хацелася, не атрымаецца — вайна...

Салдат заплюшчыў вочы. Сонзараза, нібыта спецыяльна, не браў. У галаве адна за адной усплывалі знаёмыя карцінкі: вось яго родная вёска Славічы, што раскінулася на абсягах Мядзельшчыны, — прыгожая і з добрымі людзьмі. Вось мама гладзіць яго па галоўцы, тата вострыць касу... Школа васьмігодка і любімы настаўнік гісторыі — які гэты чалавек разумны, шмат ведае... Таварышы па Ільянскім тэхнікуме, з якімі Гена вучыўся на фельчара. Ваўкавыскі раён — там Гарадзецкі працаваў па размеркаванні. Вучэбка ў Барысаве, дзе яму прысвоілі званне «сяржант». Прапаршчык, у якога Гена выпрасіў «пуцёўку» ў Афганістан, хоць паехаць туды павінен быў іншы сяржант. Але яму, Генадзю, вельмі хацелася трапіць на сапраўдную вайну. Можа, таму, што з дзяцінства зачытваўся ваеннымі кніжкамі і дасканала ведаў усіх палкаводцаў, гісторыю Вялікай Айчыннай. А можа, таму, што яму, 18-гадоваму юнаку, хацелася сябе праверыць на стойкасць? Ці проста лёс такі, хто ведае?

Вось Гена ў 5-й брыгадзе спецназа Мар'інай Горкі вучыцца страляць і вывучае ваенную тэорыю. Камандзіры робяць ухіл на «рукапашку» і «фізуху». Далей — Узбекістан. Дэсантнік прывыкае да спякотнага паўднёвага клімату, вучыцца ваяваць у гарах. Затым — Таджыкістан. Адтуль на цягніку салдаты дабіраюцца да мяжы з Афганістанам. Потым на БТР-ах і БМП едуць на канчатковую і пастаянную кропку дыслакацыі — горад Асадабад. Бацькі Гарадзецкага яшчэ не ведаюць, што сын служыць у Афгане. Аб гэтым ён напіша сам з вайны...

Вось дэсантнікі разбіваюць палатачны гарадок. Выдалі аўтаматы. Колькі з гэтых хлопцаў будзе забіта, невядома... Генадзя прызначаюць санітарным інструктарам роты. Першыя баявыя паходы. Перастрэлкі. Зацяжныя баі... «Духі» ў гарах — як рыбы ў вадзе. Папрабуй выбіць іх з укрыццяў! Нямала галаўной болі дастаўляюць і «чорныя буслы» — наёмнікі... Гінуць нашы салдаты. Больш, вядома ж, ад варожай кулі. Але нямала і тых, што, трапіўшы ў палон, узрывае сябе сам...

Усё. Хопіць! «Пакімарыць» не атрымаецца. Трэба пакурыць — ноччу нельга, агеньчык могуць «засекчы» «духі»...

...Пасля каманды «Стройся!» дэсантнікі калонай выйшлі на Мараварскую цясніну. Гэты бой, які доўжыўся амаль тыдзень, быў вельмі цяжкі. Паляглі ці не ўсе салдаты першай роты разам са сваім камандзірам Мікалаем Кузняцовым, якому пасмяротна было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. Усяго — 86 чалавек.

Колькі пасля Маравар у Гарадзецкага было баявых рэйдаў, ён і сам не можа палічыць. Не раз ён быў паранены. Але медык жа, таму ў шпіталь па дапамогу не звяртаўся — усе неабходныя рабіў сам.

Усё ж такі аднойчы спатрэбілася дапамога калег. І вінаватая ў гэтым не куля душмана. А малярыйны камар... Было гэта незадоўга перад «дзембелем». Ляжаў Гарадзецкі ў рэанімацыі тры дні. Урачы выхадзілі. Месяц у стацыянары. Далечваўся ўжо дома.

З Афганістана дэсантніка сустракалі ўсёй вёскай. Так супала, што дамоў ён вярнуўся 1 мая — таму ў Славічах было двайное свята. Нехта пацікавіўся ў салдата, за што яму далі медаль «За адвагу»:

— За тое, што выратаваў ад смерці афганскага афіцэра. Мне ўжо потым сказалі, што гэта быў афганскі разведчык. Быў ён у нас правадніком. «Касіў» пад мірнага жыхара. Неяк ішлі на заданне. Неўзабаве нашу калону пачалі абстрэльваць. Усе паляглі на зямлю. Мне перадалі, што наш праваднік паранены. Я падпоўз, узяў яго і аўтамат і выцягнуў з-пад куль. На разборы аперацыі камандзір уручыў мне медаль.

Пыталіся аднавяскоўцы ў Гарадзецкага, ці добра іх прымалі мясцовыя.

— Як там добра... Каля нашага лагера быў дзіцячы дом. Туды мы аддавалі цукар, муку, крупу — што самі елі, тым і дзяліліся...

Пасля «дзембелю» Гена пайшоў працаваць па спецыяльнасці. Справіў вяселле. Праз чатыры гады займеў двух сыноў. З жонкай не склалася, разышліся. Чатыры гады пражыў у Казахстане. Працаваў у школе настаўнікам фізкультуры і ваеннай падрыхтоўкі. Пасля развалу Саюза вярнуўся дадому. Ізноў ажаніўся. Нарадзіўся трэці сын... Сёння хлопчыку 11 гадоў. Добра вучыцца. Як некалі тата, цікавіцца ўсім ваенным. Хоча паступаць у сувораўскае вучылішча. Паспявае па ўсіх прадметах, шмат чытае, задае бацькам разумныя і дарослыя пытанні.

Гена працуе на ферме ў вёсцы Брусы адначасова падменным даярам, раздатчыкам корму, фельчарам. Спіць па 5 гадзін — больш не ўдаецца, шмат работы. Кажа, што сну яму хапае, у арміі навучылі... Дома трымае гаспадарку. Адзін, упэўнены, не справіўся б — ва ўсім дапамагае жонка.

Кожны год, 15 лютага, ездзіць у Мар'іну Горку на сустрэчу з баявымі таварышамі. Але сёлета не паедзе: Дзень памяці воінаў-інтэрнацыяналістаў сустрэне ў шпіталі...

Аляксандр СЯНЮЦЬ.
Фота аўтара.

Крымінал

Юнацкія гульні?

Крымінальная справа заведзена супраць двух 17-гадовых навучэнцаў гомельскіх ПТВ, якія былі затрыманы 10 снежня мінулага года ў цэнтры Гомеля з прадметамі і рэчывамі, якія аказаліся часткамі для самаробнай выбуховай прылады.

Дома ў падлеткаў былі таксама знойдзены і канфіскаваны нейкія прамысловыя і медыцынскія кампаненты, упакаваныя ў трубку. Згодна з праведзенай экспертызай, яны з'яўляюцца самаробнай выбуховай прыладай, аналагічнай дыстанцыйнай асколачнай гранаце імгненнага дзеяння, прызначанай для паражэння мэты, паведамілі ў прэс-службе УУС Гомельскага аблвыканкама. Да таго ж, і ў персанальных камп'ютарах юнакоў захоўвалася інфармацыя аб тым, як выраблять выбуховыя прылады.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

Шыбы... у даважку

У гэтую ноч у хаце пенсіянера в. Крышын (Іванаўскі раён) гуляў вецер. Невядомы выбіў у вокнах 13 шыб.

Высветлілася, што тыя шыбы біў 38-гадовы мясцовы жыхар, які быў ужо судзімы за пагрозу забойства, крадзеж, хуліганства... Яго зноў арыштавалі, але не за выбітыя вокны, а за здзейснае раней злачынства. Шыбы пойдуць «даважкай» на судзе.

Не працаваў, а зарабіў

Прараб з Пінска вырашыў разбагацець і пачаў складаць фіктыўныя табелі ўліку працоўнага часу. За паўтара года прараб здолеў такім чынам украсці больш за 36 млн рублёў.

На маёмасць махінатара накладзены арышт. Праўда, яна пацягнула ўсяго на 7 мільёнаў.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

ДЫЯЛОГАВАЕ АКНО ДЛЯ ІНВЕСТАРА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Ці дапамагае фонд новым уласнікам дамаўляцца з мясцовымі ўладамі?

— Для таго, каб механізм Указа № 108 запрацаваў у поўным аб'ёме, мы актыўна супрацоўнічаем з мясцовымі райвыканкамамі, на тэрыторыі якіх знаходзяцца гэтыя аб'екты. Наша задача — у звязцы з мясцовымі ўладамі максімальна паменшыць падатковы цяжар для юрасоб і прадпрымальнікаў, якія бяруць на свой баланс такую нерухомасць. Мы заўсёды спрабуем дапамагчы інвестару, бо... Як правіла, за не зусім «прыгожую» нерухомасць новаму гаспадару трэба адразу плаціць вялікія грошы па стаўках зямельнага падатку і падатку на нерухомасць. Заканадаўствам сёння дазваляецца памяншаць такія адлічэнні. Калі патэнцыйны інвестар прапануе раёну перспектыўны бізнэс-план з далейшым развіццём вытворчасці, то мясцовыя ўлады маюць права знізіць такія маёмасныя падаткі да мінімуму. Дзякуючы такой ініцыятыве ў сталічным рэгіёне шмат сярэдніх аб'ектаў і было набыта інвестарамі.

— Як вамі вырашаюцца канфліктныя сітуацыі?

— Трэба арганізаваць сваю дзейнасць так, каб не было падставы для ўзнікнення канфліктаў. Мы ўвялі дыялогавае акно яшчэ і з такой мэтай, каб, такім чынам, чыноўнікі ў раёнах і спецыялісты фонду не расслабляліся, а былі заўсёды ў «тонусе». Справа ў тым, што ў дыялогавым акне магчыма пакідаць свае заўвагі і прапановы ў так званым ананімным рэжыме, не называючы сваіх рэквізітаў. Як толькі на сайце нам абазначаюць нейкую праблему, то мы ў фондзе адразу пачынаем яе дасканала вывучаць. Калі высветліцца, што агучанае пытанне сапраўды існуе, то мы яго станоўча вырашаем. Бываюць нараканні і на дзейнасць фонду. У гэтым выпадку я спрабую высветліць, у якім напрамку мае падначаленыя нешта недапрацоўваюць, і адразу выпраўляю памылкі ці недахопы па ўсіх спрэчных пытаннях.

Заробкі на рэфармаваных прадпрыемствах вобласці павялічваюцца часам у разы.

Перад тым, як увесці такую сістэму дзелавога дыялогу, мы неаднаразова інфармавалі пра такое новаўвядзенне ўсе службы райвыканкамаў і ўсіх патэнцыйных інвестараў праз газеты, радыё, тэлебачанне і на спецыялізаваных форумах. Таму сёння такі механізм сур'ёзнага дыялогу паміж усімі зацікаўленымі бакамі дазволіў зняць магчымыя супярэчнасці.

Напрыклад, так здарылася, што інвестару нейкае пытанне блакіруюць на мясцовым узроўні. Што рабіць? Калі звяртацца непасрэдна са скаргай і абазначыцца, то ёсць апасенні, што ў інвестара могуць узнікнуць у будучым не зусім цёплыя адносіны з чыноўнікамі раёна, якія гэтую праблему «не заўважылі». Аднак нават самыя дробныя непаразуменні нельга замоўчваць. Наша дыялогавае акно ў фондзе дазваляе даволі аператыўна вырашаць усе спрэчныя пытанні з інвестарамі без нейкай залішняй эмацыйнай напругі. У выніку інвестары задаволеныя, а структуры раёна і фонд працуюць без скаргаў.

— Механізм перадачы маёмасці інвестарам яшчэ даволі складаны?

— Не. Сёння аб'екты пад канкрэтныя інвестпраекты набываюцца даволі актыўна. Абласная камісія, куды ўваходзяць спецыялісты дзяржкантролю, пракуратуры і судоў, працуе ў адзіным рэжыме. Супярэчнасцяў паміж гэтымі структурамі не ўзнікае. Усе разумеюць галоўную задачу для развіцця эканомікі рэгіёнаў і паспяхова яе выконваюць. Механізм перадачы аб'ектаў інвестару добра вядомы і працуе як гадзіннік. Мы паказваем аб'ект, ведаем патэнцыйнага інвестара, які агучвае аб'ём будучых інвестыцый. Інвестпраект праходзіць узгадненне ў камітэце эканомікі. Калі гэта цікава для раёна, то адбываецца станоўчае галасаванне, прымаецца рашэнне і людзі пачынаюць наладжваць вытворчасць.

Першы пакупнік маёмасці ў 2010 годзе атрымаў спецыяльнае пасведчанне.

— Ваш фонд прадае не толькі асобныя аб'екты нерухомасці, але і дапамагае слабым прадпрыемствам у пошуку стратэгічнага інвестара?

— У вобласці рэалізаваны 4 прадпрыемствы з выкарыстаннем механізма па Указе № 113. Тут маюцца на ўвазе даволі стратныя прадпрыемствы, якія прадаюцца інвестару разам з даўгамі. У гэтым выпадку новы гаспадар павінен «падняць» такое прадпрыемства і даць яму новае жыццё. Для такіх інвестараў Указам прадугледжаны шэраг ільгот. Першай нашай ластаўкай у гэтым напрамку ў 2009 годзе стала Уздзенская швейная фабрыка. Механізм перадачы такога прадпрыемства сур'ёзнаму інвестару ў той час яшчэ не быў дасканала вывераны. Дзякуючы нашаму ўзаемадзянню з Дзяржмаёмасцю, фондам і райвыканкамам мы гэтую схему перадачы наладзілі. Аб'ект пачаў працаваць. У фабрыку былі ўкладзены сур'ёзныя інвестыцыі, закуплена новае абсталяванне, пачалося развіццё сучаснай швейнай вытворчасці. На фабрыку пачалі вяртацца работнікі...

Любы інвестар можа не толькі набыць прысталічную нерухомасць, але і пакінуць на сайце фонду свае слушныя заўвагі і прапановы для чыноўнікаў.

— Летась у фонда сур'ёзных інвестараў стала яшчэ больш?

— Так. У 2010 годзе па ўжо вядомай сцяжынцы намі былі прададзены ажно тры зусім слабыя прадпрыемствы. У Капылі новае жыццё атрымаў завод жалезабетонных вырабаў, дзе зараз створана сумесная беларуска-італьянская прадпрыемства. Там аднаўляецца вытворчасць жалезабетонных канструкцый для будаўніцтва фермаў на тэрыторыі рэгіёна і нават за мяжой вобласці. Другое прадпрыемства ў Капылі прададзена новаму ўласніку, які ўкладвае сур'ёзныя інвестыцыі ў дрэваапрацоўку па лініі збірання аконных рам. У Стаўбцоўскім раёне было прададзена УП «Заяўнаўскае», дзе плануецца развіваць сельгасвытворчасць, у прыватнасці займацца вырошчваннем часнаку.

— Фонд ажыццяўляў і продаж маёмасных комплексаў?

— Так. Схему рэалізацыі маёмаснага комплексу мы ажыццявілі летась і ў Старадарожскім раёне, дзе швейную фабрыку набыў ужо вядомы нам «Марк-Фармэль», які да гэтага купіў Уздзенскае швейнае прадпрыемства. Шчыра заўважу, што мне было прыемна назіраць, як на прадпрыемства, якое аднаўляецца, вяртаюцца яго былыя працаўнікі. Тварыў ў людзей былі шчаслівымі, бо заробкі ў работнікаў павялічыліся ў разы.

— Ці шмат у вобласці нявыкарыстанай нерухомай маёмасці?

— Сёлета мы гэты паказчык удакладняем. На стане на 2010 год у Мінскай вобласці было 389 такіх аб'ектаў. Пэўная колькасць іх у мінулыя гады была ў стане кансервацыі. Сёлета мы і гэтыя аб'екты паставім у графік і пачнём напружана працаваць па іх рэалізацыі.

— Цяпер у краіне працягваецца акцыянаванне прадпрыемстваў?

— Летась мы правялі акцыянаванне 29 прадпрыемстваў розных форм уласнасці. Цяпер мы шукаем інвестараў, якім будзем прапаноўваць купіць пэўныя пакеты акцый гэтых таварыстваў, аднак існуе адно але... Сёння таварыствы прапануюць на продаж маленькія пакеты акцый у памеры ад 5 да 10 працэнтаў, а на такую «дробязь» сур'ёзнага пакупніка адшукаць складана. Акрамя гэтага, мы ўбачылі, што кошт адной акцыі ў таварыствах бывае даволі вялікі. Летась кошт іх быў нязменны. Сёлета пры продажы акцый інвестару кошт іх ужо магчыма зніжаць на 20 і нават да 50 працэнтаў.

Таму цяпер фонд збіраецца ажыццяўляць больш агрэсіўную палітыку па продажы акцый акцыянерных таварыстваў. Мы спадзяёмся прадаваць больш буйныя пакеты акцый, каб сапраўды зацікавіць сур'ёзных інвестараў. Сярод апошніх сёння існуе пэўная зацікаўленасць набываць пакеты акцый будаўнічых арганізацый. Мы збіраемся наладзіць аўкцыёны па продажы такіх акцый ужо ў другой палове лютага.

Сяргей КУРКАЧ.

НЮАНСЫ «ПРЫВАТНЫХ ПЕРАВОЗАК», або Спачатку камфорт, а потым грошы, ці наадварот?

Ёсць праблема

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЖЫХАРЫ гарпасёлка Смілавічы яшчэ з мінулай восені прасілі ўзняць на старонках газеты пытанне адносна пагаршэння якасці працы маршрутных таксі. І самі мікрааўтобусы былі далёка не новымі, і расклад руху не заўсёды захоўваўся, і білеты часам вадзіцелі не выдавалі, ды і паводзіны некарэктныя сабе дазвалялі ў дачыненні да пасажыраў. Аднак заняцца гэтымі скаргамі не выпадала, паколькі не хапала канкрэтнай інфармацыі: нумароў мікрааўтобусаў, часу адпраўлення, прозвішчаў вадзіцеляў. Натуральна, калі чалавек патрапіў у непрыемную для сябе сітуацыю, але спяшаецца, ён не заўсёды мае магчымасць занатаваць патрэбныя звесткі. Або папросту не хоча ўвязвацца ў «высвятленне адносін» асабіста. Аднак так ужо выпала, што журналіст «Звязды» сам раз-пораз карыстаецца паслугамі маршрутак. І толькі з пачатку года ў яго назапасілася вось такая інфармацыя...

Ледзь не выпаў на хаду на шашу

Пачнём хоць бы з таго, што ў адзін з першых дзён студзеня аўтар гэтых радкоў ледзь... не выпаў падчас руху з маршруткі Смілавічы — Мінск на дарогу. Пад колы транспарту, які ішоў следам. Як было? Ехаў з жонкай у паўпустым мікрааўтобусе на задніх бакавых сядзеннях. Перад самым Мінскам выпадкова кінуў позірк (добра, што не задрамаў, прытуліўшыся да акна ці тых жа дзвярэй, як робяць звычайна многія пасажыры) на задняя дзверы і ледзь не аслупянеў: яны трымаліся на звычайнай металічнай клямцы і тая амаль што ўжо звалілася. Яшчэ б крыху часу або які неасцярожны рух — і паляцеў бы на хуткасці на шашу. Зачыніў асцярожна клямку, а калі даехалі да станцыі метро ў горадзе, на выхадзе папярэдзіў вадзіцеля. (Дарэчы, ці не на гэтай жа маршрутцы ехаў летам у моцную навальніцу? Сказаць, што салон літаральна залівала з усіх бакоў — не сказаць нічога. І клямка знаёмая была на прыадчыненых дзвярах, толькі зверху дадаткова перавязаная кавалкам рэменя бяспекі.).

Ужо ў пачатку лютага ўвечары на рэйсе Мінск — Смілавічы ў мікрааўтобусе сабраліся тры пасажыры. А вадзіцель і кажа: «Паколькі вас мала, нікуды не паеду. Што мне, назад пустым вяртацца?». Вярнуў грошы, высадзіў людзей, якія мусілі чакаць наступнай маршрутцы. Праз дзень на тым жа маршруце, але ў канцы працоўнага дня на пероне аўтастанцыі «Аўтазаводская» па традыцыі пачаў збірацца натоўп, паколькі адпраўленне маршрутак не супадала з раскладам, які быў і ў пасажыраў, і ў салонах мікрааўтобусаў. Калі нарэшце пасажыры паселі ў прыбыўшую машыну, натуральна, пачалі абурацца, пытацца ў вадзіцеля: дзе, маўляў, папярэдняя маршрутка, што пазначана ў раскладзе? А той, апроч іншага, і адказвае: «Будзеце сварыцца — усіх высаджу, а сам пайду з транспартнай інспекцыяй пытанні вырашаць».

Адна з пасажырак, якая рэгулярна ездзіць па гэтым маршруце, пачала ўсіх супакойваць. Маўляў, супакойцеся, можна ж і пацярпець. Абы не было бяды. І расказала нядаўнюю гісторыю, у якой толькі цудам ніхто не пацярпеў. Ехала маршрутка — «Газель», а ў яе падчас руху ў прамым сэнсе слоў... сарвала дах. І кінула на сустрэчную паласу. Калі крыху ачомаліся, мужчыны-пасажыры дапамаглі перапужанаму вадзіцелю падняць той дах, неяк прыладзіць назад...

Згаданыя маршруткі належаць ТАА, якое месціцца ў вёсцы Баравая пад Мінскам. Тэлефаную туды, выкладаю гэтую і іншую інфармацыю, уключаючы нумары мікрааўтобусаў, час адпраўлення, расказваю пра паводзіны вадзіцеляў і г.д. Зносіны і высвятленне акалічнасцяў з прадстаўніцай прадпрыемства доўжацца два дні. Не мае сэнсу пераказваць іх падрабязна (натуральна, у кожнага боку свая праўда, ды і адказная работніца асабліва не ўтойвае, што абараняе сваё прадпрыемства), але на галоўным варта спыніцца. Наўмысна апускаю для чытачоў спрэчкі пра паводзіны вадзіцеляў. Пагадзіцеся, калі пытанне стаіць пра бяспеку здароўя і жыцця пасажыраў (а менавіта яно мне бачыцца тут галоўным), усё іншае — хоць і таксама даволі важнае, але другаснае. Такім чынам...

«Такім ветрам дахі нават у дамоў зносіць»

Вадзіцель маршруткі паведамляў кіраўніцтву, што падчас руху расчыніліся дзверы. Пра той самы выпадак мы гаварылі або пра іншы — да канца высветліць не атрымліваецца. Вадзіцель той быццам бы звольніўся праз два тыдні працы. Прадстаўніца прадпрыемства пра здарэнне кажа, што гэта — ненармальна, так быць не павінна. Магчымая прычына — падчас уборкі салона хтосьці з работнікаў не пераканаўся, што дзверы надзейна зачыненыя. Яшчэ раз мусіў нагадаць, што задняя дзверы мікрааўтобуса зачыняліся на звычайную металічную клямку. У вёсцы на такую ж веснічкі могуць зачыняцца.

Дах у мікрааўтобуса сарвала? Быў такі выпадак. Але ж прыгадайце, — даводзіць мне суразмоўца, — які вецер тады быў? «Такім ветрам дахі ў дамоў зносіць, не тое што ў мікрааўтобуса». Падаецца, і гэтыя словы можна пакінуць без асаблівых каментарыяў...

Каб праверыць праўдзівасць слоў пра парушэнне раскладу руху, адказная работніца мусіла з'ездзіць на аўтастанцыю «Аўтазаводскую» — каб прагледзець запісы відэаназірання, што вядуцца за перонам, за пэўны прамежак часу канкрэтнага дня. Пасля гэтага сказала, што адпраўляліся маршруткі ў рэйсы дакладна па раскладзе. Толькі вось па якім? Той, што маюць на руках пасажыры і які размешчаны ў салонах аўтатранспартных сродкаў, не супадае з тым, што агучвае суразмоўца.

Дарэчы, у салонах маршрутак вісяць копіі ліцэнзіі на перавозкі пасажыраў, якая заканчваецца... 2009 годам. Нумар тэлефона, пазначаны для сувязі пасажыраў з кіраўніцтвам прадпрыемства-перавозчыка, ніводнага разу не адказаў — правяраў спецыяльна не адзін раз. «У нас скралі два-тры кіламетры кабелю. Ніяк не адновім нумар». І тут жа тое, што ў офісе ўстаноўлена міні-АТС. Дык няўжо ад рукі цяжка было выправіць у тым нумары адну апошнюю лічбу — «двойку» на «адзінку»? Гэта я на рэмарку суразмоўцы пра тое, што ніякіх скаргаў да іх дагэтуль на паступала і мой зварот прагучаў літаральна як гром сярод яснага неба. А як яны маглі паступіць?

Ці меў права вадзіцель высадзіць нешматлікіх пасажыраў і не паехаць у рэйс згодна з раскладам — каб зэканоміць паліва? Не меў, аднак мог звярнуцца да пасажыраў з просьбай, маўляў, калі можаце, ідзіце на наступную маршрутку, распаўляла далей прадстаўніца прадпрыемства.

Два названыя нумары маршрутак, што «засвяціліся» ў здарэннях, як вынікала далей, належаць машынам, што не вельмі часта з'яўляюцца на маршрутах, — толькі ў крайнім выпадку. Так, парк не надта новы, механікі ўвесь час яго рамантуюць. Новыя мікрааўтобусы набыць складана. Зарплаты ў работнікаў невялікія. Так, ёсць два вадзіцелі, на якіх ужо паступалі скаргі. Аднак хто працаваць будзе? Зноў жа — канкурэнты ў патыліцу дыхаюць...

Але ж ліцэнзія — не толькі заробак, але і абавязкі?

На другі дзень зносін пачуў, што расклад будзе перароблены, дублікаты ліцэнзіі адноўлены, новыя нумары тэлефонаў для сувязі пасажыраў з кіраўніцтвам прадпрыемства пазначаны, у тым ліку і сотавыя. Магчыма, будзе набыта і новая маршрутка. Для гэтага, праўда, хутчэй за ўсё давядзецца павялічваць кошт праезду — з 3,5 тысячы да 4,5 тысячы рублёў за паездку. Праўда, як адзін мікрааўтобус, верагоднасць куплі якога яшчэ не відавочная, можа паўплываць у цэлым на павышэнне бяспекі працы ўсяго прадпрыемства, для мяне засталося незразумелым. Суразмоўца, нагадаю, не адмаўляла, што машыны маюць дастаткова вялікі прабег, іх увесь час рамантуюць.

Сітуацыя, відаць, і сапраўды не вельмі простая. Веру, што работнікі імкнуцца рабіць усё магчымае для яе выпраўлення. Вядома ж, могуць прысутнічаць як суб'ектыўныя, так і аб'ектыўныя фактары, што ўплываюць на гэта. Але давайце вернемся да галоўнага, пра што гаварылася спачатку — пра бяспеку перавозак. Калі падчас руху адчыняюцца дзверы, калі зрывае дах, калі мікрааўтобусы маюць вялікі прабег і ўвесь час рамантуюцца, — гэта нармальна?.. Добра, што пакуль нічога сур'ёзнага не здарылася. Але нават калі проста ўявіць, што некалькі машын па прычыне свайго сталага веку канчаткова выйшлі са строю — як тады прадпрыемства будзе забяспечваць выкананне сваіх абавязацельстваў? Наколькі я разумею, ліцэнзія на перавозкі — гэта не толькі магчымасць зарабляць грошы, гэта яшчэ і абавязковае выкананне ўмоў, на якіх яна даецца. У тым ліку і сацыяльных — па перавозках. Іншымі словамі, атрымаў «ажыўлены накірунак», бяры ў дадатак і не такі «грашовы». Гэта ў адказ на заўвагу прадстаўніцы прадпрыемства, што іх маршруткі абслугоўваюць і рэйсы да вёсцы Смолянка, куды часам цяжка даехаць з-за неачышчанай ад снегу дарогі, а ўдзячнасці ад пасажыраў з гэтай нагоды не чулі. Зноў жа: пазначаны рэйс у раскладзе — пра якое «мог бы папрасіць пасажыраў ехаць іншым мікрааўтобусам» можна (толькі на падставе эканоміі паліва) весці гаворку?

Цывілізаваная канкурэнцыя — рухавік якасці

Калі заўважылі, я наўмысна не ўказваю для шырокага кола чытачоў назву перавозчыка і прозвішча адказнай работніцы. Чаму? Менш за ўсё хацелася б нашкодзіць прадпрыемству гэтай публікацыяй, калі на тое няма падстаў. Аднак і змястоўных сур'ёзных адказаў на пытанні, як зразумела з вышэйпрыведзеных фактаў, атрымаць амаль што не ўдалося. Хіба толькі пра тэлефоны для сувязі пасажыраў з кіраўніцтвам перавозчыка і ўдакладненне раскладу руху нас абнадзеілі.

Разам з тым мушу падкрэсліць, што без канкурэнцыі — нельга. У першую чаргу кажу гэта з пазіцыі пасажыраў, спажыўцоў паслуг. І тут, гаворачы словамі работніцы прадпрыемства, канкурэнты сапраўды павінны дыхаць у патыліцу. Інакш якая гэта канкурэнцыя? Варта заўважыць, што гаворка ідзе не пра абслугоўванне аддаленых раёнаў, а пра адлегласць у 30 кіламетраў ад Мінска па Магілёўскай шашы. Колісь на перапоўненых «ЛАЗах» гэты шлях займаў гадзіну і іншай альтэрнатывы не было. Потым з'явіліся першыя маршруткі, так званыя «Бычкі», якія абслугоўвалі пасажыраў нароўні з рэйсавымі аўтобусамі. Гэта былі прасторныя, з высокімі столямі мікрааўтобусы. У іх можна было ездзіць нават стоячы. Білеты прадаваліся і праз касы (можна было замовіць іх нават па тэлефоне ці проста купіць загадзя), і праз вадзіцеляў. На жаль, няма больш таго перавозчыка. На змену прыйшоў іншы, на якога спачатку таксама не маглі нарадавацца пасажыры.

Калі быць больш аб'ектыўным, трэба зрабіць невялікае адступленне і сказаць пра не самыя лепшыя, з пункту погляду тых жа пасажыраў, змены, што адбыліся і на аўтастанцыі «Аўтазаводская». Некалі «Звязда» пра іх пісала, таму нагадаем толькі коратка. Раней і рэйсавыя аўтобусы на Смілавічы, і тыя самыя «Бычкі» адпраўляліся па чарзе з адной — першай — платформы. Пасля рэканструкцыі перона цяперашніх «маршрутачнікаў» «выселілі» амаль у канец перона. Тут спыняюцца мікрааўтобусы і іншых напрамкаў, напрыклад, на Мар'іну Горку. Канец перона — гэта на самым рагу, дзе заўсёды плынь людзей. І ім нязручна праз натоўп прабівацца да месцаў пасадкі на свае рэйсы, і тым, хто ў чэргах на мікрааўтобусы стаіць, не зусім камфортна. Калі раней маршрут абслугоўвалі больш умяшчальныя «Бычкі», месца хапала ўсім — і хто ехаў на Смілавічы, і на Турэц, і на Дукору, і на Смолянку. Цяпер жа, чаго раней ніколі не было, пачалі ўтварацца чэргі ў чэргах: чалавек у агульнай быццам бы чарзе займае месца на «свой» рэйс, які будзе яшчэ не хутка. Незадаволеласць, высвятленне адносін... Гэта праяўленне канкурэнцыі паміж дзяржаўнымі перавозчыкамі і прыватнымі? Апошнія прадаюць білеты не праз касы аўтастанцыі. У гэтым праблема? Толькі чаму нязручнасці павінны цярпець пасажыры, калі суб'екты гаспадарання павінны былі б неяк дамовіцца паміж сабой?

Калі плаціць больш, дык за камфорт?

Паўтаруся, спажывец толькі выйграе ад канкурэнцыі. І яна павінна быць, але быць цывілізаванай. Калі ад тэмы аўтастанцыі вярнуцца да нашых перавозчыкаў, то зноў узнікае пытанне: а што яны прапаноўваюць каб павярнуць сітуацыю на сваю карысць?

Збіраюцца павысіць плату за праезд? Па-першае, кошт білетаў рана ці позна будзе павялічаны, прычым у звязцы з магчымым прадастаўленнем ільгот пэўным катэгорыям грамадзян. Зараз цана праезду што ў маршрутцы, што ў рэйсавым аўтобусе — аднолькавая. Плюс рэйсавых аўтобусаў — захаванне раскладу, пасажыр заўсёды атрымлівае білет (хоць праз касу, хоць праз вадзіцеля). Мінус у тым, што марудна едзе, паездка займае хвілін 50, бо аўтобус спыняецца на прамежкавых прыпынках, вадзіцель абілечвае людзей. Плюс маршруткі — хуткасць, недзе хвілін 35 на паездку, па білет не трэба ісці ў касу — значыць, эканоміш час, бо можна набыць яго ў вадзіцеля. Мінусы — тое ж абслугоўванне, нявыдача часам білетаў.

Калі павысіцца плата за праезд, адначасова, напэўна, пачнуць дзейнічаць і льготы. Ці змогуць іх даць прыватнікі? Калі не, здагадайцеся, куды скіруе свой позірк студэнт ці пенсіянер?

Побач з месцам адпраўлення маршрутак на Смілавічы спыняюцца мікрааўтобусы па іншых накірунках. Сучасныя, шыкоўныя машыны з вялікай умяшчальнасцю. За карыстанне паслугамі такой не шкада заплаціць і больш, але менавіта за камфорт. Пакуль жа пасажыры могуць толькі з зайздрасцю пазіраць на гэтыя мікрааўтобусы. У прадпрыемства, наколькі можна было зразумець, далёка не выдатнае фінансавае становішча. Але ж існуюць, напрыклад, банкаўскія крэдыты, лізінг. У любым выпадку — не мяняючы нічога зараз, нельга карэнным чынам паўплываць на сітуацыю заўтра. Інакш гаворка можа ісці пра падаўжэнне існавання прадпрыемства толькі на пэўны час. Ці рэдакцыя не мае рацыі?

P.S. *«Звязда» папрасіла Міністэрства транспарту і камунікацый выказаць па гэтым пытанні сваё меркаванне. У тым ліку адносна таго, ці з'яўляецца прыведзеная інфармацыя выключэннем або гэта распаўсюджаная з'ява? І ў чым карані праблемы?*

Сяргей РАСОЛЬКА.

Кірмаш штотыднёвы рэкламны выпуск № 7 (669) адрэсел рэкламы тэл. 287 17 79

ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

ПРАДАЕЦЦА

❒ Кнігі з хатняй бібліятэкі, вялікі выбар: фантастыка, дзіцячая літаратура, прыгоды.
Тэл. 8017 2462045, 8 029 274 93 79.

❒ Кватэра 2-пакаёвая, 3/5, 47/27/9. Станькава, Дзяржынскі р-н. Усе выгоды. 30 км ад Мінска.
Тэл. 8 029 854 00 99.

❒ Рухавік Д-240 да МТЗ-80. Капрамонт. 1 камплект.
Тэл. 8 029 772 73 37.

❒ Дом ашаляваны 7х8 з участкам 0,25 га, побач возера, лес, вада.
Тэл. 8 029 661 05 72.

❒ Дом у Рудзенску Пухавіцкі р-н, 10 хвілін ад электрычкі. Усе выгоды, лазня, гараж, майстэрня, 21 сотка, сад. 30 км ад МКАД.
Тэл. 8 017 136 35 40.

❒ Сафа (спальнае месца) б/к.
Тэл. 8 017 273 47 67, 8 029 343 11 48.

❒ Трактар ЮМЗ-6, прычэп, плугі, зруб лазні цыліндрычны, памер 6х4.
Тэл. 8 029 271 78 98.

❒ Прычэп аднавосевы, помпа паліўная да МТЗ, шкло лабавое да МТЗ-80.
Тэл. 8 029 754 5 225.

КУПЛЮ

❒ Плёначны фотаапарат, кінакамеру, аб'ектыў.
Тэл. 8 017 233 49 82.

ЗВЯЗДА КУПОН ДЛЯ БЯСПЛАТНАЙ ПРЫВАТНАЙ АБ'ЯВЫ

ЗАПОЎНІЦЕ РАЗБОРЛІВА, ВЫРАЖЫЦЕ І ВЫШЛІЦЕ НА АДРАС РЭДАКЦЫІ: 220013 Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10 А. Тэлефон для даведак 287 17 79.

АБА

ЧАМУ БЕЛАРУС НЕ ЗАПАТЭНТАВАЎ РАДЫЁ?

Пра выбітнага беларускага навукоўца Якуба Атонавіча Наркевіча-Ёдку ў свеце заўжды памяталі. А ў нас на доўгія гады пра яго было забыта. Вярнулі ж беларусы яго адносна нядаўна. Каля 40 гадоў таму маладога навукоўца Уладзіміра Кісялёва прывабіла сядзіба «НадНёман» (Пухавіцкі раён, Мінская вобласць). Аказалася, што ўладальнікам гэтага маёнтка некалі быў якраз Якуб Наркевіч-Ёдка — найвыбітнейшы навуковец XIX стагоддзя, які меў зносіны з Рэнтгенам і Пастэрам, сябраваў з Фламарыёнам. У спісе фундатараў першага ў Расіі рускамоўнага метэаралагічнага часопіса «Метэаралагічны веснік» імя беларускага навукоўца стаіць следам за імем Мендзялеева. А самае цікавае тое, што Ёдка лячыў людзей электрычнасцю і, наогул, вынайшаў радыё!

На пачатку гэтага года адбыліся дзве вельмі значныя падзеі, непасрэдна звязаныя з іменем нашага славутага земляка. Па ініцыятыве навукоўцаў Белдзяржуніверсітэта быў створаны Дабрачынны фонд развіцця навукі, інавацыйных тэхналогій і культуры імя прафесара Я.А. Наркевіча-Ёдкі, які ўзначаліў беларускі фізік Уладзімір Самуйлаў. Дзейнасць фонду будзе накіравана на аднаўленне маёнтка ў вёсцы Наднёман, аднаўленне навуковых лабараторый і стварэнне музея. Акурат адначасова з заснаваннем фонду ў выдавецтве «Беларуская навука» выйшаў надзвычай цікавы біябібліяграфічны ўказальнік, у які ўключана 1200 спасылак на даследаванні беларускага навукоўца і пра яго — вынік шматгадовай працы вучоных Нацыянальнай акадэміі навук Наталлі Бярозкінай і Вольгі Гапоненкі.

Вольга Анатольеўна, вучоны сакратар Камісіі НАН Беларусі па гісторыі навукі, член савета праўлення Дабрачыннага фонду Наркевіча-Ёдкі, распавяла шмат цікавага пра беларускага навукоўца, працу над унікальным указальнікам і планы фонду.

Малавядомы партрэт Я.А. Наркевіча-Ёдкі (фота 1892 г.; быў апублікаваны ў часопісе «Svētozor»).

— Як і калі з'явілася ідэя стварыць Дабрачынны фонд?

— Гадоў 10 таму з'явілася ідэя аднавіць маёнтак Наркевіча-Ёдкі «НадНёман», дзе ў свой час навуковец трымаў санаторый, у якім паспяхова лячыў людзей пры дапамозе «сістэмы Ёдкі». У санаторыі была тэрапія і іншага кшталту. Ёдка быў прафесійным музыкантам і наладзіў сеансы музыкатэрапіі ў сваёй установе. Кумыса-, кефіралячэнне, гімнастыка, вода-, магніта-, гіпнатэрапія, лячэнне сонечным святлом таксама мелі месца ў санаторыі Наркевіча-Ёдкі. Уладзімір Гілеп, які зараз узначальвае Беларускі фонд культуры, у 1997 годзе адзначыў, што было б добра стварыць такі фонд. І толькі сёлета гэтую ідэю змог ажыццявіць вучоны-фізік Уладзімір Самуйлаў. Акрамя аднаўлення будынка, фонд плануе стварыць музей Наркевіча-Ёдкі ў маёнтку «НадНёман». Асноўнае, што будзе ў гэтым музеі, — вяртанне эпохі, часу, калі працаваў даследчык. У музеі павінна быць прадстаўлена абсталяванне XIX стагоддзя, якім мог карыстацца наш навуковец падчас сваіх эксперыментаў. Дарэчы, вялікая калекцыя гэтага абсталявання ўжо набыта Уладзімірам Самуйлавым. Для Беларусі гэта ўвогуле ўпершыню. Бо на дзяржаўным узроўні ў нас няма музея гісторыі навукі.

— Якім чынам Уладзімір Кісялёў вярнуў беларусам імя Наркевіча-Ёдкі?

— Мы сапраўды даведаліся пра гэтага навукоўца з публікацыі Кісялёва. Ён сам краязнаўца, знайшоў маёнтак «НадНёман», зацікавіўся, хто быў уладальнікам. Пайшоў у архіў, пачаў чытаць, і аказалася, што гэта выдатны навуковец. Сёння Уладзімір Кісялёў аднавіў радавое дрэва Наркевічаў-Ёдкаў. Парадокс у тым, што ў свеце імя беларускага навукоўца ніколі не было страчана. У адрозненне ад нас. Мы гартаем альбом фотавыставы, якая праводзілася ў Цэнтры Пампіду ў 2008 годзе і што бачым на вокладцы? Электраграфічны здымак рукі Фламарыёма, які быў зроблены Наркевічам-Ёдкам у 1892 годзе! Мы з вамі пра яго 30 гадоў таму і не ведалі, а на Захадзе электраграфічныя здымкі Наркевча-Ёдкі захоўваліся ў прыватных і музейных калекцыях, у архіўных фондах Францыі, Італіі, Германіі. У гэтых краінах сёння нам яшчэ ёсць што шукаць. Год таму мы знайшлі фатаграфічны



Вокладка альбома фотавыставы, якая праводзілася ў Цэнтры Пампіду ў 2008 годзе. На вокладцы змешчаны электраграфічны здымак рукі Фламарыёна, зроблены Наркевічам-Ёдкам у 1892 годзе.

адбітак лісцяў, які быў зроблены ў 1892 годзе Наркевічам-Ёдкам і пазней надрукаваны ў еўрапейскім каталогу з подпісам самога аўтара.

— Большасць дакументаў, твораў, фотаздымкаў Наркевіча-Ёдкі захоўваецца за мяжой. Ці ёсць магчымасць вярнуць гэтыя матэрыялы?

— Мы яшчэ не прасілі нам нічога вяртаць, шчыра кажучы. Мы проста шукалі, знаходзілі і замаўлялі копіі. Для таго, каб адлюстраваць, наколькі выдатная постаць Наркевіч-Ёдка, у прынцыпе, гэтага дастаткова. Не так важна, дзе захоўваецца матэрыял. Важна, што ён ёсць і што ён уведзены ў навуковы ўжытак.

— Колькі часу заняла праца над біябібліяграфічным указальнікам пра Наркевіча-Ёдку і ці былі нейкія складанасці?

— Я далучылася да распрацоўкі імені Наркевіча—Ёдкі напачатку 1980-х гг. Мы наведвалі архівы ў Маскве, Пецярбургу, рабілі ксеракопіі артыкулаў Ёдкі. Першай спробай сістэматызаваць матэрыялы пра яго было выданне ў 1988 г. біябібліяграфічнага ўказальніка «Якуб Атонавіч Наркевіч-Ёдка», укладальнікамі якога таксама былі Н. Бярозкіна і я. Увесь гэты час мы працягвалі назапашваць інфармацыю. Спатрэбіўся пэўны час, каб асэнсаваць ролю Наркевіча-Ёдкі для развіцця навукі Беларусі. Ён не толькі выдатны даследчык! З яго іменем звязаны кардынальны пераварот у разуменні ролі навукі Беларусі ў кантэксце сусветнай навукі і культуры. У 1896 г. у Парыжы з'явілася кніга М. Дэкрэспа «Жыццё і дзейнасць Якуба Наркевіча-Ёдкі», напісаная пры жыцці вучонага. У пачатку 1980-х гг. яе ўбачыў член-карэспандэнт нашай Акадэміі Віктар Грыбкоўскі і зыніцяваў даследаванні па гісторыі прыродазнаўства, тэхнікі, медыцыны ў дакастрычніцкі перыяд у Беларусі. Пры падтрымцы тагачаснага прэзідэнта Акадэміі навук Мікалая Барысевіча ў 1984-1987 гг. была распачата Рэспубліканская комплексная праграма, прысвечаная вывучэнню гэтых пытанняў. Яе вынікам стала кніга «Нарысы навукі і культуры Беларусі ў 19—пач. 20 стст.». Потым з'явіліся кнігі, у якія былі ўключаны імёны многіх выбітных, але дагэтуль забытых беларусаў. Дзякуючы Наркевічу-Ёдку мы адкрылі гэтыя імёны, якія таксама патрабуюць грунтоўнай распрацоўкі. У тыя часы, каб атрымаць вышэйшую адукацыю, будучыя навукоўцы вымушаны былі з'язджаць, бо ў нас не было ўніверсітэтаў. У адным Пецярбургу колькі было выбітных беларусаў! Вядомы Жорэс Алфёраў не меў магчымасці тут вучыцца, бо ў нас не было яшчэ фізічнага факультэта ў такім выглядзе, як сёння. Таму навуковец вымушаны быў ехаць у Пецярбург, а вяртацца з цэнтра навукі ўжо складана!

— Вольга Анатольеўна, вы столькі гадоў даследуеце асобу Наркевіча-Ёдкі. Чым вас асабіста прывабліве яго постаць?

— Відаць, тым, што гэты чалавек быў цалкам аддадзены навуковай працы. Угледзьцеся ў яго партрэт: гэта інтэлігент, у вачах — апантанасць навуковым пошукам. Бо навука для яго — сінонім гармоніі. Сёння ад вучоных патрабуюць займацца не толькі фундаментальнымі даследаваннямі, а працаваць так, каб навуковыя распрацоўкі ўжо ў бліжэйшы час укараняліся ў прамысловасць. А што нам прапанаваў Наркевіч-Ёдка сто гадоў таму? «Сістэму Ёдкі», зацверджаную ў Італіі ў Інстытуце фізіялогіі, як новы прыярытэтны метад даследавання. Цяпер мы ведаем, што менавіта ён, беларус, вынайшаў радыё. А хіба гэта можа не прывабліваць? Нават у пратаколе пасяджэння Французскага фізічнага таварыства за 1898 г., прысвечанага працам А. Папова па перадачы радыёсігналаў, адзначалася, што двума-трыма гадамі раней падобныя эксперыменты паспяхова правёў у Вене беларус Наркевіч-Ёдка. А свой прыярытэт у гэтым ён не адстойваў толькі таму, што вызначальным навуковым кірункам для яго стала вывучэнне ўласцівасцяў атмасферных электрычнасці і яго ўздзеянне на жывую прыроду, прымяненне гэтай распрацоўкі ў медыцынскіх мэтах. Такой сціпласці і адказнасці за вынік навуковага даследавання варта павучыцца. Мне прыемна, што ён беларус, жыў і працаваў на нашай зямлі, і яго святло ідзе да нас.

— Якім чынам Наркевіч-Ёдка выкарыстоўваў электраграфічны метад у дыягностыцы захворванняў?

— Што такое электраграма Ёдкі? Кажучы ненавуковай мовай, гэта калі ў высокачастотным разрадзе атрымліваецца свячэнне ад прадмета. Адным з электродаў з'яўляецца прадмет, ад якога ідуць іскры, і яны фіксуюцца на фотапласцінцы. Нашы часткі цела ў залежнасці ад эмацыйнага стану маюць рознае супраціўленне. А гэта значыць, што разрады будуць па-рознаму выглядаць. Калі чалавек адчувае сябе дрэнна — у яго адна карцінка, калі ён ва ўзбуджаным стане — у яго іншая карцінка. Наркевіч-Ёдка зрабіў больш за 1,5 тысячы такіх здымкаў, каб прасачыць заканамернасць. І калі ён склаў сваю сістэму, то пачаў выкарыстоўваць электраграму для пастаноўкі дыягназаў і лячэння людзей ад псіхічных, неўралагічных захворванняў. Электрычным разрадам уздзейнічаў на пэўныя кропкі (сёння мы называем іх кропкамі акупунктуры). Нечым гэта падобна на іголкаўкалванне. Першапачаткова даследчык скарыстоўваў гэты арыгінальны метад электратэрапіі ў Інстытуце фізіялогіі ў Рыме пад назвай «Сістэма Ёдкі», потым у клініках Рыма і Фларэнцыі. А з 1893 г. стаў эфектыўна прымяняць яго ў сваім санаторыі «НадНёман» для лячэння паралізаваных і нервовахворых. Ахвотных патрапіць у санаторый было вельмі шмат. Ёдка лячыў 50 чалавек у год бясплатна, астатнія маглі карыстацца паслугамі за 1,5 рубля. Сёння недалёка ад вёскі Наднёман засталіся муры дач, у якіх сяліліся тыя, хто наведваў санаторый Наркевіча-Ёдкі.

***

Шкада, што большасць прац нашага славутага суайчынніка знаходзіцца за мяжой. І як было б выдатна прывезці гэтыя фотаздымкі і дакументы ў Беларусь — хоць бы для часовага экспанавання ў сценах адноўленага маёнтка «НадНёман»! Каб не толькі навукоўцы змаглі асэнсаваць усю значнасць адкрыццяў Наркевіча-Ёдкі, але і іншыя беларусы адчулі подых слаўнага часу і веліч беларускай гісторыі.

Вольга ЧАЙКОЎСКАЯ.

Некалькі фактаў пра дзейнасць Дабрачыннага фонду імя Наркевіча-Ёдкі ад Уладзіміра Самуйлава:

1. У склад заснавальнікаў фонду ўваходзіць у тым ліку і адзін з нашчадкаў вялікага беларускага вучонага — будаўнік і мецэнат Сяргей Ёдка.

2. Навуковым кіраўніком архітэктурна-вышукальных, рэстаўрацыйна-будаўнічых прац у сядзібе «НадНёман» будзе архітэктар Сяргей Багласаў. Просьба аб зацвярджэнні яго кандыдатуры адпраўлена ў Міністэрства культуры. 15-20 гадоў таму архітэктар вывучаў сядзібу «НадНёман» і яшчэ тады склаў эскізны праект аднаўлення сядзібы.

3. Для будучага музея ў «НадНёмане» прыбаныя экспанаты. Калекцыя складаецца з разнастайных фізічных прылад, якія набываліся спаксваля ў калекцыянераў з Вялікабрытаніі, ЗША, Францыі, Германіі. Варта сказаць, што іх аналагі выстаўляюцца на найбуйнейшых міжнародных аўкцыёнах (напрыклад, такіх, як Cristies і Fleaglass) і з'яўляюцца экспанатамі найбуйнейшых музеяў антыкварнага навуковага абсталявання (такіх, як Sparkmuseum).

4. Сродкі на аднаўленне сядзібы і стварэнне музея будзем браць з розных крыніц: рэспубліканскія і замежныя праграмы і фундуючыя арганізацыі, звязаныя з аднаўленнем і захаваннем культурнай спадчыны, прыцягненне інвестараў, прадпрымальнікаў, дабрачынных ахвяраванняў мецэнатаў і інш.

5. Працы па ачыстцы сядзібы «НадНёман», кансервацыі руінаў будынкаў, стварэнні архітэктурна-будаўнічага праекта плануецца пачаць сёлета. У першую чаргу плануецца аднавіць «твар» помніка архітэктуры — уязную браму, у ёй стварыць мінімальную экспазіцыю, якая знаёміла б наведвальнікаў з постаццю навукоўца і яго даследаваннямі. Усе працы па аднаўленні сядзібы плануецца правесці цягам пяці гадоў.

Георгій ПАПЛАЎСКІ:

«РЭАЛІЗМ — ДУША МАСТАЦТВА»

Сёння спаўняецца 80 гадоў выдатнаму беларускаму мастаку Георгію Паплаўскаму, правадзейнаму члену дзвюх акадэмій — Расійскай акадэміі мастацтваў і Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, лаўрэату многіх міжнародных прэмій. У трыццаць дзевяць гадоў яму была прысвоена прэмія Ленінскага камсамола Беларусі, у сорак тры — міжнародная прэмія імя Джавахарлала Неру, у сорак сем — званне «Заслужаны дзеяч мастацтва».

Лёс да Георгія Георгіевіча быў сапраўды прыхільным, але ніколі не пераставаў у агульнапрынятым разуменні. Цяжкасцяў і праблем хапала. І ўсяго ён дабіваўся ўласнай працай.

Яго малая радзіма — ціхая, зручная вёсачка Бортнікі, што пад Бабруйскам. Тут прайшло дзяцінства, малалецтва і першыя гады юнацтва. Нарадзіўся ж Георгій Георгіевіч ва Украіне, у горадзе Роўна. Там жыла ў той час уся маміна радня, і калі ёй прыйшоў час нараджаць, жанчына на гэты час з вёскі паехала да сваіх, у горад. А пасля вярнулася назад, у Бортнікі.

Бацькі Георгія Паплаўскага — рускія, са старавераў. Бацька доўгія гады працаваў слесарам на фанерна-дрэваапрацоўчым камбінаце ў Бабруйску. Па тых часах гэта была добрая, грашовая спецыяльнасць. На камбінаце яго цанілі і за ўмелыя рукі, і за стараннасць, добрасумленнасць.

Трэба сказаць, што ўся радня Георгія Паплаўскага была вялікімі працаўнікамі. Бацька ледзь свет ужо быў на нагах і абавязкова што-небудзь майстраваў, завіхаўся па гаспадарцы. Потым ехаў на працу, а вяртаючыся вечарам дадому, зноў з галавой паглыбляўся ў хатнія турботы. І так з дня ў дзень.

Сам Георгій Георгіевіч прызнаецца: «Калі мне штосьці і ўдалося зрабіць у гэтым жыцці, дык толькі дзякуючы таму, што бацькі здолелі выхаваць ува мне любоў да працы. Хоць, па праўдзе кажучы, мая працавітасць ужо на парадак ніжэйшая. Гарадскія ўмовы, напэўна, адбіліся. Я вось прачынаюся рана, але адразу ўставаць не люблю. Затое калі вазьмуся за працу, то раблю ўсё з захапленнем, з азартам. Часам ля мальберта магу прастаяць і сем гадзін, і восем, і больш».

Маляваць яму хацелася з дзяцінства. Праўда, умоў для гэтага не было. Вайна, пасляваенная разруха. Ні добрай паперы, ні фарбаў. Алоўкі каляровыя і тое дастаць было цяжка. Але ён усё ж маляваў! Вялікую ролю ў дзіцячым захапленні адыграў гурток выяўленчага мастацтва ў Бабруйскім Доме піянераў, якім кіраваў Барыс Фёдаравіч Бяляеў. Менавіта яму ўдалося прывіць дзецям любоў да прыроды і распаліць першае жаданне самому штосьці намаляваць. Выхаваныя ім у лепшых традыцыях рускай рэалістычнай школы, яны пазней паспяхова закончылі спецыяльныя ВНУ і сталі прафесійнымі мастакамі.

Так, напрыклад, за плячамі Георгія Георгіевіча — Мінскае мастацкае вучылішча і тэатральна-мастацкі інстытут, аддзяленне жывапісу.

У свой час ён быў у сяброўстве з многімі вядомымі беларускімі пісьменнікамі і паэтамі — Іванам Мележам, Аркадзем Куляшовым, Васілём Быкавым, Уладзімірам Караткевічам, Янкам Брылем, Алесем Адамовічам, Аляксеем Кулакоўскім, Міколам Лупсяковым...

Акрамя мінскіх выдавецтваў, яму нярэдка рабілі заказы і маскоўскія. Паплаўскі, напрыклад, афармляў юбілейны аднатомнік Васіля Быкава, «Палескую хроніку» Івана Мележа і іншыя кнігі.

Нягледзячы на тое, што Георгій Паплаўскі жывапісец па адукацыі, яму заўсёды падабаліся малюнак, гравюра, афорт. Больш за тое, яго так захапіла ілюстрацыя, што ён стаў ёй аддаваць амаль увесь свой працоўны час. Але графіка, безумоўна, займае ў творчасці Георгія Паплаўскага асноўнае месца: «Гэтая праца дастаўляла і дастаўляе мне сапраўдную радасць. Бо калі да яе ставіцца з усёй сур'ёзнасцю, з любоўю і натхненнем, для мастака ў ілюстрацыі адкрываецца прастора незвычайная. Па вялікім рахунку — гэта ўжо нават не ілюстраванне, а самастойнае мастацкае пераасэнсаванне літаратурнага тэксту».

Георгій Георгіевіч не прыхільнік дзяліць мастацтва на левае і правае, на чыстае і нячыстае. Ён цярпіма ставіцца да любых кірункаў і праяў у мастацтве: «Гэта — як кветкі на лузе: чым іх больш, тым лепш. Нельга ўсё шматквецце зводзіць да адной монакветкі. І разам з тым нельга кветку прыраўноўваць да пустазелля. У мастацтве, пры ўсёй разнастайнасці метадаў і кірункаў, павінна быць галоўнае, вызначальнае, прыярытэтнае».

Сам ён аддае перавагу рэалізму. І не таму што ён — мастак старэйшага пакалення, мастак рэалістычнага кірунку і абараняе сваю пазіцыю. Лепшыя творы, якія прайшлі выпрабаванні часам, ствараліся ў рэалістычнай манеры. Акрамя таго, немагчыма пазбегнуць сацыяльнага кірунку ў творчай рабоце. Сацыяльныя тэмы закраналіся ў любую эпоху, нават у сярэднявечны. Па карцінах старых майстроў сёння шмат пра што можна меркаваць — пра той час, пра стан грамадства, пра чалавека, пра архітэктуру, пра пейзаж, гэта значыць — пра рэальны свет. Ён выхоўваўся на рэалістычным мастацтве, і гэты рэалізм у яго ў крыві.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка павіншаваў народнага мастака Беларусі Георгія Паплаўскага з 80-годдзем.

«Выбраўшы сваёй музай Беларусь, Вы ў вялікай колькасці выдатных твораў праславілі веліч і прыгажосць роднай зямлі, стваральную працу нашых людзей. Яркі талент, вернасць рэалістычным традыцыям, патрыятызм і непаўторнае майстэрства прынеслі Вам заслужаны поспех і сусветнае прызнанне», — гаворыцца ў віншаванні.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Пра свой любімы кірунак Георгій Паплаўскі гаворыць так: «Мастацтву рэалізму заўсёды шлях паказвала толькі праўда. Сумленная, аб'ектыўная, глыбінная праўда жыцця. На жаль, гэту праўду нярэдка цяснілі лжывая лакіроўка, угодлівы сервілізм, нарэшце, проста бездухоўнасць. Гэта асабліва кідаецца ў вочы ў так званых «парадных» і культавых работах палітызаваных перыядаў у мастацтве». У асабістым жыцці ў Георгія Георгіевіча таксама ўсё склалася добра: «Мне пашанцавала, што побач заўсёды ёсць чалавек, які можа прафесійна ацаніць зробленае табой, сказаць сумленна і прама, калі штосьці не падабаецца. Жонка мая, Наталля Мікалаеўна, — не проста таленавіты мастак, яна вельмі шчыры, добры, клапатлівы сябар».

За час сумеснага жыцця яны вырасцілі цудоўную дачку Кацярыну. Яна ўжо таксама член Саюза мастакоў, удзельніца многіх рэспубліканскіх і міжнародных выставак. Яе карціны набывалі еўрапейскія музеі і прыватныя калекцыянеры.

Праца Г. Паплаўскага і як мастака, і як грамадскага дзеяча мае дакладна выражаны грамадскі вектар. Гэта не значыць, што ён служыць камусьці або чамусьці з нейкіх прагматычных інтарэсаў, не, ён абсалютна бескарыслівa служыць свайму народу.

Ян ЖУР.

На тэатральным форуме будзе аншлаг

Міжнародны моладзевы форум «Март-кантакт» у Магілёве пачнецца 21 сакавіка, але ўжо цяпер амаль на палову спектакляў прададзены ўсе квіткі.

Продаж квіткоў пачаўся напрыканцы студзеня, і з 4-х тысяч прададзена амаль палова. Найбольшай папулярнасцю ў магілёўцаў карыстаюцца класічныя спектаклі ў сучаснай інтэрпрэтацыі.

Увогуле на «Март-кантакце» будзе паказана 15 спектакляў, якія прадставяць тэатральныя калектывы з Беларусі, Расіі, Украіны, Польшчы, Літвы, Латвіі, Балгарыі і Германіі. Яшчэ зараз ёсць магчымасць набыць квіткі на эксперыментальныя, пластычныя пастаноўкі. Кошт — ад 6 да 30 тысяч рублёў.

Ілона ІВАНОВА.

УВАЖАЕМЫЕ АКЦИОНЕРЫ ОАО «ЗНАМЯ ИНДУСТРИАЛИЗАЦИИ»

15 марта 2011 года

СОСТОИТСЯ ОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ акционеров ОАО «Знамя индустриализации» по адресу: г. Витебск, ул. Гагарина, д. 11, зал заседаний.

ПОВЕСТКА ДНЯ СОБРАНИЯ:

1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества в 2010 году и основных направлениях деятельности Общества на 2011 год.
2. Отчет о работе Наблюдательного совета в 2010 году. Оценка деятельности директора Общества Наблюдательным советом. Отзыв Наблюдательного совета о годовом балансе Общества.
3. О результатах проверки Ревизионной комиссии финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2010 год.
4. Утверждение годового отчета, бухгалтерского баланса, счетов прибыли и убытков Общества за 2010 год.
5. Избрание членов Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии Общества.
6. О вознаграждении членов Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии Общества.
7. О получении ОАО «Знамя индустриализации» государственной поддержки из инновационного фонда концерна «Беллегпром» и из средств республиканского бюджета.
8. Об увеличении уставного фонда Общества путем выпуска дополнительных акций на сумму государственной поддержки, предоставленной из инновационного фонда концерна «Беллегпром» и средств республиканского бюджета.
9. Утверждение решения о выпуске дополнительных акций.
10. Утверждение изменений и дополнений в Устав Общества и утверждение Устава Общества в новой редакции.
11. Утверждение локальных нормативных актов Общества.

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по адресу: г. Витебск, ул. Гагарина, д. 11, в рабочие дни с 4 по 14 марта 2011 года по месту нахождения Общества (ком. 34), с 9 часов до 16 часов 15 марта 2011 года по месту проведения собрания.

Регистрация участников собрания с 13 часов до 13 часов 45 минут по месту проведения собрания.

Начало работы собрания — 15 марта 2011 года в 14 часов.

Список акционеров для участия в собрании будет составлен по состоянию на 15 февраля 2011 года.

Для регистрации при себе иметь следующие документы:
- акционеру Общества — паспорт,
- представителю акционера — паспорт и доверенность.

Наблюдательный совет ОАО «Знамя индустриализации».

УНП 300200360

АМЕРЫКАНСКІ ЛЁС БАЙЦА АНДРЭЯ АРЛОЎСКАГА,

або У палоне галівудскай славы

Атрымаўшы пояс чэмпіёна свету па баях без правілаў, беларус стаў сусветнай знакамітасцю. Андрэй Арлоўскі пераехаў жыць у Чыкага, пачаў сустракацца з зоркай часопіса Playboy, здымаўся ў галівудскай кінастужцы разам з Жан- Клодам Ван Дамам, займеў фан-клуб. І пры гэтым паўсюль афішаваў сваё беларускае паходжанне.
Але днямі Андрэй пацярпеў чацвёртае паражэнне запар і, на думку многіх, бясслаўна пакінуў баі без правілаў.
Ці пачуем мы яшчэ калі-небудзь пра беларускага «Пітбуля»? Што здарылася з Арлоўскім у ЗША і чаму адзін з найпрыгажэйшых байцоў у гісторыі страціў свой пераможны ўдар? Пра гэта ў матэрыяле «Звязды».

У ноч з 12 на 13 лютага мільёны тэлегледачоў у прамым эфіры глядзелі двубоі па ММА (так правільна называюць баі без правілаў). У Izod Center горада Рутэрфорд (ЗША, штат Нью-Джэрсі) стартаваў неверагодны дагэтуль турнір, у межах якога восем наймацнейшых байцоў павінны вызначыць найлепшага. Турнір займеў назву «Васьмёрка суперцяжкавагавікоў Strikeforce».

Знакамітага за акіянам беларуса Андрэя Арлоўскага таксама сюды запрасілі. І нездарма — наш хлопец мае вялікую армію прыхільнікаў, што выгадна арганізатарам падобных турніраў.

Але ў першым раўндзе чвэрцьфінальнага двубою з расіянінам Сяргеем Харытонавым усю гэтую армаду фанатаў скалынула жахам: Арлоўскі атрымаў цяжкі накаўт. Некалі знакамітыя чэмпіён свету, выйграючы па ходу боя, атрымаў чацвёртае паражэнне запар.

Што здарылася з Андрэем, які перад турнірам, правёўшы зборы ў найлепшых амерыканскіх трэнераў, заяўляў пра сваю небывалую гатоўнасць?

Адказ на гэтае пытанне можна знайсці, калі прасачыць біяграфію нашага яркага байца.

За што амерыканскія фанаты палюбілі Арлоўскага?

Арлоўскі нарадзіўся ў Бабруйску ў 1979 годзе (сёння Андрэю 32 гады, па мерках суперцяжкай вагі гэта няшмат).

Цікавіцца байцоўскімі адзінаборствамі ён пачаў у студэнцкія гады — Андрэй скончыў сталічную Акадэмію МУС, але ў праваахоўных органах так і не папрацаваў. Арлоўскі займаўся самба і дзюдо, у 1999 годзе ён стаў чэмпіёнам свету сярод моладзі (спаборніцтвы праходзілі ў Санкт-Пецярбургу).

Пасля гэтага хлопец прыйшоў у залу кікбоксінга. Ужо па заканчэнні акадэміі Андрэй выступаў па правілах ММА, дзе можна і дужацца, і біць з рук і ног.

Хлопец адрозніваўся эфектным целаскладам, хуткасцю, зграбнасцю. Вельмі хутка Арлоўскага заўважылі ў ЗША. У 2005 годзе здарылася гістарычная падзея: Андрэй сенсацыйна перамог у тытульным паядынку за пояс чэмпіёна свету UFC (адна з самых прэстыжных версій у баях без правілаў). Той гістарычны двубой здарыўся 5 лютага 2005 года ў Лас-Вегасе. Андрэй правёў эфектны балявы прыём на ахіле амерыканца Ціма Сільвіі. І тым самым увайшоў у летапісы сусветнага спорту.

Дарэчы, у Беларусі пра гэтую знакавую падзею напісалі толькі адзін артыкул, у газеце «Комсомольская правда». А вось у ЗША Арлоўскі стаў супермодным, яму далі гучную мянушку «Пітбуль», і пасля гэтага на цырымоніях узважвання Андрэй з'яўляўся з арыгінальнай клыкатай капай. Так бы мовіць, падтрымліваў свой мастацкі вобраз. Разам з гэтым Андрэй адрозніваўся інтэлігентнасцю, дабрынёй, не глядзеў на іншых людзей зверху, ніколі не зневажаў супернікаў. Фанатам гэта вельмі падабалася. «Пітбулю» прапанавалі застацца ў ЗША назаўсёды. І ён прыняў рашэнне пераехаць.

— Я не хачу размаўляць пра Арлоўскага. Пасля таго, як гэты чалавек выйграў пояс, ён з'ехаў у ЗША. З таго часу нават ні разу мне не патэлефанаваў. Для мяне гэты чалавек — не існуе...

Як мне стала вядома, Дзмітрый Сцяпанаў, развітаўшыся са знакамітым вучнем, расчараваўся і кінуў трэнерскую працу — стаў кіраўніком аднаго з мінскіх прадпрыемстваў.

У той жа час яго былы вучань будаваў кар'еру ў Чыкага. Яму ўдалося некалькі разоў абараніць пояс чэмпіёна свету. Але 15 красавіка 2006 года Андрэй страціў тытул у паядынку з усё тым жа Цімам Сільвіяй.

Нягледзячы на гэта, кар'ера ішла ўгару і ганарары Андрэя павялічваліся. За гады, праведзеныя ў ЗША, «Пітбуль» атрымаў некалькі значных перамог. Напрыклад, у 2007 годзе ён пераўзышоў бразільскага байца джыў-джыцу Фабрысіа Вердума, які таксама быў запрошаны ў «Васьмёрку суперцяжкавагавікоў Strikeforce».

У ЗША квітнела і каляспартыўнае жыццё Арлоўскага. Ён займеў вядомую дзяўчыну — зорку эратычнага часопіса Playboy Патрысію Мікулу. Культавы акцёр з галівудскіх баевікоў, Жан-Клод Ван Дам, запрасіў Андрэя зняцца ў кінастужцы «Універсальны салдат-3». І гэтыя планы ажыццявіліся.

Пракляцце знакамітасцю

Яшчэ раз падкрэслю (гэта ключавы факт, на які мала хто звяртае ўвагу), што чэмпіёнам свету ў версіі UFC Арлоўскі стаў, трэніруючыся ў Мінску. Ім займаўся асабісты трэнер — Дзмітрый Сцяпанаў, адзін з першых беларускіх кікбаксёраў. Адносіны я меў размову са спадаром Дзмітрыем, і вось што ад яго пачуў:

— Я не хачу размаўляць пра Арлоўскага. Пасля таго, як гэты чалавек выйграў пояс, ён з'ехаў у ЗША. З таго часу нават ні разу мне не патэлефанаваў. Для мяне гэты чалавек — не існуе...

Адзначу, што Арлоўскі ніколі не забываўся, адкуль ён прыехаў, і паўсюль пры любой магчымасці заяўляў, што ён беларус. У рынг Андрэй выходзіў пад двухбаковым амерыкана-беларускім сцягам.

— Я даўно жыву ў Амерыцы. Гэта мой другі дом. У мяне тут трэнер, спарынг-партнёры. Я паважаю краіну, у якой жыву і зарабляю грошы. Таму я не мог праігнараваць маю другую радзіму і выйсці толькі пад беларускім сцягам, — заявіў Андрэй Арлоўскі журналістам на прэсавай канферэнцыі, прысвечанай апошняму турніру. — Але Беларусь я таксама люблю. У мяне там засталіся сябры, блізкія людзі. Тамy я выйду ў рынг з двухбаковым палотнішчам.

Аднак, на жаль, у 2009 годзе ў Андрэя пачаліся сур'ёзныя праблемы. Спачатку ён прайграў накаўтам расіяніну Фёдару Емяльяненку (найлепшаму байцу ММА ў гісторыі). У чэрвені 2009 годзе на 22-й секундзе двубоя Андрэй упаў ад удараў амерыканца Брэта Роджэрса. У маі 2010-га «Пітбуль» прайграў па пунктах байцу з Бразіліі Антоніа Сільве.

Пайшлі размовы пра тое, што Андрэй — «прабіты», што ў яго «шкляная» сківіца, якая ўжо не здольная вытрымліваць моцных удараў.

Арлоўскі практычна перастаў дужацца ў партэры і, прапускаючы моцны ўдар, губляўся, стаяў на месцы і атрымліваў яшчэ і яшчэ.

Хоць з выгляду Андрэй не выглядаў «прабітым». Раз за разам фанаты жадалі бачыць яго на турнірах і верылі ў «рэінкарнацыю Арлоўскага».

Перад апошнім двубоем Андрэй даў поўнае рашучасці інтэрв'ю:

— Мяне гэтыя тры паражэнні моц-

Разам з гэтым Андрэй адрозніваўся інтэлігентнасцю, дабрынёй, не глядзеў на іншых людзей зверху, ніколі не зневажаў супернікаў. Фанатам гэта вельмі падабалася. «Пітбулю» прапанавалі застацца ў ЗША назаўсёды. І ён прыняў рашэнне пераехаць.

на падкасілі як фізічна, так і маральна. Выбівалі з раўнавагі і асабістыя праблемы. Таму я цешуся, што ў мяне з'явілася магчымасць рэабілітавацца. Я шмат трэніраваўся. Спачатку са сваёй камандай у Чыкага, потым — у гарах Нью-Мексіка. Апошнія восем тыдняў да двубоя з Харытонавым былі прысвечаны выключна трэніроўкам. Я гатовы на 100%, магу выйсці змагацца хоць зараз.

На жаль, вынік боя шакіраваў фанатаў Андрэя...

Зварот ад прыхільнікаў

Шэраг прыхільнікаў Андрэя Арлоўскага і некаторыя вядомыя спецыялісты ў байцоўскіх адзінаборствах папрасілі мяне напісаць своеасаблівы зварот да Андрэя Арлоўскага (мы ведаем, што з вялікай доляй верагоднасці ён прачытае гэты артыкул).

Андрэй не можа выйсці на свой узровень узору 2005 года. І на думку многіх, яго праблемы перш-наперш псіхалагічныя. З фізічнымі данымі ў «Пітбуля» ўсё ў парадку.

У штатах з Арлоўскім працуюць найлепшыя трэнеры. Напрыклад, падрыхтоўку да двубоя з Харытонавым баец праходзіў у знакамітага спецыяліста па змешаных адзінаборствах Грэга Джэксана. Таксама з нашым байцом працаваў трэнер па боксе Майк Вінкелджон, які перад двубоем даў свой каментар журналістам:

*— Андрэй — цудоўны баец, які па нейкай прычыне ў двух апошніх двубоях не выкарыстоўваў свой атлетызм. Насамрэч ён даволі спрытны, таму мы рабілі шмат практыкаванняў

ЗВЯЗДА 15 лютага 2011 г.

На Магілёўшчыне, непадалёк ад райцэнтра Горкі, размясціўся аграгарадок з даволі незвычайнай для нашых мясцін назвай, якая ўжо адразу выклікае пэўныя асацыяцыі з грузінскай зямлёй, — Горы. «Так, у Горы патрапілі, а дзе ж тут, цікава, помнік правадыру ўсіх краін і народаў?», — пацікавіліся мы жартам. Ды менавіта так і спыталі пра гэта ў кіраўніка мясцовай гаспадаркі (ці, дакладней, — закрытага акцыянернага таварыства з аднайменнай назвай «Горы») Аркадзя Галавастага.

— Ну, наконт помніка правадыру — прабачце, а вось былую вотчыну, напэўна, не менш знакамітага рускага графа Меншыкава, якая месціцца ў нас тут жа, у Горах (наша назва, як бачыце, падпарадкоўваецца правілам правапісу), магу паказаць, — адказаў Аркадзь Барысавіч. А пры гэтым патлумачыў пра магчымае паходжанне назвы «Горы»: мясцовасць навокал — узгорыстая, «не горш», чым на Лагойшчыне, — адсюль, няйначай, і назва.

ЯК СКІРАВАЦЬ ВЫТВОРЧАСЦЬ ТУДЫ, ДЗЕ ГРОШЫ ЛЯЖАЦЬ...

Закрытае акцыянернае таварыства «Горы»

Яшчэ Аркадзь Барысавіч падкрэсліў: Горы маюць больш чым пяцівекавую гісторыю (у 1994 годзе якраз адзначалі 500-годдзе); і менавіта тут, у Горах, некалі, яшчэ пры расійскіх царах, была закладзена знакамітая цяпер сельскагаспадарчая Акадэмія — на самым пачатку ў якасці сельскагаспадарчай школы. Вось такім чынам пачалося наша знаёмства з гаспадаркай «Горы», якую, дарэчы, старшыня Горацкага райвыканкама Ігар Макар ахарактарызаваў як найбольш паспяховую ў раёне.

* * *

Чым жывуць цяпер працаўнікі вёскі, а ў першую чаргу кіраўнікі гаспадарак? Калі ўжо поўнасцю падведзены вынікі мінулага года, а да пачатку новага сельскагаспадарчага цыкла — у прыватнасці, вясенне-палявых работ — яшчэ пакуль што, як быццам, няблізка? Вядома ж, у першую чаргу дэталёва асэнсоўваюцца дасягненні (і хібы) мінулага года, удакладняюцца, у адпаведнасці з мінулагоднім вопытам, планы на цяперашні год.

Для гаспадаркі «Горы» мінулы год у цэлым склаўся няблага. Гэта — шматпрофільная гаспадарка; хоць у ёй і аддаюць перавагу мяса-малочнаму кірунку, але разам з тым актыўна займаюцца вырошчваннем раслінаводчых культур. Ацэньваючы вынікі мінулага года ў раслінаводстве, кіраўнік гаспадаркі, тым не менш, у першую чаргу назваў тое, што ў ёй страцілі. А страцілі ў ёй каля 2,5 тысячы тон збожжавых. Раён і, вядома, гаспадарку «Горы», як і многія іншыя гаспадаркі краіны, напаткала летась неймаверная гарачыня і засуха. Адпаведна, тут летась сабралі збожжавых па 38,5 цэнтнера з гектара, хоць у апошнія гады збіралі больш за 50. А 50, з улікам геаграфіі Горацкага раёна (а знаходзіцца ён на поўначы Магілёўшчыны), — гэта добрая ўраджайнасць. Аднак леташнія страты — наяве, і трэба рабіць пэўныя высновы. Тым больш, што сёлета ў «Горах» намецілі выйсці на ўраджайнасць 53 цэнтнеры з гектара, прычым маючы на ўвазе 60, а налета (2012 год павінен стаць асабліва адметным для Горацкага раёна — тут будуць праведзены рэспубліканскія «Дажынкі») — і на 60 з лішкам. У сувязі з гэтым, падкрэсліваў кіраўнік, некалькі мяняюцца падыходы да вядзення справы. У першую чаргу ўхіл робіцца на лепшае насычэнне глебы арганікай, а яшчэ — на дакладнае захоўванне ўсіх агратэхналогій, або на своечасовую хімічную праполку раслін, апрацоўку іх супраць хвароб, рэгулярную падкормку. А яшчэ — на адпаведную тэхніку для выканання ўсіх гэтых работ. У структуры пасяўных плошчаў збожжавыя займалі ў гаспадарцы каля 2400 гектараў. З павышэннем іх ураджайнасці на добры збожжавы вал выйдуць у гаспадарцы.

Неблагі даход прыносіць ёй рапс, пад які летась было занята 500 гектараў — маслічнага насення рапсу атрымалі тут па 23 цэнтнеры з гектара, а на асобных участках — і па 40. Насенне рапсу адпраўляецца як на маслаэкстракцыйныя прадпрыемствы, так і на завод па вытворчасці біяпаліва. Плошчы пад рапс у гаспадарцы пашыраюць яшчэ больш. Дарэчы, у гаспадарцы звяртаюць увагу на не зусім партнёрскія адносіны перапрацоўшчыкаў рапсу, якія плацяць за кілаграм насення па 700 рублёў і вяртаюць назад адходы (для скормлівання жывёле) па 600 рублёў. Розніца — зусім невялікая, але ж ці можна амаль што прыраўноўваць па цане насенне і адходы яго перапрацоўкі. Карацей кажучы, неблагі бізнэс атрымліваецца ў перапрацоўшчыкаў. За кошт сельскага працаўніка. Зрэшты, гэта ўжо свайго роду тэндэнцыя: нямала хто імкнуўся і імкнецца на ім зарабіць.

А вось ад ільну, які таксама традыцыйна вырошчвалі ў гаспадарцы, тут вырашылі адмовіцца зусім; гэтай культурай, падкрэсліваюць у гаспадарцы, трэба займацца спецыяльна, у спецыялізаваных гаспадарках, інакш яна будзе нявыгаднай, ды і будзе стрымліваць магчымасці ў іншых раслінаводчых кірунках. Затое сёлета з'явіцца тут зусім новая культура — цукровыя буракі. Ну, вядома ж, не мог не «прывезці» іх з сабой цяперашні кіраўнік райвыканкама, які да гэтага кіраваў Нясвіжскім раёнам, дзе цукровыя буракі сталі адной з самых папулярных культур. Праўда, ёсць і больш празаічнае тлумачэнне з'яўлення ў севазвароце гаспадаркі «Горы» цукровых буракоў: для атрымання ў ёй ад свайго немалога статка «вялікага» малака (пра гэты кірунак будзе сказана крыху ніжэй) трэба добра абагачаць асноўныя кармы, прызначаныя для гэтага статка, пратэіна-цукровым комплексам. А, напрыклад, патаку, якую звычайна выкарыстоўваюць для гэтых мэт сельгасвытворцы іншых абласцей, на Магілёўшчыне практычна няма дзе ўзяць. Выйсце адно: таксама вырошчваць цукровыя буракі.



— Ужо ёсць дамоўленасць з Гарадзейскім цукровым камбінатам наконт неабходнай дапамогі па вырошчванні цукровых буракоў, а таксама наконт іх перапрацоўкі (будзем дастаўляць іх у Гарадзею чыгункай). Плануем атрымаць іх з нашага першага ўраджаю па 500 цэнтнераў з гектара; на Нясвіжчыне атрымліваюць і па 600, і па 700, але і наша зямля здольная на даволі высокія ўраджаі, і 500 цэнтнераў — гэта, па сутнасці, толькі для пачатку. Пры гэтым мы падлічылі, што ўжо пры ўраджайнасці 250—290 цэнтнераў поўнасцю пакрыем усе нашы выдаткі. Ну, а тое, што зверху, — гэта ўжо будзе цалкам наша, наш даход, — падкрэсліваў кіраўнік гаспадаркі.

Ужо зазначана: у гаспадарцы робіцца ўхіл на мясамалочны кірунак, адпаведна — павышаная ўвага вырошчванню кармавых культур, у тым ліку — кукурузы. Пры гэтым летась, нягледзячы на тыя ж не зусім спрыяльныя ўмовы, кармоў нарыхтавана на 40 працэнтаў больш, чым у папярэднім годзе. І, як будзем бачыць ніжэй, вельмі своечасовым аказаўся гэты запас сёлета.

СКІРОЎВАЦЬ ВЫТВОРЧАСЦЬ ТУДЫ, ДЗЕ ГРОШЫ ЛЯЖАЦЬ...

Так казаў падчас гутаркі кіраўнік гаспадаркі. Аднак дзе ж ляжаць гэтыя грошы — не на полі ж цудаў?..

— А яны цяпер — у вытворчасці малака. Гэта на сёння — вельмі запатрабаваны прадукт. І найбольш выгадны, найбольш рэнтабельны. Прычым ён прыносіць вельмі хуткія грошы: сёння падаіў, рэалізаваў, а ўжо заўтра атрымлівай за яго грошы...

За кошт чаго зроблены такія прыбаўкі?

У першую чаргу за кошт таго, што ў гаспадарцы вытворчасць малака паставілі, так бы мовіць, на навуковую аснову. Тут рэгулярна праводзяць біяхімічны аналіз крыві жывёлы — для таго, каб вызначыць потым навукова абгрунтаваныя кармавыя рацыёны (дарэчы, гэтыя рацыёны, з дапамогай спецыяльных праграм, выдаюць камп'ютары); у сваю чаргу, праходзіць абавязковы папярэдні лабараторны аналіз і корм для жывёлы пры адкрыцці сянажных і сіласных траншэй. Асаблівая ўвага — на адпаведную збалансаванасць у кармах пажыўных рэчываў — збалансаванасць, якую прадпісвае ўсё тая ж навука. Тым больш, яна побач жа, нагадаем — у Горацкай сельгасакадэміі. Максімальная ўвага — утрыманню ў кармавым рацыёне бялку і цукру.

— Пачынаючы з надояў па 6—7 тысяч кілаграмаў за год, па-

Асаблівую, павышаную ўвагу на вытворчасць малака ў гаспадарцы звярнулі некалькі гадоў таму. Дарэчы, тут жа праілюструем гэты факт адпаведнымі лічбамі. У 2000 годзе (а якраз у гэтым годзе Аркадзь Галавасты і ўзначаліў гаспадарку) тут атрымлівалі ад каровы за год па 3400 кілаграмаў малака, летась атрымалі каля 6700 (гэта ў сярэднім, а на асобных фермах надаілі і па 8 тысяч кілаграмаў). Летась жа, як падкрэсліваюць тут, асабліва папрацавалі над якасцю — тут і раздзяленне малочных патокаў з розных фермаў, і ўстаноўка новага, сучаснага малакаправоднага абсталявання, дадатковых халадзільных ёмістасцяў, і строгі лабараторны кантроль на фермах. А ў выніку 50 працэнтаў малака прадалі з адзнакай «экстра», 47 працэнтаў — вышэйшым гатункам і толькі 3 працэнты — першым гатункам. І ўжо толькі гэта прынесла гаспадарцы каля 20 працэнтаў дадатковай выручкі, прычым рэнтабельнасць малака склала 38 працэнтаў. А гэта вельмі высокі паказчык. І яшчэ дзве лічбы леташняга года: пры амаль той жа колькасці малочнага статка гаспадарка «Горы» рэалізавала летась малака на 450 тон больш, чым у папярэднім годзе; на 9 працэнтаў павысілася яго таварнасць (паказчык таварнасці адлюстроўвае суадносіны паміж усім малаком, якое атрымалі ў той ці іншай гаспадарцы, і колькасцю малака, што было менавіта прададзена).

* * *

Варта асобна зазначыць: а лічыць у гаспадарцы, безумоўна, умеюць няблага. Далучылі да яе напрыканцы мінулага года суседнюю гаспадарку, у якой найбольш асязальным вынікам яе работы стала вялізная куча даўгоў; толькі аднаму Горацкаму масласырзаводу запазычылі каля паўмільярда рублёў. Карацей кажучы, нават на выгадным, добра запатрабаваным малацэ не змаглі зарабіць. Безумоўна, далёка не лепшы пераднавагодні падарунак паднеслі вышаць іх далей усё цяжэй і цяжэй. Але дзякуючы менавіта добрай збалансаванасці кармавога рацыёну, наяўнасці ў ім у дастатковай, патрэбнай колькасці бялку і цукру рабіць гэта можна, — зазначае кіраўнік гаспадаркі. А таксама дадае: — Усё гэта ўваходзіць у паняцце «інтэнсіўная жывёлагадоўля», пра што цяпер нярэдка можна пачуць і метады якой (гэта значыць інтэнсіўнай жывёлагадоўлі) гаспадарка бярэ сёння на ўзбраенне. І працаваць у гэтым кірунку яшчэ ёсць над чым...

Безумоўна. Калі з вытворчасцю малака ў гаспадарцы справа наладжана няблага і тут мяркуюць атрымліваць яшчэ большае малако, то з вытворчасцю мяса (ялавічыны) не ўсё так бліскуча. Так, у пазалеташнім годзе вытворчасць мяса прынесла 1,5 мільярда рублёў страт. Але і тут ёсць пэўны прагрэс: летась гэтыя страты былі ўжо намнога меншымі — паўмільярда рублёў. Але ж усё роўна — страты. Меры па пераадоленні стратнасці ў гэтай галіне наступныя: павелічэнне штосутачных прываг, выкарыстанне выключна сваіх, больш танных кармоў (дарэчы, у гаспадарцы набылі свой, усталяваны на грузавым аўтамабілі камбікормавы міні-завод) і іншыя меры.

— Сёлета паставілі задачу спрацаваць з вытворчасцю мяса «па нулях» і нават выйсці на невялікую рэнтабельнасць, — падкрэсліў кіраўнік гаспадаркі. — Пэўныя меры намечаны, дынаміка павінна быць станоўчай...

яны ў сваёй гаспадарцы (г.зн. далучанай) летась ніводнай тоны экстра-малака не здалі, толькі першым гатункам... Мы ўжо адразу разабраліся з іх малочным статкам, рассартавалі яго, навялі элементарны парадак, і вось вынік — ужо 70 працэнтаў малака з гэтай гаспадаркі здаецца гатункам «экстра», астатняе — вышэйшым гатункам. Палічым: раней там зарабляліся за дзень на малацэ, здаючы яго першым гатункам, 6 мільёнаў рублёў, а цяпер — 7 з паловай. А за месяц — гэта 45 мільёнаў. Гэта ж немалыя грошы. Да таго ж там атрымалі і немалую штодзённую прыбаўку малака — каля 1600 кілаграмаў, і гэта яшчэ адзін плюс. А за кошт чаго прыбаўка? Сталі як належыць даглядаць ды карміць жывёлу...

Аказваецца, раней у гэтай, далучанай, гаспадарцы нават не было каму даіць кароў — штодзень прывозілі для гэтага так



званы «кантынгент» з размешчанай непадалёк калоніі. А якія могуць быць адносіны да справы ў «кантынгенту», прычым да чужой справы?.. Затое пры колькасным складзе гаспадаркі ў 128 чалавек каля 30 сядзелі ў канторы ды розных іншых, больш дробязных канторках. І ўсе, вядома, атрымлівалі заработную плату. І абавязкова своечасова. А як жа іначай? Не выдадуць своечасова — тут жа спытаюць за гэта з каго трэба, і ў першую чаргу з кіраўніцтва райвыканкама. Вось і заклапочаны былі гэтым перш за ўсё ў райвыканкамеды райсельгасупраўленні... Адстае гаспадарка — ёй і дапамогі, і субсідыі розныя. І ў першую чаргу, і больш, чым іншым... Вось такая карціна (далёка не маслам) назіралася раней у далучанай гаспадарцы (і, дарэчы, вельмі знаёмая карціна). Такія прыклады — далёка не адзінкавыя ў нашай рэчаіснасці. А кароў доіць «кантынгент»... Дакладней — даіў, бо, зразумела, у гаспадарцы «Горы» мірыцца з такім становішчам не сталі.

Завяршаючы гэтую тэму, удакладнім: цяпер той, далучанай, гаспадаркай кіруюць толькі 2 чалавекі. Замест ранейшых 30. Вось бы паўсюль так дзейнічалі, бо і ў наш, як быццам прагрэсіўны, час тых кіраўнікоў рознага рангу нават больш, чым было раней.

САЛОМА ЯК ЗАМЕННІЦА ВУГЛЕВАДАРОДАЎ

Аднак адзначаная тэма для зусім іншых сюжэтаў. Мы ж прадоўжым аповед пра нашу гаспадарку. Пры гэтым адзначым: эканомія яўна пранізвае ўсю яе дзейнасць. Тут нават салому эканомяць. Так, тую салому, якая нямала ў каго звычайна застаецца пасля ўборкі гніць на полі. Праўда, прагрэс прыйшоў і сюды: спачатку згорнуць у цюкі і ўжо потым пакідаюць гніць, прычым, каб не вельмі кідалася ў вочы, — дзе-небудзь пад прыдарожнымі кустамі...

Да ўвагі такіх гаспадарнікаў: у гаспадарцы «Горы» саламянымі цюкамі ўжо больш за 6 гадоў сушаць збожжа. Усё проста: закінулі гэты цюк у спецыяльна абсталяваную топку збожжасушылкі — і атрымлівай неабходныя для працэсу калорыі.

— Дык вам жа ў выніку не хопіць саломы для падсцілкі жывёле, — кажу кіраўніку гаспадаркі.

— А давайце палічым, — адказвае яўна спрактыкаваны ў гаспадарчай арыфметыцы кіраўнік. — У сярэднім на высушванне збожжа ў нас спальваецца прыкладна 100 тон саломы, а яе мы маем, напрыклад, пры збожжавым вале 12 тысяч тон 6 тысяч тон. Колькі яшчэ застаецца? Пры гэтым зазначу: 4 кілаграмы саломы замяняюць адзін кілаграм пячнога паліва, якое атрымліваюць пры перагонцы той жа дэфіцытнай нафты...

— І колькі такім чынам зэканомілі менавіта вуглевадародаў?

— Ды шчыра сказаць, для нас гэта ўжо звычайная справа, і мы спецыяльна не займаліся такімі падлікамі. Тым больш, і расходаванне саломы на сушылках апошнім часам рознае: на адной з іх сталі эканоміць...

А сталі эканоміць, мадэрнізаваўшы гэту сушылку, павялічыўшы таўшчыню яе цагляных сценак. А ў выніку на 30 працэнтаў спальваюць менш. Застаецца дадаць: знайшла практычнае прымяненне гэтая прагрэсіўная і такая актуальная тэма пры непасрэдным удзеле спецыялістаў Горацкай сельгасакадэміі. Але ж і ў гаспадарцы не спалі ў шапку і з відавочнай карысцю для сябе і для агульнай справы выкарысталі гэтае навуковае суседства.

КАБ КОЖНЫ ГАСПАДАРОМ СЯБЕ АДЧУВАЎ...

Ужо, здаецца, адышлі ў няблізкае мінулае такія паняцці, як «гаспадарчы разлік» і «самафінансаванне»; нагадаем — яны былі ў модзе пры савецкім часе...

Ды не, не адышлі — жывуць. І няблага служаць ужо сучаснай практыцы... Гаспадарка «Горы» структурна разбіта на тры вытворчыя кааператывы (а ўжо хутка, у сувязі з далучэннем суседняй адсталай гаспадаркі, іх будзе чатыры). У кожнага кааператыва свая зямля, свае фермы, механізатары, тэхніка і г.д.; паводле параўнання Аркадзя Галавастага, кожны кіраўнік кааператыва — гэта свайго роду старшыня калгаса. Кааператывы — незалежныя пры планаванні сваёй штодзённай работы, хіба што ў пэўнай меры ўлічваюць рэкамендацыі агульнай планёркі. Разам з тым, для іх існуе адзіны фінансавы і справаздачны цэнтр, за кожным кааператывам замацаваны свой бухгалтар, які ўлічвае ўсе яго выдаткі і прыбыткі. Зароблены грошы — таксама іх, кааператываў, пры гэтым яны пералічваюць з зароблена сродкі на ўтрыманне канторы гаспадаркі, яе кіраўніцкага персаналу, а таксама на рамонт тэхнікі, запасныя часткі і іншыя агульныя для ўсёй гаспадаркі патрэбы. Карацей кажучы, як у тым ці іншым кааператыве папрацавалі, так і атрымалі.

— А пры гэтым, няйначай, спрашчаецца агульнае кіраўніцтва ўсёй гаспадаркай? — кажу яе кіраўніку.

— Гэта так. Але такая структурная арганізацыя ў першую чаргу скіравана на тое, каб чалавек гаспадаром сябе адчуваў, а адсюль мы маем і павелічэнне вытворчасці. Увогуле, думаю, гэта неблагая альтэрнатыва цяперашняму фермерству; пры гэтым мы захоўваем буйнатаварнасць вытворчасці, якая (буйнатаварнасць), безумоўна, з'яўляецца прагрэсіўнай і якую мы не павінны парушаць.

* * *

У гэтым матэрыяле сказана далёка не пра ўсё, што мы ўбачылі і пачулі ў гаспадарцы і аграгарадку з гэтай ці то беларускай, ці то грузінскай назвай «Горы». Можна дадаць, што тут летась поўнасцю ўвялі ў строй новую сучасную МТФ і праектуюць яшчэ адну такую ж; што тут маюць добрую, таксама сучасную, тэхніку (дарэчы, гаспадарка прызнана лепшай у раёне па пастаноўцы гэтай тэхнікі на захоўванне на зімовы перыяд); абазначым і тое, што тут заклалі немалы малады сад; што тут плануюць узвесці на рацэ Быстрыца, якая працякае па землях гаспадаркі, сваю электрастанцыю...

А асобная тэма — гэта высокая насычанасць аграгарадка «Горы» сацыяльнымі аб'ектамі — клуб, бальніца, сталовая, 6 магазінаў і г.д. І нават школа рамёствaў. І нават свой этнаграфічны музей у сярэдняй школе. «У нас ёсць усё», — зазначалі ў гаспадарцы. І гэта, сапраўды, так.

Іван БАРАНОЎСКІ.

УНП 700246757.

НА ЗДЫМКАХ:

1. На тэрыторыі мехдвара пад навесам чакае свайго часу тэхніка гаспадаркі.

2. Дырэктар ЗАТ «Горы» Аркадзь ГАЛАВАСТЫ.

3. Гэта толькі частка шматлікіх узнагарод, якімі калектыў адзначаны за апошні час.

4. Загадчык майстэрні Леанід ПАЧТОВЫ.

5. Трактарыст Юрый ГАПЕЕНКА працуе на магутным пагрузчыку айчыннай вытворчасці.

6. У механічных майстэрнях рыхтуюць тэхніку да веснавых работ.

7. Малочная вытворчасць гаспадаркі аснашчана сучасным абсталяваннем. У гэтых ёмістасцях для малака за тэмпературай сочыць аўтаматыка.

8. Інфармацыя пра кармленне і даенне статка захоўваецца ў камп'ютары. На гэтым здымку вы бачыце намесніка дырэктара гаспадаркі Івана ЕМЯЛЬЯНАВА і начальніка вытворчага ўчастка Леаніда ШАКУНОВА за чарговымі разлікамі па ўтрыманні жывёлы.

9. Жывёлавода Аляксандра ШАВАЛДЗІНА фотааб'ектыў злавіў у інтэр'еры новай прасторнай жывёлагадоўчай фермы.

10. Гэтыя фотаздымкі зроблены ў мясцовым школьным музеі, які мае званне «народны». Загадчыца музея, былая настаўніца гісторыі Раіса МІРОНЧЫКАВА пазнаёміла нас з багатай экспазіцыяй і паказала экспанат, які прывезены наведнікамі музея, што прыехалі сюды з далёкай Чукоткі, — зуб маманта.

11. На новай вуліцы гаспадаркі.

Яўген ПЯСЕЦКІ (фота).

ПРАДПРЫМАЛЬНІКІ ДАНЯСУЦЬ НАЦЫЯНАЛЬНУЮ ПЛАТФОРМУ БІЗНЭСУ БЕЛАРУСІ-2011 ДА КОЖНЫХ ДЗВЯРЭЙ: І ЧЫНОЎНІЦКІХ, І ПРАДПРЫМАЛЬНІЦКІХ

Дзелавая супольнасць апублікавала праект Нацыянальнай платформы бізнэсу Беларусі 2011 — ён размешчаны у газеце «Саюз прадпрымальнікаў» і на сайтах бізнэс-асацыяцый. Як патлумачыў Уладзімір КАРАГІН, старшыня прэзідыума Рэспубліканскай канфедэрацыі прадпрымальніцтва, разам з апублікаваннем праекта стартуе і кампанія «Ад дзвярэй да дзвярэй», падчас якой тэкст праекта Нацыянальнай платформы бізнэсу Беларусі-2011 будзе дастаўлены валанцёрамі ў офісы беларускіх фірм, а таксама ў дзяржаўныя органы.

Асноўныя прыярытэтныя напрамкі рэфармавання дзелавога клімату краіны ў праекце платформы падзелены на сем раздзелаў: добрасумленная канкурэнцыя і роўныя ўмовы гаспадарання, правы ўласнасці і рост прыватнага сектара, падатковая сістэма і бухгалтарскі ўлік, дэбюракратызацыя і лібералізацыя, доступ да фінансаў і інавацыйнае развіццё, партнёрства і давер бізнэсу і ўлады. Такім чынам, усяго сфармулявана 101 пытанне, якія варта вырашыць для паляпшэння дзелавога клімату ў нашай краіне. Да 25 лютага бізнэс-асацыяцыі будуць ладзіць грамадскія абмеркаванні платформы бізнэсу (у тым ліку і ў рэгіёнах), прымаць прапановы і ўдакладненні ад усіх зацікаўленых асоб — прадпрымальнікаў, чыноўнікаў, эканамістаў, экспертаў і гэтак далей. Потым, 2 сакавіка будзе праведзена XII Асамблея дзелавых колаў, дзе пройдзе канчатковае абмеркаванне тэксту Нацыянальнай платформы бізнэсу Беларусі-2011 і яе зацвярджэнне. У выніку, з улікам усіх правак, тэкст платформы будзе надрукаваны асобнай кніжкай, якая, паводле слоў Уладзіміра Карагіна, будзе афіцыйна «ўручана Прэзідэнту, кожнаму міністру, кожнаму члену ўрада і кожнаму парламентарыю».

— Мы ўважліва паставімся і да прапаноў людзей, што працуюць у сістэме дзяржкіравання, якія таксама ўнясуць сваю лепту ў падрыхтоўку платформы, — падкрэсліў Уладзімір Карагін. — У чым асаблівасць падрыхтоўкі платформы гэтага года — што ўпершыню паралельна рыхтуецца тэкст пастановы ўрада з планам мерапрыемстваў па рэалізацыі Дырэктывы № 4. Можна сказаць, што ідзе ўзаемны працэс. Мы чакаем, што ад такой працы будзе вынік, і заклікаем, каб усе дзелавая супольнасць далучылася да гэтага працэсу — трэба прачытаць, вывучыць, унесці прапановы, прыняць удзел у абмеркаванні і ўключыцца ў рэалізацыю.

— У нас так склалася, што ўлада мае вельмі цяжкі дыялог з палітычнымі партыямі, з нашай экспертнай супольнасцю, але пры гэтым улада мае актыўныя стасункі з бізнэсам. І часта дастаткова лёсавызначальныя рашэнні прымаюцца якраз-такі з улікам парад бізнэсу, а не экспертаў, — кажа **Віктар Маргелаў, сустаршыня Рэспубліканскай канфедэрацыі прадпрымальніцтва.** — У гэтым плане наша платформа ўнікальная. Раней у нас былі асобныя прапановы, асобныя перамогі, асобныя паразы — пры гэтым дзелавую супольнасць папракалі ў недастатковым канструктывізме, сістэмнасці, настойлівасці. Так было, пакуль мы не зразумелі, што патрэбны дакумент, які быў бы кіруючай сілай для працы і пазіцыі дзелавой супольнасці. Не ведаю, наколькі гэта супадзенне, але з таго часу, як мы пачалі фарміраваць платформы, па сутнасці, у нас пачалася лібералізацыя эканамічных адносін, — сказаў Віктар Маргелаў пра важнасць платформы для бізнэсу і грамадства.

Пры стварэнні праекта Нацыянальнай платформы бізнэсу Беларусі дзелавая супольнасць улічвала і прынятую Дырэктыву № 4 «Аб развіцці прадпрымальніцкай ініцыятывы і стымуляванні дзелавой актыўнасці ў Рэспубліцы Беларусь»:

— Дырэктыву за адзін момант не рэалізуеш — гэта дакумент стратэгічны, над якім трэба працаваць працяглы перыяд. Наша платформа абнаўляецца кожны год і ўлічвае новую рэальнасць — уваходжанне Беларусі ў адзіную эканамічную прастору, у Мытны саюз, — тлумачыць **Аляксандр КАЛІНІН, старшыня Беларускага саюза прадпрымальнікаў.** — Мы ставім пытанні, якія не падымаліся раней: па падатковай сістэме былі рэалізаваны прапановы папярэдніх платформ, і мы атрымалі дастаткова простую падатковую сістэму, але застаўся высокі падатковы ціск — яго трэба выраўноўваць у рамках Мытнага саюза і адзінай эканамічнай прасторы: зніжаць стаўкі ПДВ, зніжаць адлічэнні ў фонд сацыяльнай абароны насельніцтва. Пытанні няпростыя, сацыяльныя, якія закранаюць рэформу пенсійнай сістэмы. У платформе ўлічваецца тое, што сітуацыя пастаянна мяняецца, мы там разглядаем новыя задачы, якія нельга ўнесці ў план мерапрыемстваў па рэалізацыі дырэктывы. Дарэчы, мы таксама бачым, што Дырэктыва № 4 не ўсімі чыноўнікамі ўспрынята і выконваецца — гэта трэба паказваць у платформе і знішчаць спробы асобных супрацоўнікаў дзяржапарату ініцыяваць новыя рэчы, якія супярэчаць дырэктыве. Нас насцярожвае рашэнне і механізм яго рэалізацыі па «Пінскдрэве», ёсць шмат пытанняў па выраўноўванні канкурэнцыі паміж дзяржаўным і недзяржаўным сектарам, вялікая праблема з бюджэтаёмістымі галінамі (напрыклад, адукацыяй і аховай здароўя), дзе праз цэнаснае рэгуляванне фактычна не даюць развівацца прыватнаму капіталу і гэтак далей. Мы спадзяёмся, што платформа будзе тым дакументам, які кансалідуе ўсе прадпрымальніцкія арганізацыі і з якім сур'ёзна папрацуе ўрад, — рэзюмаваў Аляксандр Калінін.

Дарэчы, варта адзначыць, што дзелавая супольнасць сапраўды на сёння аб'ядналася — 28 студзеня на пасяджэнні Кансультатыўна-каардынацыйнай нарады дзелавых супольнасцяў былі ўхвалены прапановы ў план мерапрыемстваў па рэалізацыі Дырэктывы № 4, прычым пад адзіным дакументам на 43 старонкі падпісаліся кіраўнікі вядучых бізнэс-аб'яднанняў: БСП, БСПН імя Куняўскага, БНПА, МССПіП, СЮА «РКП» і Савета па развіцці прадпрымальніцтва.

Разам з тым, нягледзячы на падпісаную кіраўніком дзяржавы дырэктыву, на сёлетні год, які абвешчаны годам прадпрымальнасці, і на платформу бізнэсу не ўсе дзяржаўныя органы добра разумеюць, чаго сапраўды хочацца айчыннаму бізнэсу:

— Пакуль ідзе працэс рэалізацыі Дырэктывы № 4 і падрыхтоўкі платформы, нараджаюцца новыя ініцыятывы. Да нас прыйшоў ліст з Нацыянальнага цэнтра заканадаўства і прававых даследаванняў Рэспублікі Беларусь, дзе апісваецца ініцыятыва Вярхоўнага суда: яны прапаноўваюць пры стварэнні камерцыйных арганізацый, незалежна ад формы ўласнасці, стварыць разам са статутным фондам яшчэ і спецыяльны фонд для кампенсацыі магчымых рызык, звязаных з іх дзейнасцю. Як лічыць Вярхоўны суд, стварэнне такога фонду дазволіла б мінімізаваць магчымыя негатыўныя наступствы дзейнасці камерцыйных арганізацый і ІП, — паведаміў Уладзімір Карагін пра новую ініцыятыву і выказаў сваё меркаванне на гэты конт. — Зараз кожнаму прапануецца «змярцвіць» дзясяткі, сотні мільярдаў рублёў, каб мець нейкі запас на выпадак, калі нешта адбудзецца. Гэтую ініцыятыву нават цяжка ацаніць, гэта нейкая недарэчнасць з пункту гледжання эканомікі, калі ў прадпрыемстваў не хапае абаротных сродкаў.

Сёння Мінскі сталічны саюз прадпрымальнікаў і працадаўцаў ужо напісаў адказ у Нацыянальны цэнтр заканадаўства і прававых даследаванняў Рэспублікі Беларусь, дзе выказана меркаванне, што такая ініцыятыва па абавязковым стварэнні «спецыяльнага фонду кампенсацыі магчымых рызык» адмоўна адаб'ецца на ўсіх суб'ектах гаспадарання, бо вядзе да неапраўданага замарожвання абаротных грашовых сродкаў, а значыць, павелічэння сабекошту тавараў (выкананых прац, паслуг) і падрыву платаздольнасці і канкурэнтаздольнасці беларускіх прадпрымальнікаў.

— На жаль, такія прапановы працягваюць паступаць. І вельмі добра, што Нацыянальны цэнтр заканадаўства і прававых даследаванняў Рэспублікі Беларусь адпраўляе дакументы нам на экспертызу, — кажа Уладзімір Карагін. — Але ж некаторыя дакументы могуць нас і абмінуць, бо пакуль сістэма абавязковай экспертнай ацэнкі не ўся склалася.

Павел БЕРАСНЕЎ.

ДУМКА З КАНВЕРТА
«...Многія любяць спасылацца на рэферэндум — маўляў, народ рашыў. Але як ён рашыў? Ці ўчытаўшыся ў тыя пытанні, ці падумаўшы аб наступствах? Мне здаецца, не. Проста «падмахнуў» — і ўсё. Але ж далей была работа так званай эліты — дэпутатаў, людзей адукаваных. Няхай бы ж яны сказалі: «Добра: двухмоўе, але прыярытэт — беларускай: на ёй размаўляем, на ёй вядзем справаводства... І ўсё б тады стала на месцы. Аднак яны, як сякеру пад лаўкай, знайшлі сумнавядомае «або» і ім цяпер прыкрываюцца».
А. ГОЛУБ, *г. Бабруйск*

Кніжны кірмаш

ГУЛЬНЯ ПА ЎЛАСНЫХ ПРАВІЛАХ, альбо Літаратура ад беларускіх аўтараў

Сёлета на Мінскім міжнародным кірмашы беларускія пісьменнікі мелі магчымасць паказаць сябе і прадставіць свае кнігі. Альгерд Бахарэвіч, напрыклад, адзін з тых нашых аўтараў, якія выдатна ўпісаліся ў еўрапейскі кантэкст і ўласна прадстаўляюць беларускую літаратуру за мяжой — Бахарэвіч жыве ў Германіі. Але ў гэтыя дні ён меў магчымасць прадставіць асабіста айчыннаму чытачу кнігі «Халоднае сэрца», «Праклятыя госці». Ды заадно ў гэтыя дні ён паспеў прэзентаваць кнігу перакладу нямецкай пісьменніцы Катрын Шміт «Ты не памрэш». Тым часам як творы і самога Альгерда Бахарэвіча чытаюць па-нямецку...

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

— Кніга «Сарока на шыбеніцы» выйшла ў Лейпцыгскім выдавецтве. Перакладчык сам падышоў да мяне на кніжным кірмашы. Сказаў, што ведае пра мяне, як пра аднаго з цікавых беларускіх аўтараў, хацеў паспрабаваць што-небудзь перакласці. Я прапанаваў «Сароку на шыбеніцы», — распавёў аўтар на творчай сустрэчы. — Зараз я яе прадстаўляю, прэзентую, езджу па краіне. Апошнім часам рыхтую «Медычную энцыклапедыю» — на кожную літару якая-небудзь хвароба даследуецца. Кніга ад доктара Бахарэвіча... А яшчэ я прапанаваў сваё апавяданне часопісу «Белавія» — яго звычайна можна знайсці ў самалёце пад крэслам, пачытаць, пакуль ляціш.

— Кнігі якіх пісьменнікаў вас прыцягваюць, што хацелася б іх перакласці на беларускую мову?

— Хачу перакласці і выдаць казкі братоў Грым. Дзесьці 200 казак. Прычым найбольш блізка да арыгінала, нічога не ўпрыгожваючы. Выдатныя казкі, часам дзіцячыя...

У Беларусі, насамрэч, зараз перакладніцкі бум. Шмат робіцца перакладаў, але і гэта... кропля ў моры. У Германіі перакладаюцца амаль усе больш-менш цікавыя творы, што выходзяць у свеце...

— Што натхняе пісьменніка Бахарэвіча?

— Гэта вялікая таямніца, загадка, што натхняе на творчасць. Павінна быць у жыцці нейкая таямніца, не на ўсё можна знайсці адказ. Але я ведаю, што літаратура — гэта тое, чым я хацеў бы займацца. Я не ўяўляю сябе ні ў якой іншай ролі. Неяк я казаў, што для творчасці неабходна жаданне гуляць па ўласных правілах. Але гэта хутчэй матыў. Хочацца гуляць па тых правілах, якія ты сам усталёўваеш. Для мастака, музыкі, чалавека тэатра гэта найперш важна.

— Хто ваш чытач? Ці ўплывае на самаадчуванне пісьменніка наклад, якім выдаецца яго кніга?

— Мне ў творчасці важна атрымаць свой кайф. Мне цікава мастацтва. Я разумею, што добрая літаратура абсалютна ніколі не будзе любімая ўсімі. На тое яна і добрая. Таму што літаратура — элітнае мастацтва. Для самых разумных, самых чулых людзей — тых, хто здольны ўспрымаць тонкія рэчы. Наклады, пераклады, ганарары ўплываюць на самаадчуванне і жыццё аўтара нейкім чынам. Але за ўсе свае ганарары і пераклады я ўсё адно не змог бы ўтрымліваць сям'ю.

— Для вас важныя ўмовы, у якіх пісаць? Ці ёсць у вас распарадак, згодна з якім вы працуеце? Ці заўсёды вы задаволены сваімі творамі?

— Раней у мяне быў асобны пакой, дзе я мог сядзець і пісаць. Але цяпер у мяне падрасла дачка, і пакой перайшоў ёй. Я не належу да тых пісьменнікаў, якія пішуць штодня і ўвесь час. Я магу пісаць доўга, доўга, доўга, працаваць увесь дзень, ці шмат дзён запар. А потым, калі праца скончана, магу некалькі месяцаў адпачываць і не пісаць нічога. Гэта, відаць, ад арганізма залежыць. Магу доўга зусім нічога не пісаць.

Калі я гляджу на ранейшыя свае творы, то, як правіла, думаю, што цяпер такога не пісаў бы. Я звычайна прадумваю кнігу наперад, прапрацоўваю сюжэт, для мяне, прынамсі, вельмі важна, як завуць маіх герояў. Але ў выніку кожны мой тэкст, мая кніга выглядае не так, як задумвалася. І кампазіцыя мяняецца, і канчаецца ўсё не так...

Відаць, толькі геніі здольныя, як Набокаў — пісаў на картках, мог пачаць з сярэдзіны, а потым тасаваў, і ўсё складвалася ў адзіную карціну. Я не геній... Я пішу ад пачатку, праўда, люблю вяртацца да таго, што ўжо напісана, і вельмі часта перарабляю...

— Якія беларускія аўтары падабаюцца вам?

— Практычна ўсе яны мае сябры, добрыя знаёмыя... Іх кніжкі — тут. Са старэйшага пакалення, якое для мяне пачынаецца з Алеся Разанава, паэзія самога Разанава, далей Адам Глобус, Андрэй Хадановіч, Марыйка Мартысевіч. Заўсёды падабаецца тое, што піша Валянцін Акудовіч, шчыра паважаю гэтага чалавека, філосафа. Я яго да «чыстых літаратараў» не адношу. Лічу, што незаслужана недаацэнены Ілля Сін. Падабаецца паэзія Вольгі Гапеевай, Віка Трэнас вельмі цікавая паэтка. Сяржук Мінскевіч падаецца цікавым. Наша літаратура насамрэч вартая ўвагі. Нармальная еўрапейская моцная літаратура. Асабліва тая, што ёсць у цяперашні час. Але я лічу, што вялікай літаратуры мы ніколі не мелі. Трэба разумець, што не кожны народ мае вялікую літаратуру, і ў нас не не было. Не трэба паводзіць сябе так, нібыта ў нас была вялікая літаратура і мы яе страцілі. Мы павінны ісці іншым шляхам. Шляхам... албанцаў. Хто з нас можа назваць якога-небудзь албанскага пісьменніка?.. Мы павінны прасоўваць сваю літаратуру. Мы яшчэ ў самым пачатку гэтага шляху. Я лічу, што да беларускай літаратуры належаць творы, якія напісаныя па-беларуску. Тое, што напісана па-руску, трэба адносіць да вялікай рускай літаратуры.

Я, насамрэч, вельмі хачу пісаць на дасканаляй беларускай мове. Але калі ёсць нейкія памылкі, нейкія жарганізмы, то гэта можа ўспрымацца цікавей. Тым не менш, імкнуся ўдасканальваць беларускую мову.

— Пажыўшы за мяжой, вы, магчыма, паглядзелі на сябе з іншага боку і на сваю родную краіну?

— Я магу сябе вызначыць у трох катэгорыях. Па-першае, я анархіст: не адчуваю цікавасці да ўлады. Я пасвойму нацыяналіст, таму што хачу, каб Беларусь мела свой нацыянальны грунт, каб беларуская мова была адзінай дзяржаўнай. Я за тое, каб Беларусь была адкрытая для ўсіх, для ўсяго свету. Але калі прыязджаеш сюды — вучы беларускую мову, гісторыю, інтэгруйся ў беларускае грамадства. Я за тое, каб была адкрытая еўрапейская дэмакратычная краіна. І па-трэцяе, я ліберал, таму што лічу: там, у Еўропе, наша месца, незаслужана страчанае намі калісьці...

Запісала Ларыса ЦІМОШЫК.

Сябры Беларусі

ЖЫЦЦЁ І СПРАВЫ БЕЛАРУСАФІЛА ХМЯЛІНЬСКАГА

На шчасце, узровень адносін паміж краінамі і народамі вызначаюць не толькі палітыкі і палітыканы. Нават калі афіцыйныя адносіны паміж дзвюма дзяржавамі пачынаюць «іскрыць» у публічнай рыторыцы іх высокапастаўленых чыноўнікаў, як зараз бачна на прыкладзе Польшчы і Беларусі.

Але гэтае пахмурненне ў адносінах не можа перашкодзіць імкненню народаў да добрасуседства і дружбы. І што цікава — заўсёды знаходзяцца людзі, якія добраахвотна ўскладаюць на сябе цяжар мэтанакіраванага развіцця і паглыблення супрацоўніцтва паміж краінамі ў не заўсёды спрыяльных умовах. Да такіх сапраўдных беларусафілаў, безумоўна, адносіцца прафесар Вышэйшай школы прадпрымальніцтва і кіравання з польскага горада Лодзь Баляслаў Хмяліньскі. Любоў да Беларусі ў прафесара Хмяліньскага — гэта не толькі і не столькі катэгорыя эмацыйная. Яна — дзейсная. Па самым вялікім рахунку. Вось ужо амаль 19 гадоў пан Хмяліньскі ўзначальвае таварыства «Польшча—Беларусь». Больш за тое, ён гэтае таварыства і стварыў «з нуля» разам з групай аднадумцаў, распрацоўваў статут і праграмы яго дзейнасці.

Унікальнасць асобы старшыні таварыства «Польшча—Беларусь» і ў тым, што напрацоўкі створаных ім грамадскай арганізацыі ляглі ў аснову яго доктарскай дысертацыі, якую ён некалькі гадоў таму бліскуча абараніў. І зрабіў гэта ў Беларускім дзяржаўным універсітэце. Таму можна смела сказаць, што Беларусь для польскага прафесара — гэта справа ўсяго жыцця. А на факультэце міжнародных адносін БДУ, які «апекаваў» яго падчас абароны дысертацыі, пан Хмяліньскі даўно лічыцца сваім чалавекам, часта тут бывае. Вось і нядаўна вучоны сустрэўся са студэнтамі і выкладчыкамі факультэта і прачытаў лекцыю на тэму «Народная дыпламатыя ў польска-беларускіх дачыненнях». У сваёй лекцыі прафесар расказаў і аб арганізацыі супрацоўніцтва паміж польскімі і беларускімі вучонымі, навучальнымі ўстановамі. Толькі двухбаковых навуковых канферэнцый за гады існавання таварыства адбылося трыццаць. У польскіх ВНУ працуе 100 выкладчыкаў з Беларусі і навучаецца 2500 студэнтаў.

Слухачы таксама атрымалі вельмі карысную інфармацыю аб тым, як дзейнічае ў Польшчы так званы «трэці сектар», да якога, як вядома, адносяцца няўрадавыя арганізацыі. А іх у Польшчы — у што цяжка паверыць — каля ста тысяч! І амаль 700 з іх у рознай ступені супрацоўнічаюць з нашай краінай. І, вядома ж, у авангардзе гэтага супрацоўніцтва — таварыства «Польшча—Беларусь». Падобных грамадскіх арганізацый у суседняй краіне шмат, ёсць, у прыватнасці, таварыствы «Польшча—Расія», «Польшча — Украіна» і т. п. Аднак таварыства, якое ўзначальвае прафесар Хмяліньскі, можна сказаць без перабольшвання, «дае фору» іншым. Ні з адной краіны не прыязджае ў Польшчу так шмат прафесійных артыстаў, народных калектываў, прадстаўнікоў творчых прафесій, як з Беларусі. І большасць такіх гастроляў арганізуе і курыруе таварыства «Польшча—Беларусь». А колькі дзелавых, карысных сустрэч беларускіх і польскіх бізнэсменаў арганізавала таварыства! І ў тым, што, нягледзячы на палітычныя праблемы, беларуска-польскае эканамічнае і гандлёвае супрацоўніцтва пастаянна развіваецца, ёсць немалая заслуга грамадскай арганізацыі, якую ўзначальвае пан Хмяліньскі.

Вялікую дапамогу аказвае таварыства і па ліквідацыі наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС. За мінулыя гады сотні беларускіх дзяцей палепшылі сваё здароўе ў суседняй Польшчы дзякуючы намаганням таварыства. Прадмет асаблівага гонару прафесара Хмяліньскага — алімпіяда па беларускай мове, якая рэгулярна праводзіцца ў Польшчы. Школьнікі з суседняй краіны спаборнічалі ў веданні мовы суседняй тытульнай нацыі ўжо 13 разоў. Удзельнікі алімпіяды па беларускай мове маюць такія ж паўнамоцтвы, як і ўдзельнікі алімпіяд па англійскай ці французскай мовах. Так, за час існавання алімпіяды 500 яе ўдзельнікаў, згодна з існуючым рэгламентам, былі без экзаменаў залічаны ў вышэйшыя навучальныя ўстановы. Многія з іх былі ўзнагароджаны экскурсійнымі паездкамі ў нашу краіну.

Напарадзе ў таварыства, як сказаў прафесар Хмяліньскі, — цікавыя і канкрэтныя планы дзейнасці. Яно ўжо рыхтуецца адзначыць дваццацігоддзе стварэння незалежнай беларускай дзяржавы, а таксама дваццацігоддзе ўсталявання дыпламатычных адносін паміж Беларуссю і Польшчай. А потым яшчэ адзін юбілей — дваццаць гадоў таварыства «Польшча—Беларусь».

Міхаіл БАЦЯН,
старшы выкладчык факультэта міжнародных адносін БДУ.

З людзьмі і сам-насам

НОВЫЯ ЛІСТЫ ПРА ГАЛОЎНАЕ

«Звязда», мне здаецца, адзіная газета, якая рэгулярна і прынцыпова (што так важна ў сучасным становішчы) уздымае праблему захавання мовы. Бо любому вядома: жыве мова — жыве народ. Гэта значыць, беларусы, як нацыя...».

Чарговая цытата, з чарговага ліста, агляд якіх хочацца пачаць зноў жа з цытат — з вызначэння, што такое нацыя. Паводле «Словаря русского языка», нация — это исторически сложившаяся устойчивая общность людей, возникшая на базе общности языка, территории, экономической жизни и психического склада, проявляющегося в общности культуры». Паводле «Тлумачальнага слоўніка беларускай мовы» (адчуйце розніцу!) — «гістарычная супольнасць людзей, якая склалася падчас фарміравання агульнасці іх тэрыторыі, эканамічных сувязяў, мовы, культуры, псіхалагічных рыс».

Тая ж Матрона толькі ў іншай спадніцы? Так — выбітны рускі вучоны Ожагаў спачатку паставіў «общность языка» (усё астатняе — потым), выбітны беларускі — Крапіва — якраз мову... пасунуў. Самахоць? Не хочацца думаць: «быў час, быў век, была эпоха...».

Як не хочацца і верыць, што гэта — ужо назаўжды.

Больш за 30 гадоў я пражыў у Расіі, — піша **спадар СПІРЫДОВІЧ з г.п. Івянец, Валожынскага раёна.** — І, безумоўна ж, увесь гэты час не чуў, не размаўляў і не пісаў па-беларуску. На пачатку 90-х вярнуўся дамоў, у першы ж дзень паехаў у Масюкоўшчыну і ў аўтобусе, амаль усю дарогу, міжволі слухаў размову двух вайскоўцаў. Зацікавіла не тэма яе, а мова: афіцэры (!) размаўлялі па-беларуску (!). Прычым не на трасянцы, а, наколькі я разумею, на добрай літаратурнай мове. Для мяне гэта было настолькі нечакана, настолькі прыемна, што я паверыў: зрухі да адраджэння — мовы, культуры — абавязкова будуць! Трэба і мне ўспамінаць сваю родную.

Першае, што зрабіў, — дзеліцца досведам чытач, — выпісаў «Звязду», прыдбаў слоўнікі. І, як кажуць, на сабе праверыў: вывучыць мову можна ў любым узросце, трэба толькі пажадаць, праявіць упартасць і адчуць падтрымку. Тады, у пачатку 90-х, яна была. Мне, як старшыні камітэта грамадскага самакіравання, часта даводзілася прысутнічаць на сесіях дэпутатаў Фрунзенскага раёна сталіцы, на пасяджэннях райвыканкама. Тагачасны старшыня імкнуўся весці іх выключна па-беларуску. Тое ж, ведаю, адбывалася і ў Мінскім гарвыканкаме, нават яшчэ вышэй. Па-беларуску пачыналі размаўляць з людзьмі чыноўнікі апаратаў... Яшчэ б крыху... І тады б наша мова нізавошта не апынулася ў сённяшнім стане! Аднак прайшоў рэферэндум, потым дэпутаты Палаты прадстаўнікоў сказалі сваё «або».

Яны мелі на ўвазе раўнапраўе? Нарэшце ці! Бо яно прымушала б на абедзвюх мовах прымаць усе законы, на абедзвюх — весці выкладанне ва ўсіх навучальных установах, на абедзвюх пісаць усе назвы вуліц і прадпрыемстваў і г.д. Гэта, што відавочна, улятала б у добрую капеечку з бюджэту, а ён не гумовенькі... Магчыма, таму і з'явіўся гэты злучнік «або», які прывёў — ужо — да фактычнага знікнення мовы, а можа прывесці і да знікнення краіны... Тое, што атрымаецца, можна будзе назваць Белай Руссю... Грамадзян адпаведна — белымі русічамі... Сорамна, брыдка! Так і хочацца крыкнуць на ўсю Беларусь: «Людзі, што ж мы нарабілі?!». І што цяпер нам рабіць з гэтай спадчынай?...

— Шляхі ёсць, — піша спадар Спірыдовіч, і называе іх. Ну, па-першае, грамадзяне краіны, згодна з дзейным заканадаўствам, могуць ініцыяваць правядзенне новага рэферэндуму.

(Аднак — заўважым, перапыніўшы падпісчыка — на вынікі яго спадзявацца цяжка. Хутчэй за ўсё людзі, заклапочаныя сваімі штодзённымі праблемамі (ростам цэн, здароўем, жыллём і г.д.), зноў нешта «падмахнуць», не абцяжараючы сябе думкамі, што канкрэтна і якія будуць наступствы, не захочуць «лішняга клопату» — яшчэ і пра мову).

Ёсць у спадара Спірыдовіча спадзяванні і на дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў новага склікання. «Толькі ўсім нам, — піша чытач, — на будучых выбарах трэба галасаваць выключна за тых з кандыдатаў, якія размаўляюць па-беларуску. Тады, маўляў, абраныя, магчыма, унясуць папраўкі ў Закон аб мовах, зробяць двухмоўе сапраўды раўнапраўным, а з цягам часу і наогул адменяць яго на карысць беларускай.

(Яшчэ раз скажам сваё «аднак», бо на выбары таксама спадзявацца цяжка: людзі за рэдкім выключэннем, — па сабе ведаю, на сабе адчуваю — не любяць тых, хто размаўляе па-беларуску. Ды і каб добра размаўляць...

Спадар САЎКО з Барысава *ў сваім лісце ўзгадвае выкладчыкаў лінгвістычнага ўніверсітэта, якія, жывучы ў адным інтэрнацкім пакоі, тыдзень размаўлялі па-нямецку, тыдзень па-англійску, каб не страціць навыкаў. Адкуль тыя навыкі ў нас, калі мы не толькі не размаўляем на роднай мове, але і не чуем яе? Каляжанка неяк расказвала пра сваю маладзенькую беларускамоўную суседку... Гады тры таму яна выйшла замуж, з'ехала (не, не за межы краіны — проста ў іншы мікрараён)... Нядаўна яны сустрэліся, адна адну прызналі, але размаўлялі ўжо на розных мовах: дзяўчына даўно забылася на сваю прынцыповую беларускасць і, як падалося, зусім не шкадуе — пройдзены этап).*

ДУМКА З КАНВЕРТА
«Добра, што людзі запомнілі госцю з Эстоніі, якая выступала на Народным сходзе. У яе і сапраўды быў павучальны выступ...»
С. БАРЫСЕВІЧ, *г. Мінск*

Зрэшты, вернемся да ліста: «З прапановамі па праблемах двухмоўя нам, грамадзянам Беларусі, трэба звяртацца да дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў, якіх мы выбіралі. Менавіта яны прымаюць законы, уносяць у іх папраўкі, змяняюць. Упэўнены, — піша спадар Спірыдовіч, што калі б такіх заваротаў было тысячы, дзясяткі тысяч, былі б і змены. Руская мова магла б быць дзяржаўнай у Беларусі, але ў тым выпадку, калі б не было сваёй. А так... Няхай людзі карыстаюцца ёй у паўсядзённым жыцці, няхай яна служыць як мова міжнацыянальных зносін. А дзяржаўнай павінна быць беларуская.

Аб гэтай моўнай праблеме, — упэўнены чытач, — трэба больш пісаць, гаварыць у СМІ — у іншых газетах і часопісах, па радыё, тэлебачанні. Чаму яно ў нас рускамоўнае? Няўжо ні ў аднаго з кіраўнікоў Белтэлерадыёкампаніі не баліць душа за першую з дзвюх дзяржаўных? Чаму маўчаць тэлежурналісты? Яны ж, відаць, вучылі беларускую? І любілі? Няўжо гэта ўсё ў мінулым?»

Спадар НЕСЦЯРОВІЧ з Лагойска, здаецца, не згодны. Ён піша, што ў яго асабіста з'явіўся хоць нейкі прабліск надзеі з выхадам новага міністра культуры, новага старшыні Белтэлерадыёкампаніі. «Больш паважліва да роднай мовы ставяцца цяпер і ў нашай абласной газеце «Мінская праўда», — піша чытач. — Але гэтага мала, па-ранейшаму амаль поўнасцю абруселымі застаюцца вядучыя рэспубліканскія і мясцовыя газеты. Мяркую, прынамсі, па сваёй раёнцы. Мне ў рэдакцыі кажуць, што рускамоўнасць — гэта ў інтарэсах падпісчыкаў: ад яе залежыць тыраж. Я ў такім выпадку прыводжу контраргумент: у 80-х тая ж раёнка «Родны край» выдавалася на мове гэтага самага краю і мела тыраж больш за 8 тыс. асобнікаў. Зараз, калі газета стала на дзвюх мовах і, пераважна, на рускай, — ён удвая меншы.

...Поўнасцю згодны, — піша чытач, — са спадаром Дубовікам з Бярэзіншчыны аб наспелай (бо адступаць няма куды) неабходнасці распрацоўкі і шырокага абмеркавання Закона аб абароне роднай мовы. А яшчэ, каб адбыўся істотны зрух у справе яе ратавання, трэба наступны каляндарны год аб'явіць Годам роднай мовы. Яна вартая таго, каб упэўнена заняць пачэснае месца ў суквецці моў свету. Найперш славянскіх. Лёс яе павінен вырашацца на дзяржаўным узроўні. Клопат пра яе павінны ўзяць на сябе кіраўнікі. І калі яны самі ў сваёй практычнай дзейнасці, у паўсядзённым жыцці звернуцца да мовы тытульнай нацыі, то гэта дадасць ім толькі прэстыжу і прызнання ў вачах грамадства. Што да «Звязды», — вітаю яе непахісную пазіцыю ў абароне нашай, першай дзяржаўнай.

Ёсць у пошце і іншыя думкі, іншыя меркаванні, на якіх нельга не спыніцца, хаця б таму, што яны, як падаецца, ухваляючы пазіцыю газеты, утрымліваюць сур'ёзную крытыку. У лісце **Юрыя ТАРАСЕВІЧА з Гродна** — што ні радок, то папрок, прынамсі... Ёсць, што сказаць на кожны. Таму па парадку (з невялікімі скарачэннямі). І адказамі — у дужках.

— Пахвальна, — піша Юрый, — што «Звязда» друкуе матэрыялы ў абарону мовы. Было б яшчэ лепш, калі б газета сама з беларускай абыходзілася больш паважна. *(Слушная заўвага).* Ніхто не патрабуе ад журналістаў надта якаснай літаратурнай мовы *(дзякуй!)*, але тое, што даводзіцца бачыць у «Звяздзе», проста здзіўляе. Гаворка аб тым, што на старонках газеты па незразумелых прычынах (выдз. мной. — **В.Д.**), з'яўляецца вельмі шмат «новых» слоў, а дакладней — даўно існуючых польскіх, якімі чамусьці панадзіліся замяняць беларускія. Вось толькі некаторыя прыклады.

Аж страката ад слоў «знакаміты» і «выбітны» (аналагі польскіх «znakomity» і «wybitny»). А чым не дагадзілі «славуты», «вядомы», «выдатны»?

(Пра «незразумелыя прычыны» — з дазволу — трохі пазней, цяпер пра словы. Цалкам магчыма, што першыя два (дарэчы, «знакаміты» — як «шырока вядомы, славуты» — у тлумачальным слоўніку беларускай мовы ёсць) на старонках «Звязды» сапраўды «стракацяць» — сустракаюцца часцей. Чаму? (Яшчэ раз дзякуй аўтару ліста — за магчымасць задумацца). Ды таму, відаць, што ні чытачам, ні журналістам не трэба расказваць, як гэта цяжка — выбіцца... А таму пра Быкава, Караткевіча, Барадуліна, Станюту, Клімука, Алфёрава і многіх, многіх іншых нашых, сапраўды славутых, вядомых, выдатных, справядлівей, дакладней (зразумела ж, на мой погляд) казаць менавіта выбітныя... І менавіта знакамітыя! Яшчэ і таму, што выбіваліся яны, зноў жа на мой погляд, зусім не дзеля славы, не дзеля вядомасці. Яны (што прынцыпова) рабілі тое, што лічылі патрэбным, яны — сваёй працай, талентам — пакінулі след у гісторыі, яны зрабілі знак у справе, якой займаліся). Дык чаму тады не знакамітыя?

Далей (цытуем ліст спадара Тарасевіча): «...Калі б аўтары пачыталі «Тлумачальны слоўнік беларускай мовы», то даведаліся б, што вядомыя, славутыя мясціны (скажам, нейкага горада) называюцца «выдатнасці», а зусім не «знакамітасці». Тут нават польскае слова ўжылі няправільна.

(Чытач не называе нумары газеты і прозвішчы тых аўтараў (крый Бог у множным ліку)... Але ж здарыцца магло, бо забываешся часам слова. І шукаць не маеш, калі... Асабліва — пішучы нешта ў нумар. Дарэчы, «знакамітасці» не найбольшая наша памылка. Адзін з калег, адным вокам зірнуўшы ў слоўнік, пераклаў з рускай слова «почкі», як «ныркі» і напісаў, што яны ўжо распусціліся на дрэвах, другі — неяк распавёў пра «надвор'е... ў доме», трэці... Не памыляецца той, хто нічога не робіць.

*А калі наогул, то наша, газетная кухня вельмі падобная на звычайную — з халадзільнікам, з плітой, з пастаянным пытаннем: «А што сёння паставім на стол (чытай — у нумар)?». Так, нешта плануецца, прыпасаецца, гатуецца загадзя, нешта маецца на ўвазе зранку: гэта значыць, карэспандэнты накіроўваюцца на пэўныя сустрэчы, выставы, прэс-канферэнцыі, уключаецца «гарачы тэлефон», прыходзяць лісты — варацца, калі можна гэтак сказаць, пэўныя стравы. Але ж, што ў нашай справе ніяк не схава

СТАЛІЦА СТАЛА НА ЛЫЖЫ

Юбілейнае, дваццаць пятае спартыўнае свята «Минская лыжня-2011» сабрала 12 лютага на лыжа-ролернай трасе і шматлікіх ўдзельнікаў, і гледачоў. Нягледзячы на мароз і моцны халодны вецер, у гэтым годзе паўдзельнічаць у забегу змаглі ўсе ахвотныя: шматдзетныя сем'і, студэнты, ветэраны лыжнага спорту, каманды прадпрыемстваў і арганізацый. Адкрывалі «Мінскую лыжню» эстафетныя гонкі каманд адміністрацый раёнаў сталіцы і Мінгарвыканкама. Самымі падрыхтаванымі аказаліся прадстаўнікі Савецкага раёна, якія і заваявалі пераходны Кубак сталіцы. Дарэчы, кубак сёлета разыгрываўся ўпершыню. Гэтыя спаборніцтвы — толькі своеасаблівая рэпетыцыя. Галоўная ж барацьба разгорнецца праз два тыдні ў Раўбічах.

Марына БЕГУНКОВА, фота аўтара.

КРЫЖАВАНКА

Склаў Лявон ЦЕЛЕШ.
г. Дзяржынск.



ПАДАРОЖЖА ПА СЯРЭДНЯВЕЧЧЫ

ПА ГАРЫЗАНТАЛІ: 1. Лічба: .столькі гадоў таму беларускія гарады Навагрудак і Рэчыца атрымалі Магдэбургскае права на самакіраванне. **5**. Грашовая адзінка, тэрмін абарачэння якой пачынаецца з XIII стагоддзя. **6**. Насценны роспіс, якім з даўніх часоў аздаблялі на Беларусі цэрквы і касцёлы. **9**. Прыток р. Пціч, на беразе якой, як сцвярджаюць гісторыкі, узнік першапачатковы Мінск. **10**. Тое, што і карагод (лакальная назва). **11**. Заходняя ... Рака на Беларусі, у рэчышчы якой былі знойдзены помнікі эпіграфікі XII стагоддзя — Барысавы камяні. **12**. Старадаўні смычковы музычны інструмент. **13**. Каменная скульптура ляжачага льва з чалавечай галавой. **17**. Імя першапачынальніка крывіцкага роду. **18**. Старажытны горад полацкай зямлі (зараз вёска ў Талачынскім раёне), дзе 1010 гадоў таму быў пабудаваны адзін з першых на Беларусі хрысціянскіх сабораў. **19**. Галіна, ніва дзейнасці (кніжн.). **20**. Цыкл мастацкіх твораў аднаго жанру. **22**. Набажэнства ў хрысціян. **23**. Стэпавыя плямёны Прычарнамор'я. **26**. Сшытыя лісты чыстай паперы: у старажытнасці вокладкамі да іх служылі дошкі. **29**. Сярэдневяковыя летапісы, запіс значных падзей па гадах. **30**. Вараг, ад якога пачынаўся радавод многіх кіеўскіх князёў. Упамінаецца ў «Аповесці мінулых гадоў». **31**. Галоўная вежа ў сярэдневяковым замку. **32**. Дробная салома, мякіна, што застаткі пасля малацьбы збожжа (лакальная назва). **33**. Масленкавы .... Перыяд, калі адзначаецца старажытнае свята Масленіца.

ПА ВЕРТЫКАЛІ: 1. Невялікая прастора сярод лесу. **2**. Горад у Польшчы, дзе ў лютым, 600 гадоў таму, была юрыдычна замацавана перамога саюзных войскаў над крыжакамі ў Грунвальдскай бітве. **3**. ... з вадою — май з травою (прык.). **4**. У сярэдневяковай Русі намеснік князя. **7**. Якія ..., такія і самі (прык.). **8**. У старажытнай Русі княжанне, прастол. **11**. У старажытнасці ўзброены атрад пры князю. **14**. Даўняя назва г. Слуцка: сёлета — 895 гадоў з часу першага пісьмовага ўпамінання аб ім. **15**. Імя полацкага майстра Богшы, які 850 гадоў таму зрабіў крыж па замове Ефрасінні Полацкай. **16**. ..., ці прывід. Тое, што блукае ўначы, згодна з павер'ямі, у старажытных замках. **19**. Старажытная зброя. **21**. Гарадскі пасёлак на Гродзеншчыне, раённы цэнтр. **24**. Паўвостраў на Чорным моры. **25**. У сярэдневяковай Еўропе — самы папулярны жанр драмы. **27**. У старажытнасці пастаялы двор, дзе часова спыняліся князь, духоўныя асобы і купцы: таксама — буйное паселішча. **28**. У старых рускіх гарадах — крэпасць: тое, што замак на Беларусі.

ПА ГАРЫЗАНТАЛІ: 1. Пальтаст. 5. Рубель. 6. Фраска. 9. Менка. 10. Танок. 11. Дзяіна. 12. Віёла. 13. Сфінкс. 17. Крыва. 18. Друк. 19. Арэна. 20. Ніза. 22. Абедня. 23. Скіфы. 26. Сшытак. 29. Анналы. 30. Рурык. 31. Дажон. 32. Амелле. 33. Тыдзень. **ПА ВЕРТЫКАЛІ:** 1. Паляна 2. Горнае. 3. Красавік. 4. Пасадник. 7. Сані. 8. Стол. 11. Дружына. 14. Слуцак. 15. Дазар. 16. Здань. 19. Анеодара. 21. Астравец. 24. Крым. 25. Фарс. 27. Пагост. 28. Крэмль.

АДКАЗЫ НА КРЫЖАВАНКУ

На рэгістрацыю шлюбу ў пятніцу, 11.11.2011, у загсах Мінска пакуль запісаліся каля 40 пар

Ёсць падставы меркаваць, што гэта дата выкліча вясельны бум, як і ў папярэднія дні лічбавых супадзенняў. Напрыклад, 2.02.2002 у сталіцы нарадзілася 126 сямей, 7.07.2007 і 8.08.2008 — адпаведна, 256 і 262. Аднак спецыялісты не стамляюцца паўтараць, што будучыня сямей мала залежыць ад даты рэгістрацыі шлюбу. Пацверджанне таму — колькасць разводаў.

Паводле звестак на студзень гэтага года, чвэрць сямей, якія ўтварыліся 02.02.2002, ужо распалася. З тых, хто ўзяў шлюб 7.07.2007, рассталіся 10%. Па днях лічбавых супадзенняў 2008 і 2009 гадоў статыстыка разводаў пакуль такая: 4,6 і 3,6%. Для параўнання: з тых, хто ўзяў шлюб у маі 2004-га (гэты месяц, згодна з народнымі павер'ямі, не самы ўдалы для вяселляў), развяліся 25% сямейнікаў. Доля майскіх маладажонаў 2005 года, якія былі разведзены на пачатак 2011-га, — 16,6%.

Магда КРЭПАК,
«Мінск-Навіны».

АДРАЗУ ЗА СТРЭЛЬБУ...

У Лунінецкую раённую бальніцу прывезлі жанчыну з вёскі Лугі з агнястрэльным раненнем мяккіх тканак патыліцы. Па падазрэнні ў злачынным выкарыстанні паляўнічай стрэльбы, якая не зарэгістравана, затрыманы сын пенсіянеркі. Заведзена крымінальная справа.

Яна СВЕТАВА.

Усходні гараскоп на тыдзень

Дзевы не павінны здавацца пры першых цяжкасцях, а Скарпіёнам не варта баяцца дзейнічаць

ВАЕН. Надыходзіць досыць спрыяльны перыяд, але памятайце, што канкурэнты не дрэмлюць. Не варта дэманстраваць усім і кожнаму свае слабыя месцы. Рашучасць — гэта выдатна, але не даходзьце да неразважлівасці. У пятніцу, калі хочаце з розумам размеркаваць сілы, зоркі раяць накіраваць іх набыццё душэўнай раўнавагі. Давярайце сваёй інтуіцыі. У суботу можаце пацешыць сябе і навакольных цікавымі ідэямі і нечаканымі рашэннямі. У нядзелю будзьце асцярожнымі, бо таемнае, хутчэй за ўсё, стане відавочным. Блізкія людзі могуць быць выдатнымі абаронцамі і суцяшальнікамі

ЦЯЛЕЦ. Вашы жаданні і рэчаіснасць могуць супярэчыць адно аднаму. Вам, верагодна, падасца, што навакольныя людзі вас проста выкарыстоўваць, нічога не даючы ўзамен. Хутчэй за ўсё, гэта не зусім так, таму не варта пра гэта выказвацца ўслых. Давядзецца ўціхамірыць самалюбства і падпарадкавацца распараджэнням вышэйстаячых. У сераду або чацвер можаце стаць ахвярай ілжывай інфармацыі. Магчымыя сваркі з блізкімі людзьмі — паспрабуйце своечасова спыніцца.

БЛІЗНЯТЫ. Акуніцеся ў працу, разбярыцеся з назапашанымі справамі. Не правакуйце сваімі дзеяннямі і выказваннямі навакольных — гэта толькі выкліча іх незадаволенасць. Давядзецца адказваць за свае ўчынкі. Рабіце для іншых толькі тое, што зрабілі б для сябе, і не займайцеся самападманам, бо перабольшваць рэчаіснасць не варта. У аўторак, сераду і чацвер пажадана не пачынаць нічога новага і не расказваць начальству пра свае планы і праекты. У пятніцу будуць удалымі паездкі. У суботу магчымыя перспектыўныя прапановы.

РАК. Вам спрыяе Фартуна, так што можаце справіцца практычна з любой праблемай. Поспех будзе спадарожнічаць у пачынаннях, звязаных з творчасцю. Папоўніце кола зносін прыемнымі і карыснымі для вас людзьмі. Перш чым прымеце сур'ёзнае рашэнне, паспрабуйце ўсё добра прадумаць. Для паспяховай працы спатрэбяцца цярпенне і вытрымка. У сераду трэба быць асцярожнымі і ўважлівымі ў любой справе. Усё ў гэты дзень неабходна даводзіць да канца. У чацвер і пятніцу лепш не пачынаць новых спраў. Завяршыце тое, што ўжо паспела назапасіцца. Верагодныя станоўчыя змены на працы. У нядзелю лепш адпачыць.

ЛЕЎ. Непажадана мітусіцца і спяшацца. Плывучы супраць цячэння, вы толькі дарма выдаткуеце каштоўныя сілы. На працы вядзіце справы граматна, прадумвайце кожную дробязь — і тады ўсё атрымаецца. У аўторак лепш не паказвацца на вочы начальству, каб пазбегнуць канфліктнай сітуацыі. У сераду варта пашкадаваць сябе і дазволіць невялікі адпачынак. Чацвер — выдатны дзень для праявы творчых здольнасцяў. Вам можа спатрэбіцца парада і дапамога сапраўдных сяброў, і вы ўсё гэта атрымаеце. Падумайце: ці не час удасканальваць свой прафесійны ўзровень? Пачніце спасцігаць новы пласт ведаў і смела ўжывайце вывучанае на практыцы. Многія падзеі другой паловы тыдня могуць закручвацца вакол сям'і, гаспадарчых і бытавых клопатаў. Наладзяцца адносіны з дзецьмі.

ДЗЕВА. Вам выццёва неабходна карэктна выбудаваць адносіны з тымі, з кім вы нядаўна пазнаёміліся. У аўторак перад канчатковым рашэннем любых фінансавых пытанняў пераканайцеся, што ад вашай увагі не выслізнула ніводная істотная дэталь. Не здавайцеся пры першых цяжкасцях. Памятайце, што, ужыўшы адначасова ветлівасць і настойлівасць, здабудзеце ключ да поспеху. У канцы тыдня атрымлівайце асалоду ад бясхмарнага шчасця.

ШАЛІ. Нават тое, што ніколі не было вам патрэбна, можа быць дзейнічана. Калі ў пачатку тыдня зможаце граматна адкарэкціраваць свае планы, то гэта наблізіць вас да запаветнай мэты і дазволіць вызначыць адносіны з партнёрамі і апанентамі. У сярэдзіне тыдня вы, хутчэй за ўсё, сустрэнеце таемны супраціў нядобразычліўцаў. Можна спадзявацца на поспех у юрыдычнай сферы, нядрэнна пойдуць таксама сур'ёзныя адукацыйныя праекты. Субота — проста ўдалы дзень.

СКАРПІЁН. На працы верагодныя змены, і ў вас з'явіцца шанц прафесійнага росту. Магчымыя ўдалыя паездкі і камандзіроўкі. Сябры або высокія заступнікі дапамогуць увасобіць у жыццё смелыя распачынанні. Не варта толькі баяцца дзейнічаць — і ўсё складзецца ўдала. У сераду пастарайцеся скончыць старыя справы і праекты, бо ў чацвер зможаце заняцца чымсьці новым. Паспрабуйце ўрэгуляваць суботнія рознагалоссі з навакольнымі мірным шляхам.

СТРАЛЕЦ. Вы будзеце не вельмі схільныя да кантактаў. Затое ў вас з'явіцца магчымасць як след ацаніць утульнасць свайго дома. Важныя справы лепш перанесці на наступны тыдзень. Паспрабуйце адпачыць ад мітусні і шуму. Пазбягайце кантактаў з сумніўнымі партнёрамі. Варта пагрузіцца ў працу, пажадана — «па вушы». На выхадных не шукайце шумных кампаній, адпачніце ў поўнай адзіноце або з найбольш блізкімі вам людзьмі.

КАЗЯРОГ. Любімая праца можа стаць крыніцай жыццёвых сіл, тым больш што адносіны з калегамі і начальствам будуць на рэдкасць добразычлівыя і гарманічныя. У аўторак найлепшых вынікаў вы дасягнеце ў тым, да чаго будзе ляжаць душа. У сераду пры дробных няўдачах не адчайвайцеся і імкніцеся праз «не магу» дасягнуць сваёй мэты. У пятніцу з-за саманадзейнасці рызыкуеце загнаць сябе ў кут. У выхадныя дні больш часу надайце адпачынку, бо ад гэтага будзе залежаць ваша душэўная раўнавага.

ВАДАЛЕЙ. На вас можа звалiцца маса праблем, ад якіх галава пойдзе кругам. Не спяшайцеся змяняць месца працы ў надзеі на больш высокія заробкі. Калі не разгубіцеся, у вас з'явіцца больш удалыя варыянты выхаду з крызіснай сітуацыі. У чацвер можа быць станоўча вырашана пытанне, звязанае з нерухомасцю. У суботу вашы схільнасць да рызыкі, імпульсіўнасць у рынянцці рашэнняў, часам вельмі супярэчлівых, здольныя будуць паказытаць нервы блізкім людзям.

РЫБЫ. Стабільнасць жыццёвага ўкладу і аптымістычны настрой дазволяць лёгка пераадолець усе перашкоды і выйсці з перамогай практычна з любой сітуацыі. У пачатку тыдня пажадана нікуды не спазняцца: непунктуальнасць можа стаць прычынай праблем. У сераду ўзгадніце і ўдакладніце ўсё да дробязяў, бо ад карпатлівага стаўлення да справы будзе залежаць ваша кар'ера. У чацвер не варта пачынаць гутарку аб праблеме, якая ўзнікла на працы, з начальствам — пазней яно само падніме гэтую тэму, і вы апынецеся ў выгадным святле. У нядзелю не дазваляйце сваякам абцяжарваць вас сваімі праблемамі.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	7.30	17.18	9.48
Віцебск —	7.23	17.04	9.41
Магілёў —	7.21	17.08	9.47
Гомель —	7.13	17.08	9.55
Гродна —	7.42	17.34	9.52
Брэст —	7.42	17.34	9.52

Месяц

Поўня 18 лютага.
Месяц у сузор'і Рака.

Імяніны

Пр. *ГРАМНІЦЫ (Стрэчанне Гасподняе).*

К. *Агаты, Геаргіны, Арнольда, Зігфрыда, Юзафа.*

Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.



Дзве даты

15 лютага

1904 год — нарадзілася Ларыса Пампееўна Александроўская, вядомая беларуская спявачка, рэжысёр, грамадскі дзеяч. Народная артыстка Беларусі (1938) і СССР (1940). Сярод лепшых партый рэпертуару: Кармэн («Кармэн» Ж. Бізэ), Таццяна, Ліза і Графіня («Яўгеній Анегін» і «Пікавая дама» П. Чайкоўскага). У гады Вялікай Айчыннай вайны — член франтавых канцэртных брыгад. У 1951-60 гг. — Галоўны рэжысёр Дзяржаўнага тэатра оперы і балета БССР. У 1992 годзе ўстаноўлена прэмія імя Александроўскай у галіне тэатральнага мастацтва.

1989 год — завяршыўся вывад савецкіх войск з Афганістана.

Цытата дня:

«Хто раздувае полымя сваркі і варочае галоўні, той не павінен скардзіцца, калі іскры трапляюць яму ў твар».

Бенджамін Франклін (1706—1790), амерыканскі дзяржаўны дзеяч.

ГРАМНІЧНУЮ СВЕЧКУ НЕЛЬГА ПАЗЫЧАЦЬ

«Грамніца» — гэта абрадавы прадмет, які выконваў ролю абярэга, амулета і нават талісмана.

● Пасля вяртання дадому гаспадар неадкладна даставаў свечку, жонка запальвала яе, і адбываўся незвычайны, але абавязковы абрад агністага крыжавання. Спачатку бацька абпальваў крыжападобна валасы на сваёй галаве, потым — на галаве жонкі і ўсіх астатніх членаў сям'і па ўзросце. Па чарзе, пачынаючы ад старэйшых, да яго падыходзілі ўсе члены сям'і і судакраналіся з полымем, тым самым быццам бы далучаючыся да жыццядайнага нябеснага агню, які знішчае ў чалавеку ўсю брыдоту.

● Пасля «вогненнага асвячэння» дамачадцаў бацька ў суправаджэнні дзяцей абыходзіў усе куты хаты, зноў крыжападобна выпальваючы нячыстую сілу. Знакам такога «выпальвання» заставаліся чорныя крыжы на бэльках або дзвярах.

● Затым ён выходзіў у двор і выконваў той жа самы абрад ва ўсіх гаспадарчых пабудовах, за выключэннем лазні.

● Акрамя гэтага, у некаторых рэгіёнах выконвалі наступнае рытуальнае дзеянне: у хлеў неслі грамнічную свечку і разломвалі або разразалі яе на столькі частак, колькі жывёл там было. Такое дзеянне надзейна захоўвала хатнюю жывёлу ад сурокаў.

Дбайныя гаспадыні не абміналі такое вялікае свята для выканання асобных рытуальна-магічных дзеянняў, скіраваных на паляпшэнне дабрабыту і перасцярогу дамачадцаў:

● Курам давалі больш аўса, каб яны лепш неслiся, а яйкі былі больш смачнымі.

● Вярнуўшыся дадому пасля вячэрняга набажэнства, гаспадар трос садовыя дрэвы, каб яны далі багаты ўраджай пладоў.

● Традыцыя забараняла ў гэты дзень адпраўляцца ў далёкую дарогу. Напрошваецца прамая аналогія з Калядамі, калі ў першы вечар пажадана было ўсім сядзець за сямейным сталом. Праз кароткі прамежак часу пачнецца Вялікі пост, таму лічылася абавязковым у гэты дзень сем раз паесці.

● Старыя людзі раілі: «Грамнічную свечку нельга пазычаць, як і агонь, нават у блізкія дамы, сваякам, родным асобам, што жывуць у іншай сям'і».

● У дзень Грамніц у храмах асвячалі не толькі свечкі, але і ваду. Грамнічная вада лічылася раўназначнай той, якую бралі на Вадохрышча. Ваду даволі часта выкарыстоўвалі адначасова са свечкай.

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

Усміхнемся

СМС: «Мама, у мяне сёння ўсе дзявяткі! Клавіятуру аддасі?»

☺

Мужык расказвае сябру:

— Я нядаўна ажаніўся, нясу яе на руках па кватэры, і тут яна кажа:

«Вася, мы ж распісаліся ўжо! Давай я на шыю пералезу!»

☺

У сябе на дачы я наогул нічога не саджаю. Ну, акрамя печані...

☺

Лорд — дварэцкаму:

— Джэймс! Мне патрэбна гарачая ванна!

— Ужо вылажу, сэр!

☺

Руская кухня мае адзін недахоп. Праз 5—6 чарак ты зноў галодны.

☺

— Мадам, што я павінен даць вам, каб дамагчыся вашага кахання?

— Наркоз.

І ДЖЫПА ТРАПЯТКІ ПАЛЁТ

На працягу двух дзён, 12 і 13 студзеня, непадалёк ад Мінска ўпершыню праходзіў пешы этап чэмпіянату Беларусі па джып-спрынце. Гэты від гонак прыцягвае да сябе ўвагу як тытулаваных спартсменаў з ралі-рэйдаў, так і гледачоў. І сапраўды, джып-спрынт не проста спаборніцтва, гэта праверка пілотаў на майстэрства кіравання, а машыны — на трываласць і магутнасць. У гэты раз спартсменам трэба было пераадолець чатыры заезды па восем кругоў — слізкая траса, шматлікія павароты, трамплін, дзе ўдзельнікі спаборнічалі не толькі за самы доўгі скок, але і глядацкія апладысменты. На жаль, гэтыя марозныя выхадныя перашкодзілі вялікай колькасці гледачоў паназіраць за спаборніцтвамі, што не скажаш пра ўдзельнікаў. У першы дзень на трасу выйшлі дваццаць тры экіпажы, якія спаборнічалі ў аматарскай катэгорыі. Першае месца «забралі» мінчане Георгій і Настасся Панасюк.

У другі дзень спаборнічалі шэсць экіпажаў на падрыхтаваных уседарожніках. Сёлета бясспрэчным лідарам стаў маскоўскі экіпаж Сяргея Савенкі і Георгія Сабліна на спартыўным аўтамабілі Bowler Wildcat.

Марына БЕГУНКОВА, фота аўтара.



ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03.

http://www.zviazda.by;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, *e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by*

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год. Тыраж 33.380. Індэкс 63850. Зак. № 741. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12